Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ЧАЦВЕР, 7 лістапада 1985 г. № 45 (3299) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

ПАД СЦЯГАМ ЛЕНІНА, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ — НАПЕРАД, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ У КАМУНІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ!

З Заклікаў ЦК КПСС да 68-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

СЛАВА КАСТРЫЧНІКУ!

ПОСТУП ТЫДНЯ

ЗАЎСЁДЫ З НАМІ, ВЕЧНА ЖЫВЫ

У кумачы сцягоў, чырвоным полымі транспарантаў са словамі Заклікаў ЦК КПСС сустрэла сталіца СССР Вялікі Кастрычнік. Напярэдадні свята, 5 лістапада, адбыўся масавы мітынг, прысвечаны ўрачыстаму адкрыццю помніка Уладзіміру Ільічу Леніну.

Тысячы людзей — прадстаўнікі ўсіх раёнаў Масквы запоўнілі Кастрычніцкую плошчу, над якой развяваюцца Дзяржаўны флаг СССР, флагі саюзных рэспублік. Каля манумента — героі Кастрычніка, ветэраны партыі, вайны і працы, прадстаўнікі маладога пакалення працоўнай гвардыі краіны.

14.00. На трыбуну падымаюцца таварышы **М. С. Гарбачоў, Г. А. Аліеў, В. І. Варатнікоў, В. В. Грышын, А. А. Грамыка, Я. К. Лігачоў, М. І. Рыжкоў, М. С. Саломенцаў, В. М. Чэбрыкаў, Э. А. Шэварднадзе, П. Н. Дземічаў, У. І. Далгіх, В. В. Кузняцоў, Б. М. Панамароў, С. Л. Сакалоў, М. У. Талызін, Б. М. Ельцын, Л. М. Зайкоў, М. В. Зімянін, І. В. Капітонаў, В. П. Ніканаў, К. В. Русакоў.**

Перад мікрафонам член Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар МГК КПСС **В. В. Грышын.** Сёння тут, на Кастрычніцкай плошчы, дзе пачынаецца Ленінскі праспект сталіцы, гаворыць ён, адкрываецца пабудаваны па пастанове Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савецкага ўрада помнік геніяльнаму мысліцелю і рэвалюцыянеру, заснавальніку Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, стваральніку першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, правадыру і настаўніку міжнароднага пралетарыяту, усіх працоўных — Уладзіміру Ільічу Леніну.

Мітынг, прысвечаны адкрыццю помніка Уладзіміру Ільічу Леніну, аб'яўляецца адкрытым.

Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта КПСС **М. С. Гарбачоў** разразае чырвоную стужку, якая апаясвае пастамент. Над плошчай чуваць гарачыя апладысменты. Гучыць Гімн Савецкага Саюза.

Выступіўшыя на мітынгу стругальшчык завода «Чырвоны пралетарый», Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР І. І. Мальцаў, член КПСС з 1917 года, удзельнік штурму Зімняга палаца К. П. Сіназерскі, студэнтка педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна, ленінскі стыпендыят Л. А. Каралёва гаварылі аб тым, што, верная запаветам Леніна, партыя энергічна дабіваецца паскарэння сацыяльнага і эканамічнага развіцця краіны. Партыя, яе Цэнтральны Камітэт рашуча сцвярджаюць ленінскі стыль і змагаюцца з усім, што перашкаджае руху наперад. Мудрасцю першага ленінскага Дэкрэта аб міры прасякнута дзейнасць партыі на міжнароднай арэне. Усё гэта знаходзіць гарачае адабрэнне і падтрымку савецкага народа.

Мітынг аб'яўляецца закрытым. Яго ўдзельнікі спяваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал». М. С. Гарбачоў, іншыя кіраўнікі Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы ўскладаюць кветкі да помніка У. І. Леніну. Потым яны аглядаюць скульптурнае збудаванне.

Урачыстым маршам праходзяць па плошчы прадстаўнікі трох відаў Савецкіх Узброеных Сіл — пехацінцы, лётчыкі, маракі.

ТАСС.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

У прэзідыуме вечара.

У мінулую пятніцу ў Доме літаратара мастакі, пісьменнікі, рабочыя і студэнты, прадстаўнікі грамадскасці горада-героя Мінска адзначылі 80-годдзе народнага мастака БССР, вядомага савецкага скульптара А. Бембеля, творчасць якога стала адной з самых яркіх старонак у савецкім мастацтве.

Вечар адкрыў міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч. Ён даў слова першаму сакратару ЦК Кампартыі Беларусі М. М. Слюнькову, які ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР уручыў юбіляру ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Мастак узнагароджан ім за вялікія заслугі ў развіцці савецкага выяўленчага мастацтва і ў сувязі з 80-годдзем з дня нараджэння. М. М. Слюнькоў цёпла павіншаваў А. Бембеля, пажадаў яму моцнага здароўя і новых творчых здзяйсненняў.

Пра жыццёвы і творчы шлях А. Бембеля расказаў доктар мастацтвазнаўства А. Сабалеўскі.

Юбіляра віншавалі народны пісьменнік Беларусі І. Шамякін, скульптар У. Церабун і іншыя. Яны падкрэслівалі, што ў асобе А. Бембеля беларускае мастацтва мае творцу, здатнага на вырашэнне і мастакоўскае асэнсаванне маштабных задач. Асабліва вялікі ўклад А. Бембеля ў раскрыццё тэмы Вялікай Айчыннай вайны, за адлюстраванне якой ён узяўся яшчэ ў час барацьбы з фашызмам і дасягнуў у гэтым кірунку значных поспехаў.

Адзначалася вялікая выкладчыцкая дзейнасць юбіляра, які шмат робіць для таго, каб сваім вопытам падзяліцца з творчай моладдзю. Вучнямі А. Бембеля называюць сёння сябе такія вядомыя скульптары, як А. Анікейчык, С. Вакар, Л. Гумілеўскі і іншыя.

А. Бембель шчыра падзякаваў прысутным за цёплыя, сардэчныя словы, сказаныя ў яго адрас, зазначыў, што і надалей будзе працаваць на карысць народа, Радзімы.

На вечары прысутнічалі таварышы І. Я. Палякоў, У. І. Бровікаў, А. Т. Кузьмін, М. Н. Полазаў.

Фота Ул. КРУКА.

АГІТАЦЫЯ ДЗЕЙСНАЯ, АКТЫЎНАЯ

Мінская абласная выстаўка наглядной агітацыі і палітычнага плаката «Слаўны працай чалавек», якая працуе ў Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў імя Ільіча ў Мінску, прысвечана XXVII з'езду КПСС і XXX з'езду Кампартыі Беларусі. Гэта, зразумела, наклала адбітак на матэрыялы, прадстаўленыя ў экспазіцыі. Асноўны тэматычны накірунак іх — адлюстраванне працоўных поспехаў працаўнікоў сталічнай вобласці, паказ іх намаганняў па паспяховым выкананні рашэнняў XXVI з'езда КПСС і заданняў адзінаццатай пяцігодкі.

Значнае месца займаюць матэрыялы, якія прапагандуюць вопыт сродкаў наглядной агітацыі асобных прадпрыемстваў і арганізацый. Расказваецца таксама аб афармленні тэматычных стэндаў, чырвоных куткоў. Адным словам, выстаўка не толькі адлюстроўвае пэўны вопыт у наглядной агітацыі, але і падказвае — сярод наведвальнікаў яе нямала ідэалагічных работнікаў, мастакоў-афарміцеляў — як зрабіць лепш, каб сродкі агітацыі аказвалі дзейсную дапамогу ў паўсядзённай рабоце савецкіх людзей.

В. ЛЯСУН.

У беларускую Ленініяну

Тысячы твораў — літаратуры, мастацтва, кіно, тэатральных пастановак — налічвае сёння савецкая шматнацыянальная Ленініяна, але па-ранейшаму аўтары звяртаюцца да неўміручага вобраза Уладзіміра Ільіча Леніна, імкнуцца па-мастацку глыбока і дасканала адлюстраваць яго тытанічныя намаганні па згуртаванні рабочага класа вакол партыі, паказаць падзеі рэвалюцыі ва ўсёй іх значнасці і гістарычнай важнасці. Плённа ў гэтым кірунку працуюць і беларускія кінематаграфісты, у тым ліку і творчая група ў складзе рэжысёра Ю. Цвяткова, сцэнарыста У. Мехава і іншых.

Сведчанне таму — чатыры дакументальныя стужкі, якія выйшлі раней. Цяпер завяршылася работа над чарговым, пятым фільмам з гэтай серыі — «...Рэвалюцыя дае нам права». Ён расказвае аб тым, як пад кіраўніцтвам У. І. Леніна, бальшавіцкай партыі было звергнута самадзяржаўе, адбылася лютаўская, а потым Кастрычніцкая рэвалюцыі. Зразумела, што многія падзеі стужкі адбываюцца на тэрыторыі Беларусі.

Прэм'ера фільма адбылася ў мінулую нядзелю ў памяшканні рэспубліканскага Дома кіно. Сустрэчу, на якую прыйшлі ветэраны партыі, творчыя работнікі, прадстаўнікі грамадскасці горада-героя, адкрыў рэжысёр В. Сукманаў.

Рэжысёр і адзін з аўтараў сцэнарыя фільма «...Рэвалюцыя дае нам права» Ю. Цвяткоў, а таксама і пісьменнік У. Мехаў расказалі аб тым, як у працэсе работы над стужкай выкарыстоўваліся архіўныя матэрыялы, адшукваліся сведкі векапомных падзей.

З цікавасцю слухалі прысутныя выступленне Марыны Мікалаеўны Крыленка, дачкі легендарнага М. Крыленкі, што ў цяжкі для рэвалюцыі і партыі час Леніным быў прызначаны галоўнакамандуючым.

На сустрэчу з гледачамі прыйшлі таксама ветэран Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі М. Панасевіч, удзельнікі творчай групы — кампазітар, народны артыст СССР Я. Глебаў, аператар В. Купрыянаў, аператар камбініраваных здымак Р. Андрыясян, гукааператар Л. Вежнявец, дырэктар фільма А. Сакольчык.

А потым адбыўся прагляд фільма «...Рэвалюцыя дае нам права» — стужкі, якая стала добрым папаўненнем у беларускую Ленініяну.

А. ВІШНЕЎСКІ.

Лаўрэаты Дзяржаўных прэмій СССР 1985 года

Віктар ДАШУК

Аляксей ДУДАРАЎ

Валерый РАЕЎСКІ

Барыс ГЕРЛАВАН

Аляксандр ДЗЯНІСАЎ

Валерый ФІЛАТАЎ

Віктар МАНАЕЎ

Уладзімір ГАСЦЮХІН

Цэнтральны Камітэт КПСС і Савет Міністраў СССР, разгледзеўшы прапановы Камітэта па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры пры Савеце Міністраў СССР, пастанавілі прысудзіць Дзяржаўныя прэміі СССР 1985 года.

Сярод новых лаўрэатаў — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, рэжысёр **В. Дашук**, Дзяржаўная прэмія СССР якому прысуджана за цыклы дакументальных фільмаў «Я з забітай вёскі» і «У вайны не жаночы твар» вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм».

Дзяржаўная прэмія СССР прысуджана драматургу **А. Дударавy**, заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР, рэжысёру **В. Раеўскаму**, заслужанаму дзеячу мастацтваў БССР, мастаку **Б. Герлавану**, выканаўцам роляў заслужанаму артысту Беларускай ССР **А. Дзянісаву**, заслужанаму артысту Беларускай ССР **В. Філатаву**, артысту **В. Манаеву** — за спектакль «Радавыя» ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы.

Дзяржаўнай прэміяй СССР адзначаны стваральнікі мастацкага фільма «Берег» вытворчасці кінастудыі «Масфільм», у тым ліку выканаўца ролі, заслужаны артыст Беларускай ССР, акцёр Тэатра-студыі кінаакцёра ў Мінску **У. Гасцюхін.**

СЦЯГІ ПЕРАМОЖЦАМ

Калегія Дзяржаўнага камітэта СССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю і прэзідыум ЦК прафсаюза работнікаў культуры разгледзелі вынікі сацыялістычнага спаборніцтва ў трэцім квартале сёлетняга года калектываў выдавецтваў, паліграфіі, кніжнага гандлю.

Сярод іншых пераходныя чырвоныя сцягі Дзяржкамвыда СССР і ЦК прафсаюза работнікаў культуры прысуджаны выдавецтву «Народная асвета», гомельскай фабрыцы «Палесдрук», Бабруйскай і Слуцкай узбуйненым друкарням, Магілёўскаму аблкнігагандлю.

П. ЛЕМЕШ.

НА «БАЙКАЛЬСКІМ МЕРЫДЫЯНЕ-85»

У Іркуцку і Іркуцкай вобласці прайшлі Дні савецкай літаратуры, якія адбываліся пад традыцыйнай назвай «Байкальскі мерыдыян». У абласным цэнтры і некаторых раёнах вобласці выступілі мясцовыя літаратары, а таксама госці з іншых куткоў краіны. Беларускую пісьменніцкую арганізацыю прадстаўляў паэт Л. Дранько-Майсюк.

М. ФЕДАРАЎ.

ЧАРГОВЫ ТОМ

У выдавецтве «Беларусь» напярэдадні Кастрычніцкіх святаў выйшаў з друку трэці том падпіснога выдання «Кампартыя Беларусі ў рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў і пленумаў ЦК», які ахоплівае 1933 — май 1945 гг.

К. ЯРОШЫК.

З КЛАСАВЫМ ПАДЫХОДАМ

Серыя «Ідэалагічная работа — справа ўсёй партыі», якую выпускае выдавецтва «Беларусь», карыстаецца вялікай папулярнасцю ў прапагандыстаў і агітатараў, арганізатараў партыйнай вучобы, усіх, хто мае дачыненне да палітыка-масавай работы. Толькі што ў гэтай бібліятэчцы выйшла брашура С. Дубянецкага «Школа класавага выхавання», аўтар якой абагульняе вопыт работы партыйных арганізацый рэспублікі па выхаванні працоўных у духу вернасці ідэалам рабочага класа, непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі.

Асноўная ўвага звернута на паказ таго, як авалоданне марксісцка-ленінскай тэорыяй, вывучэнне партыйных дакументаў апошніх гадоў дапамагаюць слухачам пашырыць свой кругагляд, станавіцца ідэйна перакананымі барацьбітамі за новае, умець супрацьстаяць ідэалагічным дыверсіям класавага праціўніка.

В. ДЗЯНІСАЎ.

ПРЭМІЯ ВАСІЛЮ ЯКАВЕНКУ

Цэнтральны Камітэт ВЛКСМ правёў конкурс камсамольскіх і піянерскіх газет саюзных рэспублік, краёў і абласцей на лепшае асвятленне працоўнага ўдзелу камсамольцаў і моладзі ў рэалізацыі Харчовай праграмы СССР у 1984 годзе.

Пераможцам конкурсу на лепшы нарыс аб маладых працаўніках аграпрамысловага комплексу прызнаны пісьменнік Васіль Якавенка. Яму прысуджана першая грашовая прэмія з уручэннем Дыплома ЦК ВЛКСМ і Саюза журналістаў СССР і ступені за серыю нарысаў «Вяртанне да зямлі», якія нарукаваны ў газеце «Знамя юности».

І. ЖДАНКО.

Рэвалюцыйны трымаем КРОК!..

Для мяне, як і для кожнага савецкага чалавека, няма свята больш светлага, больш радаснага, больш урачыстага, чым свята Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

7-е лістапада... Не заўсёды ў гэты дзень прырода дорыць нам добрае надвор'е. Але ці могуць халодны дождж або мокры снег, золкі вецер або слата сапсаваць нам святочны настрой? Кажуць, і тады, шэсцьдзесят восем гадоў назад, надвор'е таксама не песціла тых, хто са зброяй у руках ішоў на штурм Зімняга палаца, на штурм струхнелага старога свету. Я ведаю пра гэта не толькі з літаратуры. Я ведаю пра гэта па жывых успамінах непасрэдных удзельнікаў кастрычніцкіх падзей у рэвалюцыйным Піцеры...

Церусіў маркотны асенні дождж... Асенні... Але потым людзі назавуць гэты дзень вясной чалавецтва. Вясной!.. Бо, як гаворыцца ў праекце новай рэдакцыі Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя стала пераломнай падзеяй сусветнай гісторыі, вызначыла генеральны напрамак і асноўныя тэндэнцыі сусветнага развіцця...

Не дзіўна таму і тое, што адзіны стрэл славутай «Аўроры», які стаў сігналам да пачатку рашучага штурму, ператварыўся ў вобразным уяўленні народа ў магутны залп. У залп, што зруйнаваў ненавісны лад бяспраўя рабочых і сялян на адной шостай планеты Зямля, нагнаў страху на прыгнятальнікаў усяго свету і акрыліў надзеяй сэрцы прыгнечаных усіх краін, усіх мацерыкоў.

Памятаю, з якой цікавасцю слухаў я некалі разам з іншымі пісьменніцкімі дзецьмі расказ былога матроса з «Аўроры» Сілана Гусева, які ў тую незабыўную кастрычніцкую ноч з атрадам рэвалюцыйных маракоў штурмаваў Зімні палац... Гэтая сустрэча была даўно, яшчэ да вайны. У Мар'інай Горцы. Сілан Нічыпаравіч быў там дырэктарам Дома творчасці і адпачынку пісьменнікаў. І не бяда, што расказ яго быў не дужа складны. Нас усё роўна захапляў яго змест. Нас захапляла сама стыхія рэвалюцыйных падзей. Гаварыў жа іх непасрэдны ўдзельнік!..

У тую кастрычніцкую ноч не ведаў, не мог ведаць балтыйскі матрос, што зусім побач з ім, у другім атрадзе рэвалюцыйных маракоў ідзе на штурм Зімняга яго зямляк унтэр-афіцэр з мінаносца «Забіяка» Алесь Гурло, ужо вядомы ў літаратурным асяроддзі на Беларусі па вершах, надрукаваных у «Нашай Ніве»...

У тую кастрычніцкую ноч у радах рэвалюцыйных рабочых штурмаваў Зімні палац і нядаўні батрак з Уздзеншчыны, качагар Абухаўскага завода Ілья Гурскі, у будучым — таксама беларускі пісьменнік...

Сярод тых, хто прымаў удзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі, быў і рана асірацелы сын петраградскага дворніка Мікалай Аляксееў. Напярэдадні рэвалюцыйных падзей ён вярнуўся ў Піцер з фронту. Паранены і кантужаны... З Мікалаем Іванавічам, рускім пісьменнікам і генералам у адстаўцы, я пазнаёміўся ўжо ў пасляваенныя гады. У Мінску, дзе ён, удзельнік вызвалення Беларусі ад фашысцкай навалы, жыў да апошніх дзён...

А тады, у маленстве...

Памятаю, як у перадсвяточныя вечары мы падоўгу заседжваліся ўсёй сям'ёй каля цёплай кафлянай печы ў нашай мінскай кватэры. Слухалі бацьку. А ў яго таксама было што расказаць пра тую кастрычніцкую ноч. Хіба мог ён, петраградскі гімназіст з сям'і прагрэсіўна настроенага службоўца, заставацца ўбаку? Зброю, вядома, ён у рукі не браў. Але, далучыўшыся да калоны ўзброеных рабочых, стаў калі не ўдзельнікам, дык сведкам гістарычных падзей. Нават на плошчы перад Зімнім палацам быў. Усё на свае вочы бачыў...

Калі я пераказваў сваім аднакласнікам пра тое, што чуў ад Сілана Гусева, ад Ільі Гурскага, ад бацькі, мае аднагодкі зайздросцілі мне. А тады ж не так ужо і многа гадоў прамінула пасля Вялікага Кастрычніка — каля дваццаці, дваццаць, трошкі болей...

Памятаю, з якой радасцю рыхтаваліся мы ў сваёй 25-й узорнай імя Чарвякова школе да кожнай новай гадавіны Вялікага Кастрычніка. Памятаю, як ахвотна ўдзельнічалі ва ўсіх перадсвяточных і святочных справах мае сябры-аднакласнікі Жэня Паўлоўскі, Гена Бялевіч... А Рыма Шаршнёва з паралельнага класа заўсёды старалася больш за ўсіх...

Памятаю Кастрычніцкае свята ў першы год вайны. Мы сустракалі яго далёка ад роднай Беларусі. У Заходнім Казахстане. У стэпавым горадзе Уральску. Там знаходзіўся ў гэты нялёгкі час Другі Беларускі тэатр, які носіць цяпер імя Якуба Коласа. Там знайшлі прытулак і некалькі сем'яў беларускіх пісьменнікаў.

Цяжка было, што й казаць. Весткі з франтоў прыходзілі нярадасныя. І раптам — паведамленне, прынесенае з Масквы па радыё: нашы войскі адразу са святочнага парада, што адбыўся на Краснай плошчы сталіцы, рушылі ад сцен Маўзалея, ад сцен Крамля на фронт, у бой. Пачыналася бітва за Маскву, бітва, якая стала зарукай Вялікай Перамогі...

Запомніўся такі эпізод. У тэатры ішоў канцэрт, у праграме якога былі ўрыўкі з лепшых спектакляў. У зале — байцы і камандзіры з эшалонаў, што спыніліся ва Уральску па дарозе з Сібіры на Захад. І вось — фрагмент з «Крамлёўскіх курантаў». З удзелам Леніна. Што тут сталася з залай! Звыклы выраз — бура апладысментаў — на гэты раз дакладна адпавядаў свайму сэнсу. А як прасвятлелі твары бязвусых і вусатых байцоў! Якім агнём палалі іх вочы! Гэтага нельга забыць...

І яшчэ тры кастрычніцкія святы ваенных гадоў. А потым — першае пасляваеннае. Пасапраўднаму радаснае, па-сапраўднаму ўрачыстае! Я сустракаў яго на Далёкім Усходзе, у Хабараўску. Вецер з Амура студзіў нам твары. Але мы ішлі ў чорных матроскіх бушлатах, у бесказырках са стужкамі. Блішчэлі на грудзях боцманскія дудкі. У лад узмахвалі рукамі ў белых пальчатках. Мы ішлі ўслед за пяхотай, за баявымі чаёцямі, якія прайшлі выпрабаванні Вялікай Айчыннай. За намі рухаліся артылерыя і танкі. А на рэйдзе застылі пад святочнымі флагамі расквечаныя баявыя караблі Чырванасцяжнай Амурскай ваеннай флатыліі. Караблі, якія зусім нядаўна вярнуліся з-пад Харбіна, пераможна завяршыўшы апошнія баі другой сусветнай...

Адно засмучала нашу радасць, наш светлы настрой: боль па тых, хто загінуў пад Масквой, пад Сталінградам, у партызанскіх лясах і, нарэшце, у самім фашыстоўскім логвішчы, ля сцен рэйхстага. За светлыя ідэалы Кастрычніка аддалі жыццё і мае таварышы — танкіст Гена Бялевіч, афіцэр сувязі Жэня Паўлоўскі, партызанка Рыма Шаршнёва... Светлая памяць ім. Светлая памяць на векі вечныя!..

Мінаюць гады. Неўзабаве мы будзем адзначаць 70-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. 70-ю! Гэта так многа. Цэлы век для аднаго пакалення людзей. І так мала, калі мець на ўвазе гісторыю чалавецтва. Але ці многа ў гісторыі чалавецтва такіх велічных падзей, як Вялікі Кастрычнік?!

Сёння мы ў шэсцьдзесят восьмы раз адзначаем сваё вялікае, радаснае, усенароднае і міжнароднае свята. І на гэты раз яно набывае новы гістарычны змест. Толькі што апублікаваны праект Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Як мудра прааналізавана ў ім усё, што зроблена, здзейснена, дасягнута савецкім народам пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі! Якія новыя, небывалыя перспектывы адкрываюцца перад намі! Чытаеш праект Праграмы і яшчэ раз усведамляеш, што ўся наша дзейнасць, усё наша жыццё — гэта працяг таго, што пачата ў тую незабыўную кастрычніцкую ноч.

Вось чаму з такой любоўю і павагай глядзім мы на тых нямногіх удзельнікаў кастрычніцкіх падзей семнаццатага года, якія і сёння святкуюць разам з намі, стаяць на трыбунах, узначальваюць калоны дэманстрантаў. Нізкі паклон ім і найглыбейшая ўдзячнасць!

Вас мала засталося,
ветэраны
тых палымяных, векапомных дзён,
калі заняўся непагасны ранак,
што і дасюль па ўсёй зямлі відзён...
Калі ішлі вы ў лютыя атакі,
на свет стары нацэліўшы штыкі,
чырвоных стужак вогненныя знакі
гарэлі, як жывыя гваздзікі.
Чырвоны колер стаў для нас свяшчэнным —
адзіны колер сцяга і крыві.
Ён — нібы заклік маладзейшым зменам:
Не збоч з дарогі!
Сэрцам не скрыві!
Ён — той зары адбітак. Самы яркі.
Яні вы, яму ніколі не зманю.
У ім — усё:
агонь электразварні
і непагаснасць Вечнага агню.
Працаўнікоў, салдатаў, партызанаў
ваш подзвіг вёў за вамі — наўздагон...
Вас мала засталося —
ветэранаў
тых палымяных, векапомных дзён.
Святочным днём вы крочыце ў калонах
з мінулага ў наступныя эпохі.
І піянеры ў гальштуках чырвоных
чырвоныя нясуць вам гваздзікі.

Самі сабой прыходзяць на розум словы выдатнага рэвалюцыйнага паэта. Толькі трошкі зменеиыя: «Рэвалюцыйны трымаем крок!» Сцвярджэннем гэтаму — і новая Праграма КПСС.

Артур ВОЛЬСКІ.

У ТЭАТРАХ—ПАПАЎНЕННЕ

Традыцыйны штогодні вечар «Пасвячэнне ў артысты» прайшоў у Доме работнікаў мастацтваў. Маладое папаўненне калектываў мінскіх тэатраў віталі галоўны рэжысёр тэатра імя М. Горкага В. Маслюк, галоўны рэжысёр тэатра юнага гледача У. Караткевіч, вядучыя вечара купалаўцы В. Манаеў і Я. Крыжаноўскі і іншыя.

Віноўнікі ўрачыстасці парадавалі прысутных сваім майстэрствам — гучалі вершы, песні, урыўкі з твораў класічнага рэпертуару, выконваліся пародыі.

П. АНТОНАЎ.

ЧЫТАЛЬНІКІ—ХЛЕБАРОБАМ

Вершы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка, Я. Сіпакова і іншых паэтаў, а таксама беларускі фальклор прагучалі ў новай літаратурна-музычнай кампазіцыі «У народ і край свой толькі веру...» народнага тэатра чытальнікаў «Жывое слова» Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. З прэм'ерай пазнаёміліся рабочыя і служачыя саўгаса «Краснае» Маладзечанскага раёна ў мясцовым Доме культуры.

Рэжысуру і пастаноўку ажыццявіла Н. Іванова. Мастацкі кіраўнік А. Каляда.

Г. ПЯТРОЎ.

ПРЭМ'ЕРЫ

«Феерычны атракцыён для дарослых дзяцей» — такі падзагаловак мае п'еса Ю. Міхайлава «Гуляем у Прынца і Жабрака», створаная па матывах шырокавядомай аповесці класіка амерыканскай літаратуры Марка Твэна. Цяпер з ёй могуць пазнаёміцца мінчане і госці горада-героя, наведаўшы Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР. Спектакль (музыка А. Журбіна) паставіў В. Цюпа, харэограф Ю. Лапша, сцэнограф У. Жданаў.

У ролях заняты народная артыстка БССР Н. Гайда, заслужаныя артысты рэспублікі К. Лосеў, А. Кузьмін, Ю. Лазоўскі і іншыя.

Фота Ул. КРУКА.

Сцэна са спектакля.

Родны МІНСК — мая СТАЛІЦА...

На пытанні карэспандэнта «Літаратуры і мастацтва» адказвае старшыня выканкома Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў В. А. ПЯЧЭННІКАЎ

РАЗАМ з фарбамі восені ў жыццё горада-героя Мінска ўвайшло галоўнае свята нашай дзяржавы — Вялікі Кастрычнік. Мінчане сустрэлі яго на маршы завяршальнага года адзінаццатай пяцігодкі важкімі дасягненнямі ў галінах эканомікі і вытворчасці, будаўніцтва і культуры, навукі і мастацтва. Сёння сталіца Савецкай Беларусі рыхтуецца да XXVII з'езда КПСС, які, безумоўна, стане этапнай вехай у яе бурным развіцці, як, прынамсі, кожнага горада, кожнай вёскі нашай краіны.

Якім жа мы ўбачым Мінск у дванаццатай пяцігодцы? Як будзе вырашацца ў сталіцы надзённая сацыяльная праблема «чалавек у буйным горадзе», якая сёння хвалюе бадай ці не кожнага з нас? Вядома, яна ўбірае ў сябе шмат аспектаў, ад якіх залежыць паляпшэнне ўмоў працы і жыцця гараджан. Пра некаторыя з іх і гаворыць старшыня выканкома Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў В. А. Пячэннікаў.

— Валерый Андрэевіч, відаць, дарэчы будзе прыгадаць напачатку нашай гаворкі словы выдатнага савецкага пісьменніка Канстанціна Паустоўскага, які сказаў: «Зрабіце гарады такімі, каб імі можна было ганарыцца...». Мінскам ганарацца, без перабольшання, усе ягоныя жыхары. Ды і госці нашай сталіцы дружна сцвярджаюць: горад зручны, прыгожы! І сапраўды, як прыемна няспешна прайсціся па шырокіх праспектах сталіцы, зазірнуць ва ўтульныя паркі, скверы, пабываць у новых, непадобных адзін на адзін мікрараёнах, палюбавацца станцыямі метрапалітэна, наведаць гістарычнае Траецкае прадмесце... Але, зразумела, якім бы ні быў прыгожым горад, без чалавека з ягонымі клопатамі і турботамі, паўсядзённымі працоўнымі справамі і адпачынкам ён не існуе. У Мінску, як мне стала вядома, толькі жылых дамоў больш як дваццаць тысяч. І ў кожным акне запалена святло, у кожнай кватэры — людзі са сваім лёсам, біяграфіяй, інтарэсамі, са сваімі праблемамі. Нас, мінчан, сёння — крыху больш за паўтара мільёна...

— Так, і цяжка нават уявіць, колькі пытанняў гаспадарчага, эканамічнага, бытавога характару даводзіцца вырашаць гарадскім уладам штодзённа.

— Вядома. І ўсё ж, Валерый Андрэевіч, паспрабуем акрэсліць ход нашай гаворкі. Цікава было б даведацца пра далейшае сацыяльна-культурнае развіццё сталіцы рэспублікі, пра тое, якія новыя аб'екты культуры будуць пабудаваны за гады дванаццатай пяцігодкі, пра тое, ад чаго залежыць наш адпачынак пасля працоўнага дня, рацыянальнае выкарыстанне вольнага часу мінчан, у прыватнасці, пра масавасць фізкультурна-аздараўленчай работы ў горадзе.

— Усе гэтыя праблемы, якім сёння надаецца асаблівая ўвага ў краіне і якія адлюстраваны ў апошніх пастановах партыі і ўрада, надзённыя і для ўсіх падраздзяленняў нашага гарвыканкома. Цяпер паўсюдна ідзе актыўнае, зацікаўленае абмеркаванне праекта новай рэдакцыі Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. У гэтым гістарычным дакуменце нямала радкоў, прасякнутых клопатам пра кожнага савецкага чалавека, пра ўмовы яго працы і быту, пра ягонае здароўе і духоўны росквіт. Што нам трэба зрабіць, каб ажыццявіць гэтую актуальную праграмную ўстаноўку? Думаю, перш за ўсё — добра будаваць. Будаваць жыллё і школы, стадыёны і культурныя цэнтры... Будаваць рацыянальна, зручна... Яшчэ некалькі гадоў назад быў распрацаваны новы, чарговы генеральны план развіцця Мінска да 2000 года. У ім улічаны самыя новыя праектныя і метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, навукова-даследчыя распрацоўкі, пастановы партыйных і савецкіх органаў. Вядома, за час адзінаццатай пяцігодкі ў яго былі ўнесены пэўныя карэктывы, удакладненні, якія канкрэтызавалі і дапоўнілі асноўныя палажэнні генплана. У прыватнасці, была завершана распрацоўка і зацверджаны праекты дэталёвай планіроўкі цэнтра горада, комплексная схема азелянення адміністрацыйных раёнаў, план воднага добраўпарадкавання поймы ракі Свіслач, размяшчэння жыллёвага, культурна-бытавога і камунальнага будаўніцтва на дванаццатую пяцігодку. У плане на перспектыву — узвядзенне новых жылых мікрараёнаў «Уручча», «Усход-3», «Шабаны», «Кунцаўшчына» і іншых, заканчэнне Сляпянскай і будаўніцтва Лошыцкай водназялёных сістэм, зон адпачынку паўночнага берага Заслаўскага вадасховішча, двух кінатэатраў — па вуліцы Прытыцкага і ў мікрараёне «Паўднёва-Заходні», шэраг іншых аб'ектаў. Распрацоўваецца і комплексная схема аховы прыроды Мінска і яго наваколля на перыяд да 2000 года...

— Цікава было б даведацца, якія праекты генеральнага плана забудовы Мінска ажыццёўлены за апошнія пяць гадоў?

— Назаву спачатку некалькі лічбаў. За адзінаццатую пяцігодку насельніцтва горада павялічылася больш як на 200 тысяч чалавек. Але і будаўніцтва жылля ідзе хуткімі тэмпамі: аб'ём яго за пяць гадоў—каля 4 мільёнаў квадратных метраў агульнай плошчы. Дарэчы, жылы фонд горада да канца гэтага года складзе 21 мільён 200 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы, а гэта значыць, што забяспечанасць жыллём насельніцтва — 13,9 квадратнага метра на жыхара. Такія вялікія аб'ёмы жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва кардынальна змянілі аблічча цэлых раёнаў сталіцы. Цяпер наўрад ці можна ўявіць Мінск без мікрараёнаў, напрыклад, «Зялёны Луг-5, 6, 7», «Усход», «Серабранка-8, 9», «Захад-2, 3, 4», «Паўднёва-Заходні-1, 2, 3, 4», мікрараёнаў па вуліцах Сурганава, Алтайскай, Енісейскай...

—Гэтаксама, як нельга ўявіць сёння сталіцу рэспублікі без цэласных архітэктурных ансамбляў, у прыватнасці, на праспекце Машэрава, дзе ўзведзены велічны абеліск «Горад-герой Мінск», адміністрацыйны будынак Белсаўпрофа, гасцінічны комплекс «Інтурыст»...

— І гэта яшчэ не ўсё. У раёне завяршаецца будаўніцтва арыгінальных масіваў дзевяцішаснаццаціпавярховых дамоў з аб'ектамі абслугоўвання, выстонай гасцініцы «Беларусь», Палаца піянераў, выставачнага павільёна Гандлёвай палаты, вядзецца добраўпарадкаванне парку Перамогі і набярэжнай ракі Свіслач. І яшчэ. Нельга не сказаць пра тое, што вялікая ўвага ў горадзе надаецца фарміраванню забудовы і рэканструкцыі галоўных плошчаў. Плошча Перамогі набыла ўжо свой завершаны вобраз. На Кастрычніцкай плошчы пачалося будаўніцтва буйнога культурнага цэнтра — Палаца культуры Беларускай ССР, на плошчы У. І. Леніна ўзведзены інжынерны корпус Мінскага метрапалітэна, будуецца вылічальны цэнтр Дзяржплана БССР, намечана рэканструкцыя педагагічнага інстытута і добраўпарадкаванне плошчы.

— Ёсць у Мінску яшчэ адзін прывабны куток, далейшы лёс якога хвалюе кожнага гараджаніна. Я маю на ўвазе гістарычную частку горада, у прыватнасці, Траецкае прадмесце...

— Пытанні рэканструкцыі гістарычнай часткі горада разглядаюцца ў такіх аспектах. Па-першае, рэканструкцыя з рэстаўрацыяй забудовы гістарычных зон у цэнтральнай частцы горада на прыкладах Траецкага і Ракаўскага прадмесцяў, Верхняга горада і квартала ў межах вуліц Інтэрнацыянальнай, Рэспубліканскай, Нямігі і Максіма Горкага. Падругое, рэканструкцыя невыразнай малапавярховай забудовы першых пасляваенных гадоў. Што датычыцца непасрэдна квартала старога Мінска «Траецкае прадмесце», дык тут праектам далейшай рэканструкцыі прапанавана захаваць каларыт гістарычнай забудовы. На яго тэрыторыі прадугледжаны грамадска-гандлёвая, музейна-выставачная і жыллёвая зоны. У ходзе работ выконваецца комплексны капітальны рамонт з рэстаўрацыяй фасадаў усіх будынкаў, аднаўленне інтэр'ераў найбольш каштоўных памяшканняў грамадскага прызначэння, азеляненне... Сёння з 38 будынкаў у стадыі будаўніцтва знаходзяцца 16: кафэ «Траецкае», кафэ-марожанае, бар «Гарачае малако», дамы па вуліцах Старавіленскай, Янкі Купалы, Максіма Горкага, музей Багдановіча... Але трэба сказаць, што на якасць рэканструкцыі ўплывае дэфіцыт дахавых матэрыялаў, а таксама брусчаткі, натуральнага каменя...

— Дарэчы, зноў пра гісторыю. Прыгадваецца яшчэ адзін цікавы, сімвалічны для горада факт, які сведчыць, што новае, сучаснае ў прамым сэнсе літаральна саступіла дарогу старажытнаму...

— Вы, відаць, маеце на ўвазе, як будаўнікі другой чаргі метрапалітэна збочылі на некалькі дзесяткаў метраў ад намечанага праектам шляху, каб захаваць знойдзеныя археолагамі рэшткі старажытнага замчышча на скрыжаванні праспекта Машэрава і вуліцы Горкага? Сапраўды так, і гэтыя рэшткі—ва ўсякім разе пытанне сёння вырашаецца—прапанавана закансерваваць і стварыць у зоне станцыі метро «Няміга» своеасаблівы музей, дзе будуць захоўвацца унікальныя экспанаты адзінаццатага стагоддзя. Такім чынам, кожны з пасажыраў метрапалітэна — мінчан і гасцей сталіцы—зможа ўбачыць старажытныя сімвалічныя карані, ад якіх бярэ свой пачатак Мінск у гэтым месцы...

— Яшчэ некалькі слоў пра метро, пра яго другую лінію, калі ласка.

— Перш за ўсё скажу, што ў горадзе створаны інстытут «Мінскметрапраект». Сёння поўным ходам ідзе будаўніцтва другой лініі Мінскага метро, якая працягнецца крыху больш за шэсць кіламетраў. Станцыі будуць называцца так: «Трактарны завод», «Пралетарская». «Першамайская», «Янкі Купалы», «Няміга», «Фрунзенская».

(Заканчэнне на стар. 14—15).

Мінск. Ленінскі праспект.

Фота Ул. КРУКА.

КНІГАПІС

У. КОНАН. Праблемы мастацтва і эстэтыкі ў грамадскай думцы Беларусі пачатку XX ст. Пад рэд. доктара філалагічных навук С. Александровіча. На рускай мове. Мінск, «Навука і тэхніка», 1985.

Гэтую кнігу гісторыка эстэтычнай думкі на Беларусі, доктара філасофскіх навук Уладзіміра Конана, мабыць, трэба разглядаць як працяг работы, распачатае ім у канцы 60-х гадоў. Вынікам тае работы была кніга «Дэмакратычная эстэтыка Беларусі (1905—1917 гг.)», выдадзеная ў 1971 г. У новым даследаванні вучоны ўпершыню аналізуе шматстайную літаратурна-эстэтычную праблематыку найбольш важных рускамоўных перыядычных выданняў, якія выходзілі на тэрыторыі Беларусі ў 1905—1917 гг. Як вядома, гэта быў час газетна-часопіснага «буму». З амаль 150 рускамоўных перыядычных выданняў У. Конан выбраў газеты прагрэсіўнага кірунку («Голос провинции», «Жизнь провинции», «Окраина», «Минский курьер», «Минское эхо»), якія пэўным чынам працягвалі справу «Минского листка» і «Северо-Западного края».

У першым раздзеле кнігі У. Конан паказвае, у якіх цяжкіх умовах даводзілася выдаваць «Северо-Западный край», газету, якая надрукавала верш «Мужык» Янкі Купалы. Выдавец газеты Міхаіл Мысаўской падвяргаўся ганенням, на яго пісалі даносы. Дайшло нават да таго, што і губернатар А. Мусін-Пушкін быў абвінавачаны ў спрыянні рэвалюцыі.

З «Северо-Западным краем», газетай, якая, паводле бальшавіцкай «Новой жизни», кіравалася «строга марксісцкай праграмай», супрацоўнічала Мінскае таварыства аматараў прыгожых мастацтваў. На газету і на таварыства абрынуўся з нападкамі «Белорусский вестник». Гэтае выданне, якое, між іншым, друкавала творы Ядвігіна Ш., перайшло з крайніх правых пазіцый на пазіцыі лібералізму, прагрэсівізму. У разгар рэвалюцыі 1905 г. прагрэсіўная мінскія інтэлігенцыя ў лісце да рэдактара «Белорусского вестника» А. Смародскага заявіла: «Реакционная газета в Минске немыслима». Гэтым і тым, што ўрад не мог кіраваць па-старому, што друкары пагражалі байкотам газеце, тлумачыцца той факт, што «Белорусский вестник» надрукаваў аб'ектыўныя артыкулы пра Ф. Энгельса, аб Енскім з'ездзе германскіх сацыял-дэмакратаў, паказанні ўдзельнікаў дэманстрацыі, расстралянай губернатарам Курловым, і г. д.

Разглядае У. Конан і дзейнасць рэакцыйных выданняў — «Минской речи» і «Минского слова». Вялікую ўвагу даследчык засяроджвае на тым, як прагрэсіўная і рэакцыйная прэса ставілася да творчасці М. Горкага, У. Караленкі, Л. Андрэева, А. Купрына, А. Блока, В. Брусава і іншых перадавых рускіх пісьменнікаў. Асобная частка кнігі прысвечана ацэнкам маладой беларускай культуры ў рускамоўным друку. Нацыянальную самастойнасць Беларусі адмаўлялі і лібералы і кансерватары. Першыя прызнавалі адносную, гістарычна мінушчую каштоўнасць этнаграфічнай беларускай культуры, мовы, але лічылі, што па меры пашырэння рускай адукаванасці ў Беларусі літаратура і мова знікнуць, абагаціўшы сваімі элементамі «агульнарускую» літаратуру і мову. Рэакцыянеры адмаўлялі нават этнаграфічную асаблівасць беларусаў, а беларускую культуру называлі фінцыяй, вынікам каталіцкай экспансіі. Гэтыя дзве плыні зліваліся ў ідэалогіі і палітыцы «заходнерусізму». «Минское слово» прапаноўвала забараніць беларускую і ўкраінскую мовы ў мэтах умацавання адзінства царскай Расіі. Рэакцыйным мэтам павінны былі служыць і створаныя «заходнерусістамі» таварыства «Крестьянин» і «Белорусское общество». Супраць чарнасоценцаў барацьбу вялі самі дзеячы беларускай культуры на старонках «Нашай Нівы», іх падтрымліваў «Голос провинции» і асабліва «Минский курьер», у якім супрацоўнічаў сябра і настаўнік Янкі Купалы Уладзімір Самойла.

Кніга У. Конана багатая на факты і на абагульненні. Яна будзе карысная ўсім, хто цікавіцца гісторыяй культуры на Беларусі, гісторыяй культуры беларускай.

А. СІДАРЭВІЧ.

КРЫТЫКА БІБЛІЯГРАФІЯ

«НЕЛЬГА БУДАВАЦЬ БУДУЧЫНЮ БЕЗ ПАМЯЦІ АБ МІНУЛЫМ...»

Урокі крытыкі і публіцыстыкі Васіля БЫКАВА

У невядомых да гэтага савецкаму чытачу, толькі нядаўна апублікаваных у перакладзе на рускую мову раздзелах з кнігі Эрнеста Хемінгуэя «Небяспечнае лета» мяне асабліва ўразіла адна мясціна. Кніга аўтабіяграфічная, пісьменнік расказвае ў ёй пра сваё першае з часу грамадзянскай вайны наведванне Іспаніі, апісвае дарогу, па якой едзе, і, у прыватнасці, піша: «Мы праязджалі па правінцыі, дзе некалі ішлі баі, але я нават не спрабаваў растлумачыць Білу, як праходзіла асада горада, а толькі паказваў яму месца баёў». І далей: «У тую раніцу я думаў аб тым, што бульдозер можа пакінуць большы след на схіле ўзгорка, чым брыгада, якая тут загінула, і што брыгада, якая ішла на гібель, каб утрымаць вышыню, можа ўдобрыць глебу і дадаць у яе крыху каштоўных мінеральных соляў і металу, але ненадоўга, таму што металу гэтага занадта мала, каб яго здабываць, а вясновыя і асеннія дажджы ды талы снег змыюць з гэтай бясплоднай зямлі ўсё, чым яе апладнілі».

Шчымліва горкі роздум, цвярозае назіранне, якое сваёй неадольнай, даведзенай да лагічнага канца праўдай ледзяніць душу. Сапраўды, хоць прырода па-свойму і ўдзельнічае ў гісторыі, мае дачыненне да грамадскіх падзей (фон, месца дзеяння, нямы сведка і г. д.), да сэнсу гэтых падзей ёй няма ніякай справы, у маральных адносінах яна абыякавая, нейтральная. З пункту гледжання хіміі прах і попел ахвяр і злачынцаў, змагароў за народную справу і фашыстаў складаюцца з адных і тых жа элементаў, а стыхійным сілам прыроды, вадзе і ветру, усё адно, чый прах зносіць, чый попел развейваць.

Ды пагроза забыцця зыходзіць не толькі ад стыхій. У змове з патокамі вады дзейнічае яшчэ і паток часу. «... вядома, што час робіць сваю адвечную справу, і з кожным дзесяцігоддзем усё далей у незваротнае мінулае адсоўваюцца падзеі тых агнявых гадоў, туман небыцця ўсё шчыльней засцілае справы і твары людзей, вырваных з таго жыцця вайной». Альбо: «Тое, што нядаўна яшчэ было табе памятна, праз некалькі год паступова зацягваецца туманам забыцця, і трэба ўжо намаганне, каб успомніць імёны нашых франтавых таварышаў, даты калісьці так добра памятных баёў, назвы вёсак і ўрочышчаў, якія, здавалася б, на ўсё жыццё ўрэзаліся ў тваю памяць. Да таго ж паступова радзеюць шэрагі ветэранаў, тых, хто прайшоў вайну і мог бы з веданнем справы і падрабязнасцей расказаць аб ёй людзям».

Гэтыя выказванні, дзе атаясамліваюцца забыццё і небыццё, належаць ужо другому пісьменніку — Васілю Быкаву — і ўзяты з яго кнігі «Праўдай адзінай», якая выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», і склалі якую самыя розныя паводле зместу, характару і формы выступленні нашага выдатнага празаіка, зробленыя ім на працягу дваццаці год: з 1964-га па 1984-ы. Розным часам датаваны літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя выступленні пісьменніка, розным нагодай і патрэбай выкліканы яны да жыцця. Але нягледзячы на сваю вонкавую разнастайнасць кніга — пры бліжэйшым знаёмстве з ёю — уражвае адзінствам і трываласцю «грунтоўкі», унутранай цэльнасцю, наяўнасцю скразных, праходзячых праз увесь зборнік, гэта значыць арганічна ўласцівых для аўтара, прынцыпова важных для яго меркаванняў, высноў, турбот.

Адна з галоўных, калі не галоўная, не вызначальная, з гэтых турбот — як захаваць пад напорам разбуральнага дзеяння часу памяць мінулай вайны, яе ўрокі? Як тут супрацьстаяць патокам вады і дзён, «туману забыцця»? Турбота гэтая праходзіць дамінантай праз усю кнігу — пачынаючы з «Трох абзацаў аўтабіяграфіі», якімі па праву адкрываецца зборнік, і канчаючы заключнай, таксама лаканічнай, дарэчы, з некалькіх усяго абзацаў, нататкі «Урокі мінулай вайны», што ўяўляе сабой прадмову да італьянскага выдання аповесці «Альпійская балада».

Які адказ знаходзіць аўтар для сябе і ў чым пераконвае нас? Звяртаючыся ў думках да некаторых са сваіх аднапалчан, якія загінулі на вайне і якім, як ён прызнаецца, ён «абавязаны самым дарагім — жыццём», В. Быкаў гаворыць: «Апроч нас і нашай недасканалай памяці, што яшчэ можа ўтрымаць іх у нашай свядомасці, зберагчы для гісторыі?». З гэтай адзіна рэальнай альтэрнатывай ён звязвае самым непасрэдным чынам свой маральны і грамадзянскі абавязак, сваю асноўную мастакоўскую задачу. Расказваючы праз некалькі год у сваім пранікнёным, поўным балючай памяці эсэ «Наша сіла і воля» пра тое, што ён зведвае, калі застаецца сам-насам са «старэнькім ваенным год здымкам, зробленым недзе на фарміроўцы, добра пацёртым за гады ў нагрудная кішэні гімнасцёркі», В. Быкаў сведчыць з усёй шчырасцю: «Позіркі загінуўшых могуць нешта выказваць або не выказваць нічога, але мы, тыя, што воляю лёсу выжылі, сталі больш чым удвая старэйшыя і, трэба думаць, мудрэйшыя за іх, мы абавязаны ўбачыць у іх тое значнае, што так дорага было для іх і ў роўнай меры важна для нас сёння. Перш за ўсё мы абавязаны разгледзець у іх маўклівую просьбу **памятаць**, не забыць у змене год іх і іхнія справы, расказаць нашчадкам аб сэнсе іх жыцця і асабліва — іхняй заўчаснай смерці. Даўно вядома, наколькі зменлівая і недасканалая чалавечая памяць, якую няшчадна размывае час (зноў, бачыце, тая ж метафара.— **А. В.**), па крупінках забіраючы ў забыццё спачатку другараднае, менш значнае і яркае, а затым і істотнае. Не зафіксаваная ў дакументах, не асэнсаваная мастацтвам гісторыя і жыццёвы вопыт людзей вельмі хутка выціскаюцца з памяці чаргою бягучых спраў і падзей і назаўсёды трацяцца з духоўнай спадчыны народа». Адсюль і адпаведны, з надзеяй і верай, позірк на мастацтва, на яго магчымасці і яго прызначэнне. У артыкуле, змешчаным у свой час на старонках газеты «Известия», В. Быкаў піша: «У гэтым сэнсе вялізная задача кладзецца на наша мастацтва і літаратуру, якія валодаюць, як вядома, зайздроснай здольнасцю спыняць хуткаплынны час, увасабляць і захоўваць яго кардынальныя моманты ў гістарычнай свядомасці народа».

Сваё прагнае імкненне «безумно жить» паэт, які тварыў напачатку стагоддзя, звязваў з патрэбай

Все сущее — увековечить,
Безличное — очеловечить,
Несбывшееся — воплотить!

Для нашага сучасніка Васіля Быкава, сведкі і ўдзельніка трагічных падзей мінулай вайны, жорсткай, не на жыццё, а на смерць, сутычкі з самым злым ворагам чалавецтва — фашызмам — сэнс творчасці паўстае ў больш акрэсленым, больш канкрэтным вымярэнні — у неабходнасці ўзнавіць «складаны мастацкі вобраз вайны», увекавечыць у слове народны подзвіг, увасобіць светлыя рысы тых, хто злажыў галаву на алтар перамогі.

Ёсць сэнс больш уважліва, глыбей прыгледзецца да таго, што азначае для В. Быкава як мастака і грамадзяніна трудная памяць мінулай вайны. Зборнік дае дастаткова матэрыялу для такога разгляду.

Гэта, па-першае, своеасаблівы эквівалент сумлення, імкненне сплаціць «неаддплатны доўг» (гэтыя словы неаднаразова сустракаюцца на старонках кнігі), маральнае адчуванне, выдатна выказанае ў вядомай мініяцюры А. Твардоўскага «Я знаю, никакой моей вины...» (гэтае адзінаццаціраздкоўе таксама можна ўбачыць на адной са старонак кнігі «Праўдай адзінай»). Абвостранаму маральнаму пачуццю пісьменніка нязменна чуецца «запавет мёртвых жывым, запавет вялікага, амаль сімвалічнага сэнсу». І ў радках, напісаных у прадчуванні святочнага майскага салюта, ён будзе ўзрушана гаварыць, звяртаючыся да сябе і да іншых: «У дні, калі так радасна і ўсенародна адзначаецца дзень нашай перамогі, мы, былыя франтавікі, ні на хвіліну не маем права забывацца пра тых, хто цяпер мог бы быць з намі, але каго даўно ўжо няма на зямлі. Болей за трыццаць гадоў назад яны ў апошні раз упалі на траву і засталіся ляжаць там, жывучы толькі ў нашай салдацкай памяці... Але вось нам пашчасціла дажыць да яе светлага дня (г. зн. Дня Перамогі. — **А. В.**), і наш неаддплатны доўг перад забітымі да канца нашых дзён будзе ляжаць на нашым сумленні». І далей, у заключэнне артыкула, які так і называецца «Трывожная памяць», В. Быкаў дадасць: «Зрэшты, можа, так і павінна быць. Таму што ў гэтай нашай трывожнай памяці — тая векавечная сувязь, якая назаўжды і непарыўна эвязала нас, жывых, з мёртвымі».

Па-другое, памяць вайны асацыіруецца ў В. Быкава яшчэ з тым добрым, што адкрывалася ў часіну суровых выпрабаванняў, з ідэаламі франтавога братэрства і самаахвяравання. «Вельмі хацелася б, — усклікне ён у адным са сваіх артыкулаў, — каб вечна жылі ў людзях вялікія пачуцці братэрства, любові і нянавісці, народжаныя мінулай вайной». Да гэтай важнай для яго высновы ён будзе вяртацца не раз, то ў адной, то ў другой сувязі. У развагах пра паэзію П. Панчанкі пісьменнік зазначае: «Менавіта на вайне ва ўсім бляску раскрыліся перад ім непарушная сутнасць сяброўства, салдацкай вернасці, значэнне таварыскасці і ўзаемавыручкі. Вайна была доўгая і жорсткая, яна патрабавала мільёнаў ахвяр і безлічы чалавечых намаганняў. «Мы перакапалі паўЕўропы, перш чым перамогу адкапаць», — скажа паэт трохі пазней. Але наша перамога накладвае і на пераможцаў свой немалы абавязак, — у мірны час і пасля вайны чалавек найперш павінен заставацца чалавекам». Канстатуючы ва ўжо згаданым лірычным маналогу «Наша сіла і воля» той сумны факт, што час бязлітасны не толькі да самой чалавечай памяці, але і да вопыту тых адносін, якія складваліся на вайне, што колішняя франтавая дружба не заўсёды вытрымлівае выпрабаванне хадою дзён, В. Быкаў ставіць пытанне аб тым, каб чалавек не здаваўся, не пасаваў перад абставінамі, а, наадварот, маральна ўдасканальваўся—імем гераічнага мінулага. «Адстаяць ад разбуральнага ўздзеяння часу духоўнае я чалавека, — гаворыць ён далей, — зберагчы ідэалы франтавой маладосці, да канца дзён застацца вернымі духу таварыскасці, дружбы, захаваць гатоўнасць у любы момант рынуцца ў бой за справядлівасць — хіба не такі маўклівы заклік праглядваецца ў позірках нашых даўніх і вечна маладых таварышаў?»

Ёсць і яшчэ адна важкая прычына, сцвярджае В. Быкаў, дзеля якой неабходна помніць вайну: мінулую вайну неабходна помніць для таго, каб своечасова разгадаць і прадухіляць войны новыя, быць ва ўсеўзбраенні ў змаганні з сіламі зла і агрэсіі. Сказана ж філосафам: «Хто не хоча помніць мінулага, той навек асуджаны на тое, каб перажыць яго зноў і зноў». «Хатынь, — цытую гістарычны нарыс В. Быкава «Званы Хатыні», — дае чалавецтву просты, як ісціна, і вечна мудры ўрок пільнасці. Чалавецтва павінна памятаць аб смяртэльнай пагрозе, якой яно пазбегла ў недалёкім мінулым, і штодзённа клапаціцца пра будучыню. На зямлі, на жаль, ніколі не было недахопу ва ўладарных авантурыстах, заўсёды спелі на ёй цёмныя сілы агрэсіі, ахвочыя пажывіцца за кошт міралюбства іншых. У наш жорсткі час недастаткова любіць мір — трэба ўмець яго абараняць». Аб гістарычна важных і актуальных для нашага часу ўроках мінулай вайны гаворыць аўтар кнігі і ў іншых сваіх выступленнях. Самы важны з гэтых урокаў, падкрэслівае ён, «заключаецца ў катэгарычнай неабходнасці для свету і чалавецтва ўсямернага згуртавання ў імя міру, жыцця і прагрэсу».

Памяць вайны, яе ўрокі... Атрымалася так, што якраз у той час, калі абдумваў і пачынаў пісаць гэтую рэцэнзію, у поле маёй чытацкай увагі траплялі адна за адной новыя кнігі — «Сёння і памяць» Я. Брыля, «Бліскавіцы на гарызонце» У. Савіцкага, «Сачыненне на вольную тэму» А. Кудраўца, «У вайны не жаночы твар» С. Алексіевіч, «Цана цішыні» В. Жуковіча, а таксама змешчаныя ў апошніх нумарах часопісаў «Карэнні і галіны» І. Шамякіна, аповесць «Жывыя жывуць» Т. Бондар, нарыс «Сляза і кветка» М. Карпенка (апошні, хто не ведае пра лёс загінуўшых у вайну маці, у тым ліку пра маці П. Броўкі). І ўсе гэтыя, увогуле розныя ў шмат якіх адносінах творы, пацвярджалі тым не менш, кожны па-свойму, слушнасць быкаўскіх слоў аб тым, што, нягледзячы на схільнасць індывіду-

(Заканчэнне на стар. 6).

«НЕЛЬГА БУДАВАЦЬ БУДУЧЫНЮ БЕЗ ПАМЯЦІ АБ МІНУЛЫМ...»

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5).

альнай чалавечай памяці рабіцца з цягам часу выбарачнай, даваць сабе паслабленне, літаратура не мае права дазваляць сабе падобную палёгку, тым больш бяспамятнасць павінна, наадварот, помніць усё і ўся, нічога не ўпускаць: «нельга будаваць будучыню без памяці аб мінулым, нельга грэбаваць найвялікшым з чалавечых выпрабаванняў — усенародным подзвігам, які даў людзям векапомны ўрок свабоды і непадлегласці».

Зборнік крытыкі і публіцыстыкі В. Быкава называецца «Праўдай адзінай», і назва гэтая безумоўна апраўдана. Разам з паняццем «памяць» ідзе ў цеснай звязцы па яго старонках паняцце «праўда». Адно выказванне, другое... І робіцца відавочным, што без гэтага, святога для яго, паняцця пісьменнік не ўяўляе сваіх мастацкіх пошукаў, свой сімвал веры, сваё ідэйна-эстэтычнае крэда. Гэтак жа, як і справу мастацтва наогул. На самым пачатку творчага шляху праўда ўявілася яму суровай і адначасова светлай вяршыняй, да якой трэба ісці, нават караскацца любой цаной («Тры абзацы аўтабіяграфіі»). І гэтае ўяўленне, як сведчаць старонкі зборніка, застаецца з ім заўсёды. У гутарцы з М. Матукоўскім для нядзельнага дадатку да «Известий», на пытанне, чым ён больш за ўсё даражыць у сваіх творах, В. Быкаў тут жа, не задумваючыся, адкажа: «У сваіх? Хутчэй ва ўсіх і ўсякіх: праўдай!»

Яно і зразумела. Нельга быць верным памяці вайны, памяці паўшых, весці з імі шчырыя маўклівыя размовы і не быць у той жа час праўдзівым у сваім слове пра іх. Так, мёртвыя сораму не ймуць, ну а калі размова ідзе пра жывых?.. У сваім выступленні на VII Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў (яно надрукавана ў зборніку пад загалоўкам «На чарговым этапе») В. Быкаў гаварыў: «Аб вайне напісана многа ва ўсіх жанрах літаратуры, на ўсіх 77 мовах народаў нашай краіны, зразумела, з рознай ступенню майстэрства, умельства, таленавітасці. Што да мяне, чытача (ды, я думаю, і да большасці чытачоў, якія ваявалі і не ваявалі), то, можа быць, для нас даражэй за ўсё ў гэтых кнігах не так майстэрства выкладання, не так маляўнічасць стылю, як — праўда. За тысячагоддзі зямной гісторыі аб вайне на ўсіх мовах свету напісана многа няпраўды, прыгожых казак і проста хлусні. Гэта і зразумела, таму што вайна, як вядома, заўсёды была працягам палітыкі ваеннымі сродкамі і служыла інтарэсам уладатрымальнікаў. Наша ж вялікая вайна, на палях якой вырашаўся лёс планеты, мела іншы характар і іншыя мэты, якія адрозніваюцца ад папярэдніх. Гаварыць няпраўду аб ёй не толькі амаральна, але і злачынна як у адносінах да мільёнаў яе ахвяр, так і ў адносінах да будучыні». І далей пісьменнік дадасць з уласцівай яму бескампраміснасцю меркаванняў: «Кроў, пакуты і пот народа ў мінулай вайне накладваюць на нас найпершае з абавязацельстваў — безумоўную вернасць праўдзе». (Прыгадваецца, дарэчы, як жыва было ўспрынята гэтае выступленне ўдзельнікамі пісьменніцкага форуму).

Менавіта гэты крытэрый — вернасць праўдзе народнага жыцця і часу — кладзе перш за ўсё В. Быкаў і ў аснову сваіх адносін да класічнай спадчыны (Леў Талстой, Якуб Колас, Кузьма Чорны), да літаратурнай і грамадскай дзейнасці сваіх старэйшых таварышаў па пяру і настаўнікаў (А. Твардоўскі, С. Смірноў, М. Лынькоў, С. Залыгін, І. Мележ). Напрыклад, заўважаючы, што праўда як эстэтычная катэгорыя далёка не простае паняцце і што «менавіта праўда жыцця даецца для адлюстравання толькі значным і мужным талентам», В. Быкаў піша: «Што датычыць Мележа, дык безумоўна, што адна з галоўных вартасцей яго прозы, ягонай «Палескай хронікі» гэта менавіта праўда сялянскага жыцця ў яго самым найбольшым аб'ёме». У сваім пранікнёным слове пра Твардоўскага ён нагадвае нам — як беражліва захаваны запавет — выказванне выдатнага паэта: «Мастацтва помслівае. Яно жорстка распраўляецца з тымі мастакамі, якія свядома ці не свядома здраджваюць яго асноўным законам — законам праўды і чалавечнасці».

З гэтага ж крытэрыя — праўдзівасць, сумленнасць, кіраванне высокім маральным імператывам (адно з любімых слоў Быкава-публіцыста) — зыходзіць аўтар кнігі «Праўдай адзінай» і ў сваіх ацэнках творчасці найбольш блізкіх яму па лёсе і духу літаратурных равеснікаў, паплечнікаў па цэху так званай ваеннай прозы. Я тут маю на ўвазе ацэнкі (як правіла, добразычлівыя, прасякнутыя пачуццём салідарнасці), выказаныя на адрас твораў А. Адамовіча, Ю. Бондарава, Г. Бакланава, В. Астаф'ева, У. Багамалова і інш.

Наогул, трэба сказаць, раскіданыя па старонках зборніка адпаведныя эпітэты і характарыстыкі даюць выразнае ўяўленне аб быкаўскім ідэале мастака як змагара за ісціну, за ідэю, як таленту, аплодненага гуманістычным пачаткам і грамадзянскай мужнасцю, як «апостала добрага і справядлівасці» (словы аўтара зборніка). В. Быкаў мог бы тут выказаць як свае ўласныя словы аўтара славутага «Утрапёнага рэпарцёра»: «Той, хто не церпіць праўды, даказвае толькі, што яго схільнасць да літаратурнага занятку нямногага варта. Рашаючая ўласцівасць пісьменніка не стыль, а мужнасць». Уласна кажучы, блізкія да гэтых словы не-не ды і сустракаюцца ў зборніку, калі размова заходзіць аб стылі, аб творчай манеры і іншых падобных рэчах.

Значную частку зборніка «Праўдай адзінай» складаюць публікацыі, звязаныя непасрэдна з поглядам іх аўтара на стан і надзённыя праблемы сучаснай беларускай літаратуры і мастацтва, з яго клопатам аб перспектывах іх развіцця, аб іх заўтрашнім дні. Тут трэба вылучыць перш за ўсё яго па-грамадзянску прынцыповае, прасякнутае глыбокай зацікаўленасцю ў поспеху справы выступленне з трыбуны апошняга п�іку, VIII з'езда пісьменнікаў Беларусі, артыкулы «Пяром аналітыка», «Нашы надзённыя клопаты», «Некалькі думак перад юбілеем», перадрукаваныя прадмовы да кніг П. Панчанкі, У. Караткевіча, Н. Гілевіча, В. Іпатавай, слова пра мастакоў М. Савіцкага і А. Кашкурэвіча, водгук на дакументальную кінастужку С. Алексіевіч і В. Дашука «У вайны не жаночы твар». «Літаратура, як і ўсё наша мастацтва, — дзеліцца В. Быкаў сваім роздумам у адным з названых артыкулаў, — знаходзіцца ў вельмі рухавым стане, у стане няспыннага дыялектычнага развіцця. Магчыма, праз нейкі час шмат што ў ёй запатрабуе перааацэнкі, некаторых удакладненняў яе вартасцей, але ўжо цяпер зразумелы як характар яе поспехаў, так і прычыны яе пралікаў. Трэба думаць, далей будзе лягчэй. У літаратуру прыйдуць новыя таленты, якія на новую ступень узнімуць яе багатыя і разнастайныя набыткі. Галоўнае, каб нязменным заставаўся яе асноўны запавет — вернасць інтарэсам свайго народа, які яе парадзіў і якому яна павінна служыць».

Літаратуразнавец і дапытлівы чытач знойдуць зборнік значным, карысным і ў тым сэнсе, што В. Быкаў адчыняе часам дзверы ў сваю творчую лабараторыю, дзеліцца сваім пісьменніцкім вопытам, прафесійнымі назіраннямі і «сакрэтамі» (каштоўную па-свойму справу тут робяць аўтары інтэрв'ю і гутарак).

Але, хачу зазначыць, тэматыка і змест зборніка не абмяжоўваюцца сказаным, не вычэрпваюцца чыста літаратурнымі клопатамі пісьменніка. Яго літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы, публічныя выступленні на розных форумах і імправізаваныя адказы ў гутарках з інтэрв'юэрамі сведчаць таксама аб шырокім грамадскім кругаглядзе пісьменніка, аб вастрыні яго сацыяльнага бачання. Мы бачым, што ў арбіце яго ўвагі — самыя розныя з'явы і пытанні нашага сучаснага грамадскага, эканамічнага і духоўнага жыцця. Прытым, што яшчэ паказальна, у некаторых з гэтых пытанняў ён выяўляе самую сур'ёзную дасведчанасць, жыццёвую мудрасць і дальнабачнасць. Прывяду ў якасці ілюстрацыі два прыклады. Некалькі год назад, у размове з карэспандэнтам «Советской культуры» В. Быкаў загаварыў аб праблеме дарог на сяле. «Было б няправільна, — падкрэсліў ён, — разглядаць яе як праблему вузкую: у яе ўпіраецца развіццё ўсёй сельскай эканомікі». Наколькі гэтае назіранне з'яўляецца правільным, сведчыць ужо хаця б такі факт: нядаўна на старонках «Правды» пад рубрыкай «Сацыяльныя праблемы сяла» быў змешчаны артыкул нашага пісьменніка і журналіста І. Новікава, які так і называўся «Усё пачынаецца з дарогі...» Другі прыклад. У свой час у інтэрв'ю для часопіса «Журналист» (яно надрукавана ў кнізе пад загалоўкам «Газета — школа слова») В. Быкаў назваў «адной з вастрэйшых праблем сучаснасці — алкагалізм» і ставіў катэгарычна пытанне аб неабходнасці «ўсебаковага даследавання гэтай сапраўды жахлівай праблемы ў яе сацыялагічным, эканамічным, псіхалагічным, этнаграфічным аспектах». У святле апошніх падзей няцяжка ацаніць такую пранікліваасць грамадскага клопату пісьменніка.

Атрымалася так, што кніга «Праўдай адзінай» выйшла ўслед за чатырохтомным зборам твораў пісьменніка. Яна з'яўляецца такім чынам своеасаблівым аўтарскім пасляслоўем, своеасаблівай размовай нашага выдатнага мастака слова з чытачом, размовай шчырай, даверлівай, прынцыповай, прасякнутай гарачай верай у духоўны патэнцыял літаратуры, у тое, што яна «з дзіўнай настойлівасцю пракладвае ў чалавечай свядомасці шлях да дабра і справядлівасці».

Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

БРАТНЯЙ СУВЯЗІ ПРАЯВЫ...

Творчасць народнага паэта Беларусі Максіма Танка з'яўляецца тым сілавым полем, якое моцна прыцягвае ўвагу даследчыкаў. Так, здаецца, зусім нядаўна выйшла манаграфія У. Калесніка, у якой аўтар даў грунтоўны аналіз паэтычнага свету мастака, глыбока і пераканаўча прасачыў вытокі яго палымянага слова, і вось новая сустрэча з даследаваннем творчасці паэта—кніга Анатоля Вераб'я «Максім Танк і польская літаратура».

Параўнальнае вывучэнне літаратур заўсёды было адным з самых актуальных метадаў у літаратуразнаўстве. Але, несумненна, асабліва часта гэтым метадам карыстаюцца на сучасным этапе. Апошнім часам, «калі адбываюцца працэсы інтэнсіўнага ўзаемазбліжэння і ўзаемаўзбагачэння нацыянальных культур», перад беларускімі літаратуразнаўцамі, як правільна зазначае аўтар у кароткім уступе да кнігі, «стаіць задача ўсебакова даследаваць беларускую літаратуру ў параўнальна - супастаўляльным плане ў першую чаргу з суседнімі рускай, украінскай і польскай літаратурамі». Зазначым, што не трэба абыходзіць увагай і паўночных суседзяў: літоўцаў і латышоў. Менавіта шырокі кантэкст дае магчымасць глыбей высветліць істотныя моманты гісторыі нацыянальнага краснага пісьменства, больш дакладна вызначыць яго ролю і месца ў супольнасці літаратур.

«Аб традыцыях польскага рамантызму ў творчасці Максіма Танка» — так называецца першы і, як нам здаецца, найбольш удалы раздзел кнігі. Спадчына польскіх рамантыкаў XIX ст. нароўні з творчасцю нацыянальных (Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч) і рускіх (ад А. Пушкіна да М. Горкага і У. Маякоўскага) класікаў аказала першаступеннае і вельмі моцнае ўздзеянне на выспяванне самастойнага паэтычнага таленту М. Танка.

Для маладога заходнебеларускага паэта, які жыў ва ўмовах панскай Польшчы і змагаўся за вызваленне свайго народа, рэвалюцыйныя і патрыятычныя матывы паэзіі А. Міцкевіча, Ю. Славацкага і іншых прагрэсіўных польскіх рамантыкаў былі сугучныя і вельмі блізкія. Народнасць і нацыянальная самабытнасць твораў лепшых прадстаўнікоў польскага рамантызму таксама моцна прываблівала М. Танка.

Як і для кожнага творцы, для маладога М. Танка імкненне прадоўжыць традыцыі сведчыла найперш пра жаданне дасягнуць мастацкай дасканаласці сваіх твораў, авалодаць высокім паэтычным майстэрствам. Але, якім бы здольным ні быў мастак, у такой справе, вядома, цяжка пазбегнуць выдаткаў. Як слушна даводзіць А. Верабей, у асобных вершах першай палавіны 30-х гадоў «назіраецца знешняе засваенне гэтых традыцый («Новы год», «У дарозе», «Сфінкс»). І ўсё ж творчае ўспрыманне беларускім паэтам творчага вопыту польскіх рамантыкаў пераважала. Гэта сведчыла пра яго сталасць. На думку аўтара, ужо на першым часе М. Танк выступіў не проста як таленавіты вучань, але як «варты сапернік і вялікі паэт».

А. Верабей. Максім Танк і польская літаратура. Мінск. «Навука і тэхніка», 1984.

У АДЗІНЫМ СТРАІ ЗМАГАРОЎ

з фашызмам ў гады вайны ішлі і прадстаўнікі міліцыі. Адны з іх былі мабілізаваны ў Чырвоную Армію, другія адразу ж пачалі выконваць важныя спецыяльныя заданні, трэція ўліліся ў атрады народных мсціўцаў. Пра іх гераічную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі напісана нямала кніг, у тым ліку і дакументальных. Пэўным дапаўненнем у гэты гераічны летапіс стаў і калектыўны зборнік «Берагчы яе свята», што выпушчаны ў «Бібліятэчцы часопіса «Советская милиция».

З матэрыялаў, прадстаўленых у кніжцы, два маюць дачыненне да падзей, якія адбываліся на тэрыторыі часова акупіраванай ворагам Беларусі. Адзін з іх — дакументальная аповесць «На досвітку 22-га з пасту не змяніліся...». Аўтар яе, - маскоўскі журналіст М. Сальнікаў расказвае пра выключную адданасць міліцыянераў свайму службоваму абавязку і вернасці Радзіме.

Адбылося гэта ў Ваўкавыску. У ноч з 21 на 22 чэрвеня ахову будынка раённага банка нёс нарад, які ўзначальваў старшы міліцыянер Пётр Касіла. Фашысты гарадок бамбілі прыцэльна: «прамым попаданнем былі разрушаны будынкі райкома партыі, гарадскога аддзела НКУС, нафтабаза, вакзал». У гэтай складанай абстаноўцы Касіла павінен быў сам прымаць рашэнне. І ён яго прыняў — любой цаной выратаваць грошы, якія захоўваліся ў банку.

У нарысе «Тры выстралы ў чэрвені» расказваецца пра оперупаўнаважанага Брэсцкага раённага аддзела міліцыі Цімафея Дабралінскага, які ў першы ж дзень вайны смела сустрэў захопнікаў, а потым партызаніў.

Е. ДРОМІН.

«ДАЛЯГЛЯДЫ»

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціла чарговы нумар штогодніка «Далягляды», на старонках якога беларускаму чытачу прапануюцца ў перакладзе з замежных моў празаічныя і паэтычныя творы сучаснай і класічнай зарубежнай літаратуры.

У юбілейны год — 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне — па даручэнні рэдкалегіі «Далягляды» А. Гардзіцкі сустрэўся з народным пісьменнікам Беларусі, Героем Сацыялістычнай Працы, членам рэдкалегіі альманаха В. Быкавым. Інтэрв'ю з ім — «Слова пісьменніка ў змаганні за мір» — друкуецца на першых старонках сёлетняга выпуску зборніка.

Традыцыйны раздзел альманаха «Проза, паэзія» адкрываецца творамі сучаснай балгарскай прозы. Жанрава разнастайную і багатую спадчыну — больш за трыццаць кніг апавяданняў, аповесцей, раманаў пакінуў вядомы празаік Павел Вежынаў, які прымаў актыўны ўдзел у вайне супраць гітлераўскай Германіі. На беларускай мове выдадзены аповесці П. Вежынава «Вышэй за ўсё» і «Бар'ер». «Далягляды» прапануюць беларускаму чытачу апавяданне «Вершы» ў перакладзе У. Анісковіча.

Публікуецца таксама ў перакладзе У. Анісковіча апавяданне «На грузавіку» Ка-

Ён падышоў да традыцый польскай рамантычнай паэзіі XIX ст. па-наватарску, «прымяняльна да новых гістарычных умоў і да новага гістарычнага часу».

Творчасць М. Танка развівалася ў цесным узаемадзеянні з польскай рэвалюцыйнай паэзіяй 30-х гадоў. Даследаванню гэтага пытання прысвечаны другі раздзел працы. Сувязь заходнебеларускага мастака з польскімі рэвалюцыйнымі паэтамі (у першую чаргу У. Бранеўскім і Б. Ясенскім) аўтар вытлумачвае іх «агульнай ідэйна-эстэтычнай праграмай, падабенствам творчых біяграфій, а таксама блізкімі сацыяльнымі ўмовамі, у якіх развівалася іх творчасць». І з гэтым цяжка не згадзіцца. Выклікае частковае пярэчанне іншае: А. Верабей, як нам здаецца, перабольшвае ролю паэзіі У. Бранеўскага ў творчым станаўленні маладога М. Танка. Тут варта ўлічваць усю складанасць і супярэчлівасць падобных сувязей. Як вядома, на даверaснёўскую паэзію М. Танка вялікае ўздзеянне аказала і творчасць паэта-трыбуна У. Маякоўскага. Відаць, больш пад яго жыватворным уплывам у вершах беларускага паэта яскрава выявілася «шматгранасць унутранага свету лірычнага героя», зліліся ў адно цэлае ярка публіцыстычны, страсна агітацыйны і лірычны пачатак. М. Танк высока цаніў паэзію У. Маякоўскага. Менавіта рускі паэт паказаў заходнебеларускаму паэту, як трэба пяром служыць свайму народу, на ўвесь голас гаварыць з чытачом. Творчасць У. Маякоўскага мела для М. Танка выключна важнае значэнне. Нездарма паэт, упершыню прачытаўшы аднатомнік вершаў У. Маякоўскага па рускай мове, запісаў у дзённіку: «Як шкада, што кніга не трапіла да мяне на некалькі год раней. Чытаю і многія рэчы пачынаю бачыць у іншым святле».

А. Верабей слушна адзначае ідэйна-эстэтычную сугучнасць рэвалюцыйнай творчасці М. Танка і асобных вершаў палякаў В. Вандурскага і С. Стандэ. Імкненне па-майстэрску карыстацца зброяй вострай сатыры, з'едлівай іроніі, як лічыць даследчык, збліжае беларускага паэта з Э. Шыманскім і Л. Пастэрнакам, вершы якіх вызначаюцца значнай глыбінёй лірычнага пачуцця і страсным публіцыстычным гучаннем.

Добра чытаюцца старонкі кнігі, дзе гаворыцца пра адносіны маладога паэта да польскага авангардызму. Паводле меркаванняў літаратуразнаўцы, «калі паэзія М. Танка была ў нечым блізкай да польскай авангардная літаратуры, то гэта блізкасць выяўлялася хутчэй за ўсё ў бунце супраць старой паэтычнай формы і ў барацьбе за новую рэвалюцыйную паэтыку». Знаёмства з творчасцю авангардыстаў, асабліва ў пачатковы перыяд, у многім пашырыла ўяўленні паэта аб мастацкіх магчымасцях літаратуры. Яно дапамагло яму знайсці сваё месца ў складаным літаратурным жыцці.

Зазначым: сувязь «польская рэвалюцыйная паэзія — Максім Танк» даследавана ў працы А. Вераб'я дастаткова поўна і пераканаўча, з цвёрдай навуковай абгрунтаванасцю. Аднак ёсць за што аўтара і папракнуць. На нашу думку, ён, бывае, празмерна захапляецца, а часам і зусім абмяжоўваецца правядзеннем аналогій і знешніх супадзенняў у творчасці польскіх рэвалюцыйных паэтаў і М. Танка. А гэта, як вядома, далёка не асноўнае пры вывучэнні традыцый. Важна глыбей пранікнуць у сутнасць творчых манер мастакоў, выявіць іх духоўную сувязь, пераемнасць.

Вывучэнне перакладаў беларускага паэта з польскай мовы прыводзіць даследчыка да слушнага сцвярджэння, што на сучасным этапе М. Танк не выказвае асаблівай зацікаўленасці да тых аўтараў, якія з'яўляюцца прыхільнікамі класічнага кірунку ў польскай паэзіі. Паэт, сам будучы актыўным эксперыментатарам у галіне паэтычнай формы, перакладае найперш творы, дзе арганічна спалучана традыцыйнае і наватарскае. А. Верабей, адзначаючы мастацкую дасканаласць перакладаў М. Танка, яго беражлівае стаўленне да арыгіналаў, акцэнтуе ўвагу і на праліках перакладчыка. Так, крытычныя заўвагі даследчыка выклікалі пераклады вершаў А. Міцкевіча «Акерманскія стэпы» і «Як з шорахам вуж прапаўзае недзе», у якіх назіраецца вобразнае разыходжанне паміж арыгіналам і перакладам.

Апошні раздзел кнігі прысвечаны польскім даследаванням паэзіі М. Танка, а таксама перакладам твораў беларускага мастака на польскую мову. У вывучэнні гэтага пытання літаратуразнаўца змог сказаць сваё, важкае слова. Аўтар правільна піша, што творчасць М. Танка была рана заўважана і высока ацэнена польскімі перакладчыкамі і крытыкамі. «Самабытны мастацкі талент паэта, а таксама тое, што ён жыў на тэрыторыі Заходняй Беларусі і быў асабіста знаёмы з віленскімі польскімі паэтамі, садзейнічалі папулярнасці маладога мастака ў Польшчы». У перакладах на польскую мову М. Танк паўстае як таленавіты, шмагранны і самабытны творца.

Кніга «Максім Танк і польская літаратура» атрымалася хоць і не бясспрэчная, але цікавая. Імпануе імкненне аўтара пазбягаць агульных мясцін, прапісных ісцін, шматслоўя. Даследчык схільны да канкрэтнага, дакладнага аналізу. У манаграфіі А. Вераб'я даецца шырокае і сістэматычнае асвятленне ўзаемадзеяння беларускага паэта з польскай літаратурай у розныя гістарычныя перыяды. Без сумненняў, даследаванне дзякуючы яго пазнавальным якасцям, стане надзейным дапаможнікам для тых, хто цікавіцца гісторыяй роднай літаратуры і яе сувязямі з літаратурамі суседніх народаў.

Мікола МІКУЛІЧ.

мена Калчава, аўтара шматлікіх аповесцей, апавяданняў, нарысаў, п'ес, які ў 1976 годзе наведаў Беларусь і сваімі ўражаннямі падзяліўся з балгарскім чытачом у нарысах.

Нізку «З польскай паэзіі» склалі вершы актыўнага ўдзельніка польскага Супраціўлення Кшыштава Каміля Бачыньскага. Вершы пераклаў У. Мархель.

Пад рубрыкай «Гімны жыццю, змаганню, надзеі» друкуецца нізка з сучаснай кубінскай паэзіі. Паэты, чые вершы прапануе ўвазе чытачоў у сваім перакладзе А. Вярцінскі, адносяцца да пакалення, якое на Кубе называюць першым пакаленнем рэвалюцыі 1959 года. Усведамленне гістарычнага моманту, які перажывае ў апошнія дзесяцігоддзі новая, сацыялістычная Куба — адметная рыса твораў Хасе Альварэса Браганьё, Раберта Фернандэса Рэтамара, Рауля Луіса, Хайда Хаміса і іншых.

«Чырвоная капэла»... Пад гэтай назвай у гады другой сусветнай вайны змагаліся супраць фашызму мужныя і поўныя веры ў лепшую будучыню людзі. Сярод іх былі паэты Вільгельм Тэус, Альфрэд Шміт-Зас, Адам Кукгоф, вершы якіх друкуюцца ў перакладзе Л. Баршчэўскага.

Раздзел «З сучаснай прозы і паэзіі ГДР» адкрываецца аповесцю вядомага паэта і празаіка, удзельніка баёў у Іспаніі і руху Супраціўлення ў Францыі Штэфана Гермліна «Вячэрняе святло» ў перакладзе У. Чапегі. У гэты раздзел увайшлі вершы аднаго з выдатных сучасных пісьменнікаў ГДР Увэ Бергера (пераклад Ф. Баторына).

Упершыню на старонках «Далягляду» друкуюцца ў перакладзе У. Шчаснага з мовы урду празаічныя творы сусветна вядомага індыйскага пісьменніка Крышана Чандара «Прасцяк» і «Яма».

Агасціньё Нэта — першы прэзідэнт Народнай Рэспублікі Ангола — у сваіх напоўненых грамадзянскім пафасам вершах паказаў цэлую эпоху барацьбы свайго народа за незалежнасць. Нізку вершаў паэта падрыхтавалі для «Далягляду» Н. Тулупава і А. Емяльянаў.

Выносяцца на суд чытача два апавяданні польскага празаіка Анджэя Герлоўскага «Сівыя валасы» і «Дрэва яго сына» ў перакладзе Я. Лецкі.

«Далягляды» знаёмяць чытачоў з сербскім паэтам Васка Попы, вершы якога вызначаюцца кампазіцыйнай дасканаласцю, нагадваюць фрэскі ці абразкі (пераклад А. Разанава). У перакладзе І. Чароты друкуюцца гумарыстычныя апавяданні югаслаўскага фельетаніста Міхайлы Хабулы «Незвычайная калекцыя» і «Ці ж не творца, ці ж не пісьменнік?». С. Дорскі падрыхтаваў для «Далягляду» пераклад апавяданняў «Вяртанне кіталова» шатландскага празаіка Джорджа Макэй Браўна і «Дзейныя асобы ў парадку паяўлення» ірландскага пісьменніка Уолтэра Мэкіна.

Традыцыйны раздзел «Спадчына» склалі вершы народнага мастака Чэхаславакіі, актыўнага барацьбіта за мір Вітэслава Незвала ў перакладзе Х. Жычкі, нізка апавяданняў вядомага французскага пісьменніка Праспера Мерымэ ў перакладзе Н. Мацяш і З. Жук, а таксама паэма «Пустыя людзі» вядомага англійскага паэта Томаса Стэрнза Эліота ў перакладзе В. Валынскага.

У раздзеле «Пісьменнік і час» доктар філалагічных навук В. Каваленка ў сваім артыкуле «Адзінства духу і волі» разважае пра блізкасць матываў і вобразаў у савецкай, югаслаўскай і польскай «ваеннай» прозе, а Г. Тварановіч разглядае творы «Млечны шлях» Кузьмы Чорнага і «Мост на Дрыні» Івы Андрыча.

Раздзел «Партрэты нашых сяброў» прадстаўлены артыкулам В. Нікіфаровіча «Пазначана любоўю», у якім аўтар дае творчы партрэт балгарскага перакладчыка і літаратуразнаўца Сімяона Уладзіміравa.

Завяршае зборнік традыцыйны раздзел «Хроніка перакладных выданняў».

В. ВІЛЕНСКІ.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

ПАЭТ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ РАМАНТЫКІ

Да 90-годдзя з дня нараджэння Э. БАГРЫЦКАГА

Калі вымаўляецца імя Эдуарда Багрыцкага (1895—1934), у памяці адразу ўзнаўляюцца паэтычныя радкі, што даўно зрабіліся крылатымі:

Нас водила молодость
В сабельный поход,
Нас бросала молодость
На кронштадский лёд.

Боевые лошади
Уносили нас,
На широкой площади
Убивали нас.

Но в крови горячечной
Подымались мы,
Но глаза незрячие
Открывали мы.
(«Смерць піянеркі»).

У гэтых радках Багрыцкага ўвасобіўся пафас яго паэзіі — паэзіі ўслаўлення рэвалюцыі і тых вялікіх пераўтварэнняў, якія яна прынесла. Вершы паэта авеяны гераічнай рамантыкай, у іх «мир, открытый настежь бешенству ветров». Непасрэдны ўдзельнік грамадзянскай вайны Багрыцкі добра ведаў, якімі нялёгкімі былі шляхі народа да свайго сацыяльнага вызвалення. Ён бачыў, якія велізарныя ахвяры патрабаваліся для абароны заваёў рэвалюцыі. Героямі яго твораў сталі «прошедшие с боем леса и воды, всем ливням подставившие лицо чекисты, механики, рыбоводы». Паэт быў побач з гэтымі людзьмі, адчуваў сябе неад'емнай часткай народных мас. У вершах ён заўсёды гаварыў ад свайго імя і імя сваіх герояў, а лепш сказаць, яго голас цалкам зліваўся з іх галасамі:

Мы плакали над телами
друзей;
Любовь погребали мы;
Погибших товарищей имена
Доселе не сходят с губ.
(«Апошняя ноч»).

Э. Багрыцкі нястомна славіў подзвіг свайго пакалення, якое пачало пракладаць шляхі прыгнечаным і зняважаным у светлае будучае. Сваіх сучаснікаў паэт называў пераможцамі, разумеючы грандыёзную маштабнасць іх стваральнай працы:

Каждый из нас, забыв о себе,
Может, неловко и неумело
Губы кусая, хрипя в борьбе,
Делает лучшее в мире дело.
(«Гутарка з сынам»).

У вершах Багрыцкага пульсавала само жыццё з усімі яго складанасцямі і супярэчнасцямі. Гэта светлыя творы, якія дыхаюць бадзёрасцю і свежасцю. Яны аптымістычныя, поўныя веры ў шчаслівую будучыню.

І паэт меў падставы верыць у заўтрашні дзень. «Не досыпая, не долюбя, молодость наша шла», — пісаў ён і радаваўся, што тыя мэты, за якія змагаўся разам са сваімі сябрамі, здзяйсняюцца наяву, выяўляюцца ў абрысах новага жыцця.

Асабліва выразна гэта ідэя адлюстравана ў вершы «Смерць піянеркі». «Ніколі яшчэ сярод «работников страны», апетых Багрыцкім, не з'яўляўся такі юны, неапераны герой, які толькі рыхтуецца ўступіць у жыццё! — пісаў адзін з літаратуразнаўцаў. — У перадсмяротнай самоце Валі, у той рашучасці, з якой яна адмаўляе ўсе спакусы мяшчанскага побыту, паэт убачыў вялікі подзвіг і сапраўдную мужнасць». Подзвіг юнай піянеркі Багрыцкім успрыняты і пададзены як эстафета ад аднаго пакалення да другога. У гэтым подзвігу ён убачыў бессмяротнасць рэвалюцыі. «Не погибла молодость, молодость жива!» — сцвярджаў паэт.

«Дума пра Апанаса», «Смерць піянеркі», «ТВС» «Апошняя ноч», «Чалавек прадмесця», «Размова з сынам» і шэраг іншых твораў Багрыцкага занялі трывалае месца ў савецкай паэзіі, залічаны ў яе залаты фонд. Служэнне рэвалюцыйным ідэалам патрабавала ад паэта поўнай аддачы чалавечай сілы і энергіі, творчага напружання. «Поэтом великой страсти и глубокого дыхания» лічыў яго А. Суркоў.

Прыемна адзначыць цікавасць Багрыцкага да Беларусі, да беларускай літаратуры. У 1927 г. ён наведаў Мінск, выступаў на літаратурных вечарах, сустракаўся з працоўнымі горада. Высока цаніў талент Янкі Купалы. З любоўю пераклаў на рускую мову яго вершы «Дзве таполі», «Зімой у лесе», «Крым», «Паязджане», «Снег» і інш. З 1930 г. яны друкуюцца ў кнігах народнага песняра, што выдаюцца на рускай мове. У сваю чаргу многія беларускія паэты захапляліся паэзіяй Багрыцкага, абапіраліся на яго мастацкія набыткі ў творчых пошуках. П. Броўка прысвяціў яму верш «У Кунцаве». Творы Багрыцкага неаднаразова перакладаліся на беларускую мову. У перакладзе М. Хведаровіча гучыць па-беларуску славутая паэма «Дума пра Апанаса».

Паэзія Багрыцкага ніколі не перастане хваляваць чытачоў, бо яна ўслаўляе герояў баёў і працы, бескарыслівасць і шчодрасць, мужнасць і адданасць грамадзянскаму абавязку, праўду і дабро. Для паэзіі Багрыцкага непрымальныя заспакоенасць, мяшчанская сытасць. Яна бязлітасная да ўсяго, што прыніжае чалавечую годнасць. Яна заўсёды сучасная, паколькі ў ёй сённяшні дзень неаддзельны ад заўтрашняга.

Цімох ЛІЯКУМОВІЧ.

ВЫДАЕ «ХУДОЖЕСТВЕННАЯ ЛИТЕРАТУРА»

У наступным годзе ў выдавецтве «Художественная литература», як і раней, выйдзе некалькі кніг беларускіх пісьменнікаў. У аднатомніку А. Адамовіча будуць змешчаны аповесці «Хатынская аповесць» і «Карнікі». Змест зборніка З. Бядулі «Сярэбраная табакерка» складуць аднайменная казка, лепшыя апавяданні пісьменніка, аповесць «У дрымучых лясах». Рускамоўны чытач пазнаёміцца з выбранымі апавяданнямі і аповесцямі А. Кудраўца — «Ад вясны да вясны».

У серыі «Бібліятэка савецкай паэзіі» выдаецца зборнік А. Зарыцкага «Вершы», у які ўключана ўсё лепшае, што стварыў паэт больш як за пяцьдзесят гадоў працы ў літаратуры.

П. ЛЮКОУСКІ.

ПАЭЗІЯ

Васіль ЗУЁНАК

Начное вогнішча

Калі пажніўная бярэцца
Ноч на асенні халадок,
Якім жаданым ён здаецца—
Таемны сонечны грудок.

Якім далёкім і трывожным,—
Глядзіш, як з іншае зямлі...
Мужуюць людзі—і на кожным
Даспехі-водбліскі былін.

На міг шырэе паднябессе,
Калі падкіне хто галля.
А потым вусцішна на ўзлессі
Ізноўку звузіцца зямля.

Іскрынкі ападуць шматкроп'ем,
Як пыл з касмічнага пляча...
Аб чым яны ў той светлай кроплі—
Гамоняць, слухаюць, маўчаць?..

І што за людзі? Ці патрапіш
На добры час, на добры лад?
Ці раптам вылезеш нахрапам
І будзеш лішнім акурат?..

І вабіць вогнішча, і выйсці
Не дазваляе нейкі страх—
Той, першабытны, што калісьці
Згараў падушна ў злых кастрах...

Стаіш, няпэўнасцю схаваны
Ля заімшэлага камля.
І ўсё ж—ісці наканавана:
Не грэе вогнішча здаля.

А выйдзеш з цемры—і сустрэнеш
І цеплыню, і дабрыню.
І станеш моўчкі на калені:
Паклон—людзям, паклон—агню...

Гарыць касцёр на ўзмежку лета.
Гарыць на ўзлессі, у палях—
Маленькай зоркаю сусвету
І сэнс падказвае, і шлях:

Вось так адкрыцца на дасвецці,
Так добрым словам памагчы,
Паклікаць, абагрэць, прывеціць —
Як тое вогнішча ўначы.

Птушкі і бомбы

Сёння на кожнага жыхара планеты прыходзіцца ўсяго толькі 25 птушак і ажно 3 тоны выбуховых рэчываў (у тратылавым эквіваленце).

З газет.

«Хопіць, напартызанілі,
Кубы, В'етнамы, Танзаніі!» —
Раскашуйся, планета, у зацені:
Ракетнымі засадзілі лясамі,
Паясамі нейтроннымі падперазалі—
«Ёсць рэчы важнейшыя за мір», —
сказалі
Атамныя дызайнеры,
Дыназаўры цывілізацыі.

Ёсць, зразумела, важнейшыя —
Для вас, для сейфа з мільярдамі...
І што вам да нейкай
Вясенне-клейкай
Гаркавай алешыны,
На якой гняздуецца салавейка,
Што вам песня яго, калі з пагардаю
Мроіце: свет да крыла вашага
Мегатоннаю бомбай падвешаны...

Дваццаць пяць птушак?
І мала?!
На кожнага абарыгена?
Сантымент едзе на сантыменце!
Сумненняў рой умомант патушым,
Дзікунскія выправім гены, —
Радуйцеся і трыумфуйце душы:
Ёсць на кожную з вас
Выбуховы трохтонны запас
У тратылавым эквіваленце!

Во гэта—музыка,
Гэта рот,
Калі грымне ў касмічным ашчэры!
Хай патоп, хай сусветны пераварот
І хаос дажыццёвай эры,—
Толькі б рабскае племя,
Быдлячы род
Адпрэчыць
Ад камуністычнай веры!

— Спыніцеся, паны!—
Крычу я.—
Гісторыю не павернеш:
Не кабыла каўбойская,
Каб зацугляць і прышпорваць...
І зямля за мной:
— Хоць маўчу—

Я—
адзіная ў вас,
І няма таго зерня,
Каб пасеяць і зноў я вырасла
На палетках міжзорных.

Мы згаджаемся з ёй:
Ёсць і ў нас найважнейшыя рэчы.
Толькі мір перад імі—не пятак
на размен.
І не бомбай пазначаны лёс чалавечы.
«Мір, свабода і роўнасць!»—
Палымнее на нашых сцягах.
Не ступені крылатых ракет—
Салаўіныя песні на дванаццаць кален
Абуджаюць нам вольны шлях.
Птушка ў сэрцы
І сонца ў руках!

●

Між прозвішчаў на плітах мемарыяльнага комплексу «Прарыў» ва Ушацкім раёне я прачытаў: «Зузёнак»...

Як гэта блізка ад мяне
І прозвішчам і сутнасцю...
Ляціць, ляціць—і не міне
Мяне той гук адсутнасцю.

Хрысціў адзін свінцовы знак
Тады Ушачу з Начаю,
Ды тое «з» было, аднак,
Мне лёсам не пазначана.

І свіст ягоны кулявы—
Як быў—навекі з Вамі ён.
Той зычны гук забралі Вы
З усіх маіх экзаменаў.

Стаю, схіліўшы галаву,
Перад каменнай кнігаю:
У гэтым прозвішчы—жывуць,
Майго дзяцінства дні гараць.

Адзіны гук... Ён не кране
Мяне сваёй астудаю.

ПРОЗА

Пяць мужчын у леснічоўцы

Уладзімір АРЛОЎ

АПАВЯДАННЕ

Gloria victis!*

ТРАВЕНЬСКАЯ навальніца нацешылася маладой сілай і пакацілася над пушчаю далей, але дождж па-ранейшаму шамацеў так заўзята, што ў ягоным шуме дазвання раставала таканне старых ходзікаў. У цеснаватай леснічоўцы было сутонна і плаваў слабы пах мяты і яшчэ нейкіх сухіх зёлак, што пучочкамі віселі на шастку ў цёмным надпеччы. Падраная падушка з натрушаным на прыпеку пер'ем і луснуты гаршчок-спарыш, які валяўся ў прыдзверным куце, казалі воку, што гаспадары чамусьці пакінулі сваё жытло і калі вернуцца — невядома.

Аднак цяпер людзі тут былі. Двух зусім маладых і двух старэйшых мужчын у аднолькавых шэрых світках без шнуроў і ў высокіх, да каленяў, ботах з першага погляду можна было прыняць за паляўнічых. Здавалася, яны ад раніцы гойсалі па лесе, і цяпер пушча падарыла ім гэтую схоўню ад залевы.

Але гэта былі не паляўнічыя.

Каля халоднай печы стаялі ў піраміде чатыры штуцары вайсковага ўзору, з якімі не ходзяць на лесавую зверыну, а за поясам кожны з чацвярых меў рэвальвер або пісталет. Трое мужчын прымайстрыліся збоч вокнаў, куды раз-пораз кідалі насцярожаныя позіркі, і толькі чацвёрты дагары ляжаў на бурносе, пасланым на палку каля глухой сцяны. Яго правая рука была на тальмаху.

Апроч іх, у леснічоўцы быў пяты, і ён ужо ні на каліва не выдаваў на паляўнічага, бо на ім ладна сядзеў цёмна-зялёны мундзір з чырвонымі пагонамі капітана імператарскай арміі.

Пяты быў палонны.

Мужчыны маўчалі, і, хоць кожны з іх маўчаў на свой лад, можна было з пэўнасцю сказаць, што думаюць яны зараз пра адно.

Нейкую пару гадзін таму шырокі ўтравелы падворак леснічоўкі быў повен чалавечых галасоў і конскага гігатання. Потым гоман аціх, і перад калодзежным зрубам замёр шыхт узброеных людзей. На абымшэлым зрубе вісеў на кароткай дзідзе, апускаючыся краем да самага долу, абцёрханы сцяг. Людзі па чарзе выходзілі, цалавалі яго — хто стоячы, хто на каленях — і знікалі за стаўбурамі змрачнаватых вячыстых ялін, што цесна абсталі галявіну. Адны, перш чым ступіць пад шаты лесу, яшчэ прыпыняліся і крычалі на адвітанне нейкія астатнія словы, другія не азіраліся і толькі наддавалі кроку або паганялі коней...

Тыдзень таму атрад інсургентаў цёмнаю ноччу ўвайшоў у павятовы гарадок Горы-Горкі на самым усходзе Беларусі. На пляцы ўжо чакалі некалькі дзесяткаў студэнтаў тутэйшага земляробчага інстытута. Тыя, у каго не было зброі, атрымалі стрэльбы і штуцары.

Знячэўленая каманда ўнутранай варты* супраціўлялася адчайна, але нядоўга. Паўстанцы ўзялі цэйхгаўз, казармы і скарбоўню і без аніводнага стрэлу занялі інстытут. Даўжэй усіх адстрэльваўся з вокнаў свае кватэры начальнік варты, але на досвітку, які прыспешвалі зарыва пажараў, страляніна заціхла, і ўвесь горад апынуўся ў руках інсургентаў.

Камандаваў паўстанцамі высакалобы цёмна-русы чалавек у канфедэратцы, з навіслымі над вузкімі вачыма бровамі і прычасанымі данізу вусамі. Ён меў блізу сарака гадоў, адно плячо трымаў вышэй другога і адзываўся на мяно Тапор. Пад хмурным ранішнім небам ён сказаў прамову перад рэдкім натоўпам сабраных на пляц перапалоханых абываценяў. Пяцьдзесяць чалавек у адзенні службоўцаў беспаспяхова спрабавалі наладзіць авацыю. Тапор перасмыкнуў плячыма, саскочыў з параконкі, на якой стаяў, і аддаў атраду загад рыхтавацца да выступу.

Неўзабаве мяшчане, што сядзелі па хатах, цікуючы на вуліцу праз фіранкавыя візэрункі і шчыліны неадшчэпленых аканіц, зноў пачулі стрэлы. Паўстанцы аддавалі вайсковую пашану сваім забітым. Іх хавалі пад маладымі бярэзінамі на высокім рачным беразе. Часу збіваць труны не ставала, і сяброў па зброі аддалі зямлі загорнутымі ў рэквізаваныя персідскія дываны.

Надвечар, пакінуўшы цяжкапаранных у інстытуцкім дартуары, інсургенты на лёгкіх фурманках і забраных на конскім заводзе рысаках рушылі з горада па дарозе на Крычаў. Тапор вёў свае сто пяцьдзесят шабляў і стрэльбаў на злучэнне з атрадам Касы. Паўстанцы мелі загад захапіць магілёўскі артылерыйскі парк і прабівацца на захад.

Узяцце Горак было іх першым і апошнім поспехам.

За шэсць дзён, палячы справы валасных упраў, валячы тэлеграфныя слупы і затрымліваючы пошту, атрад прайшоў палявымі і лесавымі дарогамі болей за сотню вёрст. У кожнай вёсцы паўстанцы збіралі сялян і чыталі маніфест аб надзяленні зямлёй і скасаванні паншчыны. Але дзень ада дня гэты паход усё больш нагадваў кружлянне аточанага лаўцамі звера. Аршанскі і крычаўскі атрады ўжо былі разбітыя, і камандзір аршанцаў Будзіловіч чакаў у крэпасці расстрэлу. Па наваколлі яшчэ насіліся чуткі, што пад рукою ў Тапара ледзьве не паўтысячы ўзброеных да зубоў людзей, з суседняй Смаленшчыны яшчэ ляцелі ў сталіцу панічныя тэлеграмы аб прысылцы дадатковых войскаў, але кінутыя супраць атрада чатыры рэгулярныя роты і два дзесяткі казакоў з гарматаю шчыльней і шчыльней сціскалі сваё кальцо. Каб адрэзаць мяцежнікам шлях за Дняпро, усе паромы і чаўны былі пераведзеныя на правы бераг, і пры іх стаялі сялянскія варты. За спайманне паўстанца са зброяй мужыкі атрымлівалі ад бацюхны-цара пяць рублёў, за бяззбройнага — тры.

Учора на світанні, пусціўшы карнікаў па падманным следзе, Тапор пераправіўся цераз Проню і спаліў за сабою паром. Але надзея на тое, што атрад прарвецца ў мінскія лясы, пагасла ўжо і ў самых адважных сэрцах.

Сёння каля гэтае леснічоўкі Тапор, сапраўднага імя якога не ведаў, пэўна, нават ягоны ад'ютант, звярнуўся да інсургентаў з кароткім словам. Ён гаварыў сечанымі, дарэшты зразумелымі фразамі без усякага пафасу. Змагацца цяпер да апошняга — значыць, зрабіць паслугу царскім генералам. Паўстанцы мусяць ратаваць сябе дзеля далейшага служэння справе. Выйсці з акружэння можна толькі невялікімі купкамі. Хто не адчувае ў сабе рашучасці працягваць барацьбу, няхай здаецца ўладам. Тыя, што складуць зброю не пазней, чым паслязаўтра, трапяць пад абвешчаную ўрадам амністыю. У роўным голасе камандзіра не было нават водценю разгубле-

* Слава пераможаным! (лац.).

* Рэгулярнае вайсковае фарміраванне ў тагачаснай Расіі.

Ён Вам—апошні—празвінеў,
І ўратаваны буду я.

Адзіны гук... І я хаджу
Пад сонцам тымі сцежкамі,
Дзе Вы ўсміхаліся дажджу,
Калі ўраджаем цешыў ён.

Адзіны гук... Мне колькі жыць
Ён даў на свеце права—
Не знаю... Толькі даражыць
Мне вечна Вашай славай.

Калі ж трывога ўскалыхне
І ўстануць зноў брыгады—
Адно ў запасе і ў мяне
Ёсць «з» на той выпадак.

Пытанне богу

— Жывём—і дзякуй,
сэнк ю,
мерсі,—
І нечага бога гнявіць:
Было б што паесці,
было б што папіць—
І большага не прасі...

— А можа,
той бог
сёння хоць бы ўявіць,
Што такое
мільён Хірасім?

І раптам бог адказаў: «Шкада,
Што бога няма. І вас
Здзівіць не магу. І адкрыць, як братам,
Што ядзерны ваш выбуховы запас —
Мільён Хірасім.
А гэта якраз
Амаль буду я:
нішто, пустата...»

На дзень ад'езду

Я ў лес на развітанне не пайшоў:
Хор адгавораў ледзьве не ахрып,
Ды й сам надоечы пытаўся ў мурашоў:
«Чаму пад шыгаллем там засядзеўся
грыб?..»

Я не пайшоў.... А ўчора дожджык быў,
Няхай сабе і кволенькі зусім,—
Мабыць, на дзень ад'езду мне грыбы
Па родных баравінах церусіў...

Я не пайшоў. А з раніцы ўваччу:
Чырвона падасінавік гарыць,
Як светафор—спыніцца і адчуць:
«Куды ты едзеш, дурань, без пары...»

Вунь з-пад лісця лісічак ланцужок
Гатовы напярэймы сігануць,
А ў верасовы глянеш беражок—
Таўстушкі там—на зайздрасць сагану.

З імхоў вылазяць на паўгалавы,
Ільсняцца, нібы тыя кумпякі,
Правэнджаныя духам баравым,
Чарнявыя, як смоль, баравікі...

Я ў лес на развітанне не пайшоў—
З надзеяй, што ўзрасце ён у цане:
Няхай сваёй удачы не знайшоў—
Грыбная казка застанецца мне.

●

«Як вершы пішуцца?—пытаюць. —
Агонь з вачэй і дым з вушэй?..»

Я ўсёй маёй не знаю тайны.
А вершы—пішуцца цішэй.

Прыходзіць верш безабаронна.
Адзін. Ні продкаў, ні радні...

Яны пасля—хістаюць троны.
Пасля пакутнай цішыні.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

Ёсць людзі, якія яшчэ пры жыцці становяцца легендай. Народны артыст СССР Генадзь Цітовіч, смела можна сказаць, жывая легенда беларускага савецкага харавога мастацтва. Яго жыццё — гэта яскравы прыклад самаадданага, апантанага служэння свайму народу, нацыянальнай культуры. Не выпадкова, што ўрачысты вечар, прысвечаны 75-годдзю Майстра — ён адбыўся ў Доме літаратара, — сабраў шмат прыхільнікаў яркага, непаўторнага таленту Генадзя Іванавіча.

Юбіляра ад усяго сэрца віншавалі з днём нараджэння, жадалі новых творчых поспехаў прадстаўнікі творчых саюзаў рэспублікі, тэатраў, установаў культуры, паклоннікі яго таленту. Асабліва шмат добрых слоў сказалі настаўніку тыя, каму ён дапамагаў уваходзіць у неабсяжны свет мастацтва.

І, вядома, сярод удзельнікаў гэтага вечара былі артысты Дзяржаўнага народнага хору БССР, калектыву, якому даў жыццё нястомны прапагандыст і збіральнік беларускага фальклору Г. Цітовіч. Прагучалі творы, дарагія і блізкія Генадзю Іванавічу, былі сказаны словы, якія засведчылі, што па-ранейшаму хор бачыць у сваім былым кіраўніку сябра і дарадцу.

На вечары прысутнічалі намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. М. Мазай, загадчык аддзела культуры ЦК КПБ І. І. Антановіч.

На здымку: Генадзя ЦІТОВІЧА віншуе першы сакратар праўлення СП БССР Ніл ГІЛЕВІЧ.

Фота Ул. КРУКА.

насці або паняверкі. Так мог гаварыць чалавек, які даастачы выканаў абавязак перад сваімі людзьмі і можа памерці або жыць далей з чыстым сумленнем.

Пасля роспуску атрада каля лесніччоўкі, на якую напаўзала чорная з жаўтлявым падчарэўем навальнічная хмара, разам з Тапаром застаўся ягоны ад'ютант Здзіслаў Міткевіч і яшчэ двое: вольны слухач земляробчага інстытута Сокалаў з прастрэлянаю рукой і камандзір ужо няіснага першага плутона* студэнт Восіп Антаневіч. Яны апынуліся заадно не таму, што сябравалі. Калі не лічыць прыяцельскіх дачыненняў камандзіра і ад'ютанта, гэтыя чацвёра былі проста таварышамі па зброі. Іх аб'яднала, можа, і не ўсвядомленая яшчэ на ўсю глыбіню думка, што, пакуль яны разам, працягвае жыць атрад. Была і яшчэ адна прычына — палонны афіцэр, ад якога ні на крок не адыходзіўся Антаневіч. Капітана артылерыі Крыніцкага ўзялі ноччу на паштовай станцыі пасля шалёнай перастрэлкі, у якой адзін паўстанец быў забіты напавал, а другому куля трапіла ў жывот, і яго давялося пакінуць у доме станцыйнага наглядчыка. Лёс палоннага, які не атрымаў ані драпіны, дагэтуль заставаўся нявырашаны.

Крануты ржою кіўач невядома кім заведзеных ходзікаў няўтомна адкройваў ад неабдымнасці часу імгненне за імгненнем, збіраў іх у цяглыя хвіліны, а дождж і не думаў сціхаць. Ён паліваў саламяныя стрэхі пустога хлява і адрыны, ля якой прыткнулася кінутая паўстанцамі фурманка, мыў чорнае голле пасаджанага пры хаце дубка, што, не даючы веры першаму цяплу, не спяшаўся выпускаць лісце з пупышак, прыпляскваў да зямлі малады дзьмухавіннік. Неба над лесніччоўкаю было цяжкое і беспрасветнае. У такія вось хвіліны, пад такім небам, чалавека апаноўваюць самыя змрочныя і безнадзейныя думкі. Тым больш, калі побач ходзіць смерць, а па аднаго яна можа прыйсці зусім хутка, бо ён біўся супраць чацвярых астатніх і забіў іх паплечніка, а можа, і двух, таму што паранены ў жывот таксама мог памерці.

Маўчанне стала гнятлівым і фізічна важкім. Каб парушыць нясцерпную вусціш, нехта павінен быў зараз штосьці зрабіць ці проста прамовіць нейкае слова. Відаць, вастрэй ад усіх адчуў гэтую неабходнасць ад'ютант Міткевіч, прысадзісты гарбаносы чалавек з рудымі бакамі і нявыспаным тварам. Першыя за паўгадзіны словы сказаў, хоць і быў маўкліўцам, менавіта ён.

— Мне згадалася крэда майго дзеда па кудзелі. Стары любіў паўтараць, што ў любым становішчы найперш трэба пад'есці.

Тапор з лёгкаю ўсмешкай кіўнуў. І ад'ютант адчыніў дарожны куфэрак. Ён раскінуў на краі пашчэрбленага стала сурвэтку, і на ёй з'явіліся чорныя сухары, кавалак саланіны і апялеценая раменьчыкамі біклажка. Бадай, адно цяпер яны ўспомнілі, што ад раніцы не мелі ў роце ні крыхоткі. Усе скінулі здранцвенне і неяк пажвавелі, толькі палонны па-ранейшаму абыякава сядзеў на адзіным у хаце крэсле, зробленым з нязграбнаю прэтэнзіяй на панскасць. Але, калі Тапор рукам рукі запрасіў яго да стала, палонны таксама нібы ачнуўся і без угавораў падсеў бліжэй.

Камандзір і ад'ютант адпілі з біклажкі седзячы і без слоў. Калі чарга дайшла да Антаневіча, ён ускочыў і, трохі тэатральна ўзняўшы руку з біклажкаю, выгукнуў: «За адраджэнне Айчыны!» Гэта быў высокі, па-дзявочаму танклявы юнак з мяккімі рысамі безбародага твару. Калі б не вішнёвая радзімая пляма амаль на ўсю правую шчаку, ён, бясспрэчна, лічыўся б прыгажуном. Антаневіч піў, закінуўшы русую галаву, на тонкай шыі перакочваўся востры коўцік.

— Вы забыліся, што мы не на банкеце,— заўважыў камандзір, калі юнак адарваўся ад біклажкі.

Чыстая смуглявая шчака Антаневіча ўспыхнула, але ён прамаўчаў і перадаў біклажку параненаму. Той нязграбна ўзяў яе здароваю рукой і адно памачыў вусны. Бацькі параненага, дваццаць гадоў таму, ахрысціўшы сына Апалонам, яўна спудлавалі. Ягоны непрыгожы шырокі твар з рэдкімі, быццам вышчыпанымі вусікамі і цельпукаватае цела настолькі неадпавядалі імю, што рабілі яго амаль камічным. Толькі вочы Сокалава былі надзіва гожыя сваёй глыбокай сінечай, у якой свяціліся дабрыня і спагада.

Тапор цераз стол падаў біклажку палоннаму.

— Няхай жыве хрысціянская міласэрнасць,— з іроніяй прамовіў той.— Чалавека накормяць, напояць, а потым...

Ён не дагаварыў.

Капітану Крыніцкаму было за трыццаць. Ён насіў кароткую стрыжку і меў абсівераны валявы твар з адкрытым паглядам карых вачэй і цвёрдымі вуснамі пад цёмнаю шчотачкай вусоў. Хутчэй за ўсё ён раскаяўся ў сваіх словах, бо хрумстаў сухаром крыху збянтэжана. Антаневіч кідаў на палоннага касыя позіркі, якія не абяцалі нічога добрага. Сокалаў пазіраў на капітана са спачуваннем, а расчытаць пачуцці Тапара і ад'ютанта на іхніх непарушных тварах было немагчыма.

Пасля падмацунку паранены заняў сваё месца на бурносе. Тапор і ад'ютант вярнуліся да вокнаў, а студэнт прываліўся плячыма да сцяны і задрамаў. Сон сцёр з ягонага аблічча змрочнасць, пухлаватыя вусны кранула амаль дзіцячая летуценная ўсмешка.

Грымець зноў стала бліжэй, навальніца вярталася. Знячэўку пярун разадраў роўны шум дажджу недзе зусім побач, і Антаневіч здрыгануўся і расплюшчыў вочы. Нейкае імгненне летуценнасць яшчэ асвятляла твар, але юнак успомніў, дзе ён, і ўсмешка пагасла, як кволае цяпельца пад парывам ветру.

— Ведаеце, што мне прыснілася? — са зласлівай маркотаю спытаў ён пасля нядоўгага маўчання.— Тое, што здарылася роўна год назад.

— Не сказаў бы, што мы ўсё зразумелі,— не адрываючыся ад справы, азваўся камандзір, які чысціў на каленях рэвальвер.

— Я ведаю, грамадзянін* Тапор, вам будзе смешна. Але мне хочацца гаварыць пра гэта. Я буду расказваць і смяяцца разам з вамі,— з нейкім хваравітым імпэтам сказаў юнак.

— Дык вось, год таму, якраз такой парою,—працягваў ён, — мы наладзілі фэст з манёўрамі. Які быў час, панове! Сабраліся ў фальварку за дзве вярсты ад горада. Спачатку спявалі гімны, казалі прамовы. Потым практыкаваліся ў стральбе. Здагадайцеся, якія ў нас былі мішэні?— Антаневіч абвёў таварышаў гордым позіркам,— Расійскія гербы. Мы стралялі ў расійскія гербы. Таму, хто за пяцьдзесят крокаў трапіў арлу з двух стрэлаў у абедзве галавы, пані Юлія падносіла келіх свянцонай вады. Пані Юлія таксама страляла разам з намі...

Пачуўшы гэтае імя, Сокалаў заварушыўся, ямчэй уладкоўваючы параненую руку. Палонны заўважыў яго рух і глянуў на Сокалава з цікавасцю.

...— А потым феерверк...— Антаневіч на момант заплюшчыў вочы.— Але самае вясёлае было пасля. Па дарозе дамоў знайшлі на ўскраіне пляцень сажняў на пятнаццаць, далі залп і ў адзін міг узялі гэтую фартэцу прыступам. Уяўляеце? І тут быццам з-пад зямлі з'яўляецца гэты пісклявы таўстун Іверсон, наш наглядчык. «Вы нем'едленно дольшны разойдись! Иначе вы испортите себе фсю шизны!» Пакуль ён абяцаў нам самыя страшэнныя пакаранні ад імя дырэкцыі, мы яшчэ цярпелі. Аднак, калі стаў грозіцца ад імя гасудара імпэратара, мы не стрывалі. Вы калі-небудзь бачылі, як вядуць у хлеў натурыстага маркача? Конча цягнуў яго за гальштук, а я паганяў дручком... Праз два месяцы прыехала следчая камісія, але сведкаў не знайшлося, і гер наглядчык застаўся з носам. Які быў фэст, панове! Хай бы ён доўжыўся вечнасць...

— Хай бы вечнасцю стаў дзень, калі горад быў нашым,— падаў голас паранены.

— Вы памятаеце, як нас прымалі ў прафесара Жабенкі?— жвава падтрымаў яго Антаневіч.— Як пані Юлія з сястрой танцавалі дзеля нас польку...

— Я мяркую, ваш Іверсон ужо данёс і на іх,— суха зазначыў Тапор.

— Усяго пяць дзён таму! Няўжо толькі пяць дзён?— Антаневіч нібыта не чуў апошніх слоў камандзіра.— Гэты ўздым, і перамога, і думкі, што ўсё яшчэ наперадзе... Пяць дзён. А цяпер?..

— Жыццё не любіць летуценнікаў, грамадзянін Антаневіч. Яно жорсткае да іх.— Камандзір скончыў чысціць рэвальвер і звыклым рухам заткнуў яго за пояс.—Я не супраць таго, каб вы займаліся прыемнымі ўспамінамі, але ўлічыце, што мы не адны.

Позірк студэнта ўпёрся ў палоннага і загарэўся непрытоенай нянавісцю.

— Грамадзянін Тапор, я не разумею, чаму вы дагэтуль не загадалі... У нас ёсць права помсты, і я...

Сустрэўшы ўладны пагляд камандзіра, ён асекся, аднак яго гарачая кроў утаймоўвалася неахвотна.

— І ўсё ж мы не дарэмна ўзяліся за зброю. Не дарэмна!— зноў загаварыў Антаневіч праз хвіліну. Ён імкнуўся пераканаць, відаць, не столькі таварышаў, як сябе самога.— Мы замацавалі крывёю межы будучай Айчыны!

— Паны з жонду былі б задаволеныя вамі,— сказаў камандзір.

— Ні ў Літве, ні ў Польшчы нашы войскі не ўзялі больш ніводнага горада!— з выклікам адказаў студэнт і паранены з ухвалаю кіўнуў яму.

— Магу толькі паўтарыць свае папярэднія словы, — стамлёна прамовіў Тапор.— Зрэшты, я не вінавачу вас. У вашых гадах чалавек адгукаецца на прыгожыя заклікі хутчэй, чым на развагі ўласнага розуму.

— Што вы хочаце гэтым сказаць? — Антаневіч падняўся і пачаў нервова хадзіць ад стала да дзвярэй і назад.— Мяне прывялі да ўдзелу ў інсурэкцыі* перакананні, а не прыгожыя заклікі. І не якія-небудзь іншыя прычыны...

— Якія іншыя?— пацікавіўся камандзір. Паранены чамусьці насцярожыўся.

— Якія? Вы чулі, як трапіў у ат-

(Заканчэнне на стар. 10—12).

* Узвода.

* Форма звароту ў паўстанцаў 1863—1864 гг.

* у паўстанні.

Кампазітары — вёсцы

З ПЕРШЫХ ГАДОЎ Савецкай улады кампазітары падтрымлівалі аматараў народнага музіцыравання, творча дапамагалі калектывам вясковай мастацкай самадзейнасці. Нямала тут можна прыгадаць імёнаў. Шмат увагі Дукорскаму сельскаму хору аддаваў І. Любан, М. Чуркін займаўся з хорамі Мсціслаўшчыны, Н. Сакалоўскі — Палесся, В. Яфімаў — Міншчыны, С. Палонскі — Лагойшчыны, У. Тэраўскі — Случчыны, М. Мацісон — Полаччыны, М. Анцаў — Рудзеншчыны, Я. Цікоцкі — Бабруйшчыны.

Актывісты кампазітарскай арганізацыі Беларусі заўсёды ахвотна працавалі з вясковымі самадзейнымі хорамі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны, напрыклад, гэтую высакародную дзейнасць прадаўжалі Д. Ліукас, які многа часу аддаваў Марачанскаму народнаму хору, І. Кузняцоў, які дапамагаў Капыльскаму ансамблю дудароў і напісаў для яго нямала твораў...

Са шчырай самааддачай займаліся з сельскімі кампазітарамі-аматарамі сталыя майстры музыкі М. Аладаў, Р. Пукст, Я. Цікоцкі, У. Алоўнікаў, П. Падкавыраў, іх маладзейшыя калегі. Азершчынскаму, Прысынкаўскаму і многім іншым народным хорам Беларусі актыўна дапамагаў Г. Цітовіч. Як вядома, у 1939 годзе ён узначаліў хор вёскі Вялікае Падлессе, ездзіў з ім на Дэкаду беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскву, не губляе творчых сувязей з калектывам і дасюль, напісаў для яго некалькі песень. Сярод іх — і песня пра Вялікае Падлессе «Між палёў шырокіх», надзвычай папулярная ў тых мясцінах. І не дзіва, што неяк на агульным сходзе працаўнікоў калгаса імя Леніна аднагалосна была прынята пастанова аб прысваенні ганаровага звання «заслужаны калгаснік» Генадзю Іванавічу Цітовічу «за шматгадовую і актыўную работу ў калгаснай вытворчасці».

СУВЯЗІ з працавітымі людзьмі сяла, зацікаўленае знаёмства з жыццём вяскоўцаў стымулявалі і стымулююць творчасць нашых кампазітараў. Сярод шматлікіх іхніх твораў, прысвечаных калгаснай вёсцы, ёсць і такія буйныя, прызначаныя для выканання прафесійнымі музычнымі калектывамі, як дзве «Калгасныя сюіты» П. Падкавырава, сюіта «На Палессі» У. Алоўнікава, кантаты «Зямля мая» Ю. Семяныкі, «Палі стэпавыя» І. Кузняцова, «Маладзёжная сюіта» Г. Вагнера для сімфанічнага аркестра і хору, Уверцюра для аркестра беларускіх народных інструментаў «Слава ўраджаю» В. Войціка і інш.

За апошнія дзесяцігоддзі сувязі Саюза кампазітараў з сялом пашырыліся. І не ў малой ступені гэта абумоўлена тым, што колькасць членаў нашай творчай арганізацыі цяпер павялічылася амаль утрая — прыйшло маладое папаўненне. І «неафіты» адразу ж актыўна ўключыліся ў работу камісіі СК БССР па шэфстве над сялом. І цяпер побач з імёнамі кампазітараў старэйшага пакалення, якія часта наведваюць вясковыя дамы культуры і школы, удзельнічаюць у шэфскіх канцэртах, можна назваць У. Будніка, В. Войціка, У. Дамарацкага, У. Дарохіна, Э. Зарыцкага, В. Іванова, У. Кандрусевіча, М. Літвіна, В. Помазава, Ф. Пыталева, А. Соніна, А. Чыркуна, Л. Шлег.

А слухачы ў наш час сталі больш патрабавальнымі: у кожным раёне ёсць дамы або палацы культуры, пры якіх працуюць самадзейныя інструментальныя, харавыя, драматычныя калектывы, фальклорныя і танцавальныя ансамблі. Развіваецца мастацкая самадзейнасць у школах. Павялічваецца і колькасць кампазітараў-аматараў. У сельскай мясцовасці адкрыты дзесяткі музычных школ, іх філіялы...

Некалькі гадоў назад старшыня камісіі Саюза кампазітараў БССР па шэфстве над сялом В. Сізко выступіла з ініцыятывай адкрыць у адной з вясковых школ музычны лекторый. Давялося ёй праводзіць лекцыю-канцэрт у Навадворскай сярэдняй школе саўгаса «Рассвет». Школа з політэхнічным ухілам, рыхтуе шафёраў і механізатараў, і лектара вельмі турбавала: як вучні ўспрымуць яе выступленне і канцэрт, ці «дойдзе» ён да іх? Але ўглядалася ў зацікаўленыя твары школьнікаў і ўпэўнівалася, што яе сумненні — дарэмныя.

Калі закончыўся канцэрт, юныя слухачы доўга і зацікаўлена распытвалі В. Сізко пра музыку, песні, пра кампазітараў і паэтаў-песеннікаў, пра оперу, сімфонію. Так лектар увачавідкі пераканалася ў сапраўднай зацікаўленасці юных слухачоў музыкай. І калі ў Саюзе кампазітараў паўстала пытанне, у якой школе адкрыць музычны лекторый, В. Сізко прапанавала менавіта Навадворскую.

АДКРЫЦЦЕ ЛЕКТОРЫЯ ў вёсцы Новы Двор было прымеркавана да Міжнароднага дня музыкі. Для першай сустрэчы з аўдыторыяй лектар выбрала тэму «Лірычная савецкая песня». Гутарку пра найбольш даходлівы, папулярны жанр, выступленне выканаўцаў добра ўспрынялі слухачы. І наступную лекцыю-канцэрт В. Сізко прысвяціла больш складанай тэме: «Музыка, народжаная Кастрычнікам». Праграма складалася з даволі буйных і сур'ёзных твораў беларускай музыкі: Квінтэта М. Аладава для дзвюх скрыпак, альта, віяланчэлі і фартэпіяна, фрагментаў з оперы «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага, з інструментальнай музыкі М. Чуркіна і інш.

Неўзабаве быў створаны мастацкі савет на чале з дырэктарам школы П. Паздняком; членамі савета сталі завуч С. Тамковіч, арганізатар пазашкольнай работы Г. Запольская, камсорг саўгаса «Рассвет» У. Радкевіч, музыказнавец В. Сізко, кампазітары У. Дарохін і В. Войцік. На пасяджэннях савета абмяркоўваюцца ўсе мерапрыемствы,

ПЯЦЬ МУЖЧЫН У ЛЕСНІЧОЎЦЫ

(Працяг. Пачатак на стар. 8—9).

рад Арліцкі? Цяпер я магу адкрыць яго таямніцу. Аднойчы на біваку мы разгаварыліся, і ён прызнаўся, што нявеста запатрабавала ад яго доказаў смеласці.

— Bravo! Bravo! — шчыра засмяяўся палонны. — Каханне як аснова палітычных поглядаў або як пазбавіцца ад жаніха. Панове, вы дазволіце мне далучыцца да размовы? Можаце лічыць гэта маім апошнім жаданнем...

Ён гаварыў вясёлым бесклапотным тонам, які дазваляў прыняць ягоныя словы за жарт.

— Ніхто не мае права адмовіць чалавеку ў апошнім жаданні, — прымаючы тон палоннага, адказаў Тапор.

— Між іншым, — заўважыў ад'ютант, звяртаючыся да Антаневіча, — Арліцкі браў цэйхгауз так, нібыта ўсё жыццё толькі тым і займаўся, што браў цэйхгаузы.

Вусны студэнта скрывіла пагардлівая ўсмешка:

— Мне заўсёды здавалася, што ён у любы момант можа перабегчы ад нас да Беклямішава.

Словы юнака прыглушыў удар грому, але палонны пачуў іх.

— Пан Антаневіч, вы згадалі тут імя нашага губернатара. Вам вядома, дзе яго дастойнасць зрабіў сабе кар'еру?

— У паліцыі, — пазіраючы не на Крыніцкага, а некуды ўбок, адазваўся юнак.

— Але ці вядома вам, што ў маладыя гады ён маліўся на фур'е і праходзіў па справе Петрашэўскага?.. Вось што робіць з гарачымі галовамі час...

Антаневіч спыніўся насупроць палоннага і паклаў руку на рэвальвер.

— Гэта падобна на здзек... — з пагрозаю прамовіў ён.

— Грамадзянін Антаневіч!

— Грамадзянін Тапор? — рэзка павярнуўся на голас камандзіра студэнт.

— Што яшчэ вы маеце нам паведаміць? — спакойна запытаў Тапор.

— Што... што, нягледзячы ні на што, мы пераможам!

У гэтым хлапчукоўскім выбрыку было нешта настолькі адчайнае і чуллівае, што халодныя вочы камандзіра пацяплелі.

— Магчыма, — з нечаканай мяккасцю сказаў ён. — Але не тут. Тут у нас нічога не атрымаецца. C'est une affaire flambée*. Мужыкі вераць у цара і не вераць нам, а без мужыкоў мы — нішто. І ў дадатак паны з Віленскага жонду скасавалі ўсе акты чырвоных. Калі хто-небудзь з гэтых «рэвалюцыянераў» трапіць мне да рук, даю вам слова павесіць яго на першым прыдатным суку.

— У Касы было дваццаць хлопцаў, — сказаў Антаневіч.

— А дзе яны падзеліся праз два дні? — суха спытаў Тапор.

— Успомніце, — не здаваўся юнак, — як вы чыталі маніфест у царкве і хлопы цалавалі вам рукі...

— А ўвечары таго ж дня папярэдзілі казацкія раз'езды, — сумна ўсміхнуўся камандзір. — Мужыкі хочуць, каб зямля належала ім, а такога паўстання нашы паны баяцца, як чорт ладану. Тут увесь іхні патрыятызм імгненна сходзіць на бзік. Учора яны сплачвалі доўг перад Радзімаю тым, што бадзяліся па маёнтках у канфедэратках і падымалі тосты... — Зірнуўшы на худую спіну студэнта, які па-ранейшаму мерыў леснічоўку, ён не скончыў фразу. — А сёння садзяцца і пішуць такія вось лісты.

Тапор выцягнуў з кішэні світкі разарваны канверт.

— Знайшоў у мяху з перахопленай поштай, — растлумачыў ён і з грэбліваю грымасаю пачаў чытаць:

— «Приставу третьего стана Пуцилло К. Е. Вчерашнего дня, возвратившись домой из губернского города Могилева, нашел я у себя в фольварке людей, которые разграбили мой дом, собрав крестьян, объявили им какую-то противозаконную свободу. А за тем покорнейше прошу ваше благородие...» І гэтак далей. Подпіс: «Помещик Август Минкевич».

Антаневіч плюнуў у качарэжнік.

— Але ёсць іншыя! — ударыў ён даланёю па стале.

— З намі лепшыя людзі імперыі! Паранены сеў і спусціў з палка ногі. На ягоным непрыгожым твары выступіў румянец хвалявання.

Палонны павярнуўся да яго і насмешліва сказаў:

— Мяркуючы па вашым вымаўленні, прынамсі, аднаго з гэтых людзей мы маем шчасце бачыць.

— З паўстаннем салідарныя многія мае адназемцы. Вось... — Леваю рукой Сокалаў няўклюдна разгарнуў на калене складзены ў некалькі столак пакамечаны аркуш. — Гэтая адозва хадзіла ў Аршанскім гарнізоне.

Палонны як быццам нечаму ўзрадаваўся. Ён падышоў да параненага і зазірнуў у паперыну.

— «Солдаты и офицеры, не обагрйте рук своих...» Так-так...

Пад цяжкім позіркам Антаневіча ён вярнуўся на сваё крэсла, але на твары капітана Крыніцкага засталося незразумелае ажыўленне.

— Маю паведаміць, што мне гэты... дакумент вядомы. Калі вы дазволіце...

Ён скасіўся на Тапара, і той у згодзе нахіліў голаў.

— Дык вось. Месяцы паўтара таму да нашага палкоўніка Мухіна заявіліся феерверкер і двое радавых з дакладна такой пракламацыяй, якую вы, пан студэнт... прабачце, пан інсургент, трымаеце ў руках і якая выклікае ў вас такі імпэт. Толькі не падумайце, што салдаты прыйшлі данесці. Гэта так уласціва людзям, панове. — Палонны ўсміхнуўся нейкаю цьмянай усмешкай. — Яны сказалі, што пракламацыю даў ім на вуліцы разам з залатоўкаю* маладзён у белым паўкажушку. Натуральна, залатоўка паспела ўжо бясследна знікнуць.

Пан палкоўнік даставіў адозву разам з прыкметамі маладзёна гараднічаму, між іншым, свайму вялікаму прыяцелю, праз якога мы потым і даведаліся пра далейшыя падзеі. За вечар і ноч паліцыя, як і трэба было чакаць, нікога не знайшла, а раніцою гараднічы ўспомніў, што сам бачыў на вуліцы гэтага маладога чалавека ў паўкажушку. Гараднічы нават ведаў яго. Гэта быў... тут, панове, я раблю нотабена... гэта быў нейкі пісар сёмай акругі шляхоў зносін Мечыслаў Савініч, што прыехаў на гасціны з Магілёва. А ў Оршы таксама пісарам служыць у казначэйстве ягоны родны брат. Гараднічы выклікае гэтага аршанскага пісара, і той пацвярджае, што ў брата сапраўды ёсць белы паўкажушок. А ўжо праз чвэртку гадзіны (заўважце, панове, колькі часу спатрэбілася чалавеку, каб наважыцца пагубіць другога чалавека), праз чвэртку гадзіны ва ўправу прыбег і сам гэты Мечыслаў Савініч. Прыбег і стаў дапытвацца ў гараднічага, ці не падазрае яго той у зламыснасці. І, між іншым, заявіў, што, калі атрымае пасведчанне, што невінаваты, адкрые сапраўднага злачынцу і ўкажа, дзе яго можна злавіць.

Чацвёра мужчын слухалі надзіва ўважліва.

— Мы з вамі цудоўна разумеем, што ніякага пасведчання аб невінаватасці чалавек атрымаць не можа, — працягваў палонны. — Хаця б з тае прычыны, што такіх пасведчанняў, так бы мовіць, проста не існуе ў прыродзе. Гэта самае і растлумачыў яму гараднічы. Але Савініч заяўляе, што пазнаёміўся з падмётчыкам адозваў у цукроўні, з самых першых слоў западозрыў яго і вырашыў падтрымаць знаёмства выключна з мэтаю данесці ў паліцыю. Ён настолькі ўвайшоў у ролю, што пачаў ужо не прасіць, а патрабаваць паперу аб тым, што першым зрабіў данос. Але гараднічы не дурань, і цану збіць умее. Ён заўважыў, што данесці можна і не займаючыся на вуліцы ўручэннем пракламацый салдатам. На гэтым таргі скончыліся, і Савініч абвясціў, што падмётчык адозваў пешшу накіраваўся ў Віцебск. Савініч выказаў гатоўнасць асабіста ўдзельнічаць у пагоні і выехаў з двума паліцэйскімі на паштовых конях. На шостай ці сёмай вярсце яны дагналі чалавека, у якога быў пісталет і пачак пракламацый. Цяпер яго чакае катарга...

— Мярзотнік... — працадзіў Антаневіч. — Страляць такіх. Палонны падняў брыво.

* Гіблая справа (фр.).

* 15 капеек.

звязаныя з дзейнасцю лектория, праграмы яго канцэртаў, склад выканаўцаў.

Вялікім канцэртам, напрыклад, было адзначана 300-годдзе з дня нараджэння І.-С. Баха; наладжваліся наведванні слухачамі лектория спектакляў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Пасля праслухоўвання оперы Ю. Семяцякі «Новая зямля» ў госці да навадворцаў запрасілі аўтара музыкі, рэжысёра-пастаноўшчыка С. Штэйна і выканаўцаў галоўных партый оперы.

Уразіла навадворцаў і сустрэча з Камерна-інструментальным ансамблем і салістамі Беларускага тэлебачання і радыё: слухачам лектория ўпершыню давялося непасрэдна пагутарыць з людзьмі, якіх дасюль бачылі і чулі ў эфіры.

Кіраўнік лектория Вера Аляксандраўна Сізко часта наладжвае ў «сваёй» школе аўтарскія канцэрты беларускіх кампазітараў. Апошнім часам школьнікі знаёміліся з творчасцю Ю. Семянякі, І. Лучанка, Г. Вагнера, В. Войцікa, У. Будніка, Э. Зарыцкага, Э. Ханка. У дні Усесаюзнага пленума па ваенна-патрыятычнай музыцы, што праходзіў у Мінску, яна запрасіла ў Новы Двор маскоўскага кампазітара У. Казеніна і ленінградскага — У. Сарокіна. Яны расказалі пра сваю творчасць, а ў выкананні артыстаў «Масканцэрта» прагучалі песні для дзяцей і ўрыўкі з кантаты У. Сарокіна «Кветкі Ільіча». Змястоўнымі атрымаліся сустрэчы з беларускім кампазітарам С. Картэсам; з музыказнаўцамі - фальклярыстамі З. Мажэйка і Л. Мухарынскай, якія расказалі пра беларускую народную і пра партызанскую песню. Карыснымі былі заняткі лектория, на якіх кампазітар В. Войцік і дацэнт кафедры кансерваторыі С. Сізко расказалі пра духавыя інструменты сімфанічнага аркестра, дапамаглі ім у гэтым артысты Акадэмічнага сімфанічнага аркестра БССР і студэнты кансерваторыі.

ФОРМЫ ЗАНЯТКАЎ лектория разнастайныя: лекцыя-канцэрт, творчая сустрэча, гутарка, наведанне тэатральнага спектакля альбо канцэрта. Заняткі набылі папулярнасць не толькі ў школьнікаў, але і ў іх бацькоў. Так што напярэдадні 40-годдзя вызвалення Беларусі ад фашысцкіх акупантаў быў адкрыты філіял лектория ў клубе саўгаса «Рассвет». Між іншым, многія школьнікі, якія наведвалі канцэрты лектория, паступілі ў мясцовую музычную школу.

Так, здавалася б, непрыкметная работа беларускіх музыкантаў з жыхарамі вёскі дае каштоўны плён. Вось што гаварыў мне П. Паздняк — дырэктар Навадворскай сярэдняй школы:

— Музычны лекторый мае велізарнае значэнне ў справе эстэтычнага выхавання жыхароў сяла, прыносіць і дзецям і іх бацькам вялікую карысць, уздзейнічае на іх душы і сэрцы, павышае культурны ўзровень насельніцтва. Я раней не ведаў ніводнага беларускага кампазітара, а цяпер пазнаёміўся з многімі з іх і вельмі ўдзячны за іх музыку, песні, якімі яны шчодра дзеляцца з намі. І цяпер мае аднавяскоўцы часта гавораць, што чулі па радыё ці па тэлебачанні песні кампазітара, з якім сустракаліся ў нашай вёсцы. А лекторыю нашаму многія проста зайздросцяць. Наша былая настаўніца Н. Залічка, якая стала дырэктарам школы ў Каралёвым Стане, успамінае лекторый і просіць дапамагчы ў арганізацыі такога ж у іхняй вёсцы.

Выпускнік школы, цяпер саўгасны шафёр М. Пуга расказваў:

— Пасля заканчэння школы мне давялося праходзіць вайсковую службу у Афганістане. І ў цяжкія хвіліны мне заўсёды ўспаміналіся галасы і твары артыстаў, што выступалі на канцэртах нашага лектория і мне адразу рабілася лягчэй — я нібы пабываў дома.

А гэта — словы Т. Цярэнцьевай, сакратара камітэта камсамола саўгаса:

— Я заўсёды любіла музыку, але ведала толькі простыя народныя песні. У лекторыі я не толькі пачула іх у цудоўных апрацоўках, але і палюбіла песні маладога беларускага кампазітара Валерыя Іванова і творы у выкананні Камерна-інструментальнага ансамбля Беларускага тэлебачання і радыё. І цяпер, калі знаёмыя творы гучаць па радыё, я адкладваю іншыя справы і з захапленнем слухаю. Гэта — дзякуючы нашаму лекторыю, які я дасюль наведваю, хаця даўно ўжо скончыла школу.

Збылася і мара дырэктара школы ў вёсцы Каралёў Стан Н. Залічка: у верасні, як паведамлялася, тут адбыўся першы канцэрт беларускай музыкі. Неўзабаве з'явіцца гэткі ж, як і ў вёсцы Новы Двор, лекторый.

Выконваецца праграма «Кампазітары — вёсцы», прынятая нашым творчым саюзам у гонар XXVII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Трэба спадзявацца, што і пасля з'езда дзейнасць па прапагандзе лепшых здабыткаў нашай нацыянальнай музыкі сярод працаўнікоў сельскай гаспадаркі год ад году будзе пашырацца і прыносіць усё больш плён у справе павышэння культурнага ўзроўню насельніцтва.

Д. ЖУРАЎЛЕЎ,
музыказнавец, заслужаны дзеяч культуры БССР.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

Ігар Калоўскі расказвае пра работу над фільмам.

Лаўрэат усесаюзных і міжнародных кінафестываляў Ігар Калоўскі завяршыў трыпціх, прысвечаны творчасці вядомых беларускіх паэтаў, у які ўвайшлі фільмы «Янка Купала. Панлон мой народу за песні» (аўтар сцэнарыя Г. Колас), «Максім Багдановіч. Я не самотны...» (аўтар сцэнарыя Р. Тармола) і «Пятрусь Броўка. Голас сэрца» (аўтары сцэнарыя В. Кудраўцава і І. Калоўскі). У мінулую пятніцу ў Доме літаратара адбыўся прагляд стужак, выкананых ў жанры дакументальна-мастацкага кіно.

З творчасцю кінарэжысёра І. Калоўскага пазнаёміў прысутных лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Р. Барадулін, які адзначыў плённасць яго працы ў дакументальным кіно ў адлюстраванні жыцця і творчасці майстроў беларускага мастацкага слова. І. Калоўскі расказаў аб сваёй рабоце, падзяліўся творчымі планамі. Цяпер разам з народным пісьменнікам Беларусі Я. Брылём ён працуе над фільмам пра М. Гарэцкага, прэм'ера якога павінна адбыцца ў лютым наступнага года, у дзень нараджэння класіка нашай літаратуры.

М. ГЕЛЬСКІ.

Фота Ул. КРУКА.

— Каго вы маеце на ўвазе?

— Вашага Савініча!

— Наконт мярзотніка цалкам з вамі згодны. Але мой ён у такой самай меры, як і ваш, пан інсургент.

Зноў гакнуў і рассыпаўся сухім трэскам пярун.

— Дзеля чаго вы расказалі нам гэтую гісторыю? — калі аціхлі грымоты, пацікавіўся камандзір.

— Каб спытаць, як вы збіраліся перамагчы з такімі патрыётамі, як Савініч?

— І толькі? — Тапор кінуў на палоннага маланкавы позірк, іхнія погляды на імгненне сустрэліся і разляцеліся, быццам більярдавыя шары пасля ўдару спрактыкаванага гульца.

Палонны сцвярджальна кіўнуў стрыжанай галавой. У ражках яго цвёрдых сціснутых вуснаў нібыта затаілася ўсмешка, але ў паўзмроку леснічоўкі гэта магло проста здавацца.

— Колькі б нягоднікаў ні было сярод якога-небудзь народа, я веру, што сумленных людзей у яго ўсё адно больш, — сказаў паранены. — Я... мы ўсе... хацелі б лічыць за сумленнага чалавека і вас.

Антаневіч, пратэстуючы, махнуў рукой.

— Паберажыце сілы, пан Сокалаў, — з'едліва прамовіў палонны. — Паверце, у вас нічога не атрымаецца. — Ён кпліва ўсміхнуўся. — Шчыра кажучы, я менш здзівіўся б, убачыўшы паміж інсургентаў сябе, а не вас. Вы, рускі чалавек, дваранін... Што прывяло вас сюды? Таксама капрыз нейкай легкадумніцы?

— Калі паўстанне пераможа, гэта будзе спрыяць вызваленню і маёй Радзімы, — ломкім голасам сказаў паранены.

— Вы пачынаеце займацца сафістыкай. Ваш народ і ваша Радзіма свабодныя.

— Народ, які пануе над іншымі, не можа быць свабодным. Ён разбэшчваецца і жыве ў духоўным рабстве.

Вузкія вочы Тапара як быццам расплюшчыліся шырэй і глядзелі на Сокалава з усцешлівым здзіўленнем.

— Вы ведаеце, што вас будуць судзіць значна суровей, чым шмат каго з вашых таварышаў? — пасля цяглай пярэрвы спытаў палонны.

— Mon siège est fait*. — Сокалаў у абладзе хвалявання тузануў параненай рукой і зморшчыўся ад болю. — Я не ведаю, які лёс нас чакае, але мяне не пакідае адчуванне, што гэтыя некалькі дзён — галоўныя дні майго жыцця. Чалавек павінен нечым апраўдаць свой прыход на зямлю...

З-за спіны палоннага Антаневіч рабіў аднакашніку знакі, якія выказвалі захапленне.

— Вы яшчэ вельмі малады... — У голасе палоннага ўжо не было з'едлівасці, а чулася штосьці іншае: ці то шкадаванне, ці то неўразумелы смутак.

— Не ўсё можна вытлумачыць узростам, пан капітан, — адказаў за параненага Тапор.

Сокалаў працягваў моршчыцца і ніяк не мог прымасціцца лацвей. Міткевіч адарваўся ад акна, кіўком загадаў студэнту заняць ягонае месца і, памацаўшы развярэджаную руку параненага, пачаў рабіць перавязку. З хвіліну ў леснічоўцы быў чуваць адно голас залевы.

— Ніхто ў такі дождж сюды не сунецца, — Антаневіч павярнуўся да акна спіной і стаў сачыць за ўмелымі рухамі ад'ютанта.

— У каго засталася корпія? — спытаў Міткевіч, з асцярогаю адкручваючы рудую ад закарэлай крыві рэшту бінта.

Антаневіч падхапіўся і дастаў з паходнае кайстры невялікі пакунак. Словы, якія ён сказаў пры гэтым, былі неабавязковыя, але не сказаць іх ён, відаць, не мог.

— Гэтую корпію шчыпала пані Юлія...

Засяроджанасць на твары параненага раптам змянілася разгубленасцю, аднак ён хутка авалодаў сабой. Міткевіч паклаў на рану свежай корпіі і стаў бінтаваць. Скончыўшы, ён разарваў край бінта зубамі і завязаў акуратны вузельчык.

— Баліць? — запытаўся ён і, не чакаючы адказу, прынёс са стала біклажку.

У няпаленай хаце было халаднавата, і гэтым разам паранены зрабіў колькі глыткоў. Ён адразу закашляўся, і Міткевіч асцярожліва пастукаў далоняй па ягоных рамёнах. Ад'ютант перадаў біклажку камандзіру. Той адмоўна пакруціў галавой. У вачах студэнта зусім як у хлапчука, што збіраецца выкінуць коніка, заскакалі чорцікі, але не вясёлыя, а змрочныя і зацятыя. Атрымаўшы біклажку, ён баўтануў яе і з выклікам абвясціў:

— За нашу вялікую Айчыну ў межах семдзесят другога года!

— Здаецца, я ўжо тлумачыў вам, што мы не на банкеце. — У спакойным голасе Тапара прарэзаліся ноткі раздражнення. — У мяне склалася ўражанне, што мы з вамі ваюем за розныя мэты. Я супраць выключных правоў дваранства. Я за тое, каб мужыкі атрымалі зямлю і сапраўдную волю. А без гэтага на адраджэнне вялікай Айчыны яны, прабачце, хацелі...

— Як вы... — задыхнуўся Антаневіч, — як вы можаце?

— Магу. Хаця б таму, што дзеля гэтага адраджэння зрабіў больш, чым вы, грамадзянін былы камандзір першага плутона. Дарэчы, я спадзяюся, вы не будзеце ўслед за некаторымі пераконваць мяне, што сяляне тых вёсак, праз якія мы праходзілі, належаць да польскага племені?

— Значыць, вы з паноў сепаратыстаў?! З тых, што знайшлі сабе гэтую Беларусь і ўхапіліся за яе, як тапелец за трэску. Я чуў, нехта з іх нават выдае на сялянскай гаворцы газету.

— А чаму гэта вас так устурбавала?

— Таму што цяпер, як ніколі, трэба аб'яднацца пад адным сцягам. Сярод нашых былі такія, што хадзілі вучыць па-мужыцку ў патайнай школцы.* Я заўсёды казаў, што гэта памылка. Будучыня для гэтага народа існуе толькі ў зліцці з намі. — Студэнт рашуча размахваў біклажкаю.

— Чаму? — У голасе Тапара ўжо не чулася раздражнення. Ён быў пасапраўднаму захоплены спрэчкай.

— Хаця б таму, што... Скажыце, дзе іх паэты? Дзе гісторыкі? Палітыкі?.. У іх нікога няма.

Вузкія карыя вочы Тапара загарэліся вясёлай злосцю.

— Грамадзянін Антаневіч, вы выпадкова не чулі пра спосаб, якім можна даказаць, што органы слыху ў павукоў знаходзяцца на нагах?

—?

— Павука садзяць на стол і загадваюць бегчы. Ён бяжыць. Тады яму адрываюць ногі і зноў кажуць: «Бяжы!» Ён не можа. Адсюль робіцца выснова, што вушы ў павука на нагах.

— Я не зусім разумею... — насцярожана азваўся юнак.

— Той самы прынцып доказу, грамадзянін Антаневіч. Спачатку мове цэлага народа пакідаюць правы толькі ў сялянскай хаце, а потым разводзяць рукамі: маўляў, гэты народ няздатны стварыць літаратуру. Спярша адбіраюць у яго гісторыю, прымушаюць забыць мінулае, якім мог бы ганарыцца любы еўрапейскі народ, а потым пытаюцца: дзе яго гісторыкі?...

— Bravo! — падаў голас палонны. — Вельмі дасціпная тэорыя. Баюся, вашаму юнаму сябру няма чаго запярэчыць.

— Вас можна павіншаваць, грамадзянін Тапор, — з сарказмам сказаў Антаневіч. — У вас з'явіўся паслядоўнік.

Тапор, пакінуўшы словы юнака без адказу, загаварыў да палоннага:

— Пане Крыніцкі, я разумею, чаму вы слухалі нас так пільна.

— Калі вы маеце на ўвазе маё паходжанне, вы не памыліліся. Я з карэннай полацкай шляхты. Аднак, пан Тапор, я не хачу, каб у вас заставаліся нейкія ілюзіі. Гонар для мяне даражэйшы, чым жыццё. І потым, калі б я нават не быў звязаны прысягаю і спачуваў вашым поглядам, не ў маіх правілах увязвацца ў безнадзейныя справы.

— Якія справы вы называеце безнадзейнымі? — рэзка спытаў Тапор.

— Тыя, што не пакідаюць па сабе нічога, апрача крыві і сірот, — не менш рэзка адказаў палонны. — Можа, для вас і вашых сяброў апошняе і неістотнае, а ў мяне двое дзяцей, за якіх я нясу адказнасць перад богам і самім сабой.

— У яго іх чацвёра, — кіўнуў Тапор на ад'ютанта.

Палонны сумеўся. Ён быў падобны зараз на чалавека, які перажывае сваю віну. Магло падацца, што капітан ведаў, колькі дзяцей у Міткевіча. Праз хвіліну ён узяў сябе ў рукі, і ўсё ж голас палоннага гучаў ужо не так упэўнена.

— Калі я не памылюся, пан Тапор, вы самі надоечы прызналі, што вы прайгралі сваю гульню.

— Я буду з вамі спрачацца, пан капітан!

— Мне здаецца, апошняе слова ў гэтай спрэчцы ўсё адно застанецца за вамі.

Злавесны сэнс сказанага змусіў параненага зноў сесці. Ён правёў вачыма па хаце, шукаючы нейкай падтрымкі, і спыніў позірк на ходзіках, гіра якіх апусцілася амаль да самай падлогі. У вачах Сокалава мільганула роспач. Антаневіч, наадварот, неяк паарлеў. Толькі ад'ютант нічым

(Заканчэнне на стар. 12).

* Я зрабіў свой выбар (фр.)

* У Горках напярэдадні паўстання існавала нелегальная беларуская школа, дзе выкладалі студэнты земляробчага інстытута.

Глеб ПАГІРАЎ

Шрамы

(З цыкла вершаў «Зварот да сына»)

Што ёсць, дык ёсць—няма чаго хаваць:
Ласкавасці вучыўся ты не ў мамы.
А дзе ж ты ўзяў такое—цалаваць
Мае, вайной пакінутыя, шрамы?

Няма ўжо болю вострага таго
І хіба ў лазні ўспомніш:
«Як з рубцамі?»
Ты ж ведаеш усе да аднаго—
Паціху дакранаешся губамі.

Мой родны, дзякуй! Ці ж не бачу я?
Тут не гульні і не свавольства ўлада,
Тут і пяшчота, і любоў твая,
І светлая дзіцячая спагада.

Брыво і шыю ты цалуеш зноў—
Там, дзе дурніца-куля знак зрабіла.
Паслухай, сын, ды гэта ж наша кроў
Прачнулася ў табе, загаварыла.

А ты прыціх і пацяжэлым стаў,
Прыпаў да рук маіх недасканалых.
Мяне б вось гэтак бацька шкадаваў,
Мяне б вось гэтак маці шкадавала.

Але не вельмі ты шкадуй мяне
І не цалуй параненыя ногі.
Цяжэй бывае людзям удвайне,
Тым, хто застаўся хворы, адзінокі.

А мне з табой лягчэй—я не адзін,
Мы развітаемся яшчэ не скора:
Жыць буду я, пакуль са мною сын,
Мая надзея і мая апора!

Адна з кніг ленінградскага паэта Глеба Пагірава называецца «Тварам да агню». Усю вайну, аж да апошняга ранення пад новы 1945 год, пехацінец Глеб Пагіраў бясстрашна стаяў тварам да агню.

У 1953 годзе Аляксандр Твардоўскі прачытаў у часопісе «Звезда» вершы паэта-салдата і напісаў у рэдакцыю: «Мне вельмі па душы гэты голас, сур'ёзнае і выразнае слова,—паэзія, а не гульня ў яе».

Усімі сваімі творамі—лаканічнымі, мужнымі, дакладнымі—паэт пацвердзіў гэтыя словы Твардоўскага.

Характэрнымі рысамі Глеба Пагірава, з якім мне давялося пазнаёміцца, з'яўляюцца незвычайная сціпласць, строгасць да сябе і сяброў па пяру. І чалавечая дабрата: не сентыментальная, а па-салдацку братняя. І, пэўна, толькі раз ён не пасаромеўся сваіх скупых слёз. Гэта было ў хвіліны, калі паэт стаяў перад мурамі Брэста...

Невыпадковай з'яўляецца прыхільнасць Глеба Пагірава да беларускай паэзіі. З любоўю перакладае ён вершы У. Дубоўкі, А. Пысіна, М. Сурначова, М. Лужаніна, К. Кірэенкі, С. Грахоўскага, Н. Гілевіча, Ю. Свірні, К. Камейшы...

Прапаную ў сваім перакладзе некалькі вершаў нашага ленінградскага сябра.

Эдзі АГНЯЦВЕТ.

Елгава. Латвія

Я прыехаў сюды не турыстам, не ў госці:
Крочу я па зямлі, дзе ляжаць мае косці.

...Наступаем праз лас. Страшны бой—
усляпую.
Зноў я ў правую ранены. Але ўсё ж
атакую.
Бот увесь у крыві. Ды ні страху,
ні болю.

...Самалёт. І шпіталь мой у Елгаве,
ў школе.
І раскрышаны косці. Пракляты асколак!
І няўдалы хірург, да вайны—
стаматолаг.
А такому ўрачу, што нага, што палена,
Мне нагу адхапіў, аж вышэй за калена.
Не расстаўся я з ёю, скрываўленай,
голай,
Пахавалі яе ў брацкай яме, за школай...

Жыў я цяжка ўвесь век,
і як выб'е часіна,
Я пакіну адзін запавет свайму сыну:
Як памру, не марнуйце вы грошай
на свечкі
І не трэба вянкоў, і прамоў
недарэчных.
А прашу—пахаваць не на цесным
пагосце,
Пахавайце ў зямлі, дзе ляжаць
мае косці.

Жывое слова

Маўчанне—золата.
Прыказка.

Не вер! Няма ў маўчанні золата,
Усё гэта выдумка адна.
Маўчанне што? Яно ад холаду
І ў гэтым ёсць твая віна...

Гняце маўчанне злой нягодаю.
А хіба ты не чуеш звон,
І чысты голас, і мелодыю,
І светлы смех, і горкі стогн?

Рака—ціхоня, ці імклівая,
А піск і ўскрык у ёй, жывой,
Бо нават рыба палахлівая
І тая—з моваю сваёй.

З карцінай, з кнігай (гэта логіка)
Вядзём размову ўсе гады.
Маўчанне ёсць адно—на могілках,
Ты не спяшайся, друг, туды!

Бурчыць труба каналізацыі,
Малое плача на руках.
Жывых планет цывілізацыі
Ужо для сустрэч шукаюць шлях.

Усцеражы ад адзінэласці —
Для новых спраў, для новых зор,
О слова мужнасці і смеласці,
Са мною будзь, каб не памёр.

ПЯЦЬ МУЖЧЫН У ЛЕСНІЧОЎЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на стар 8—11).

не выяўляў сваіх пачуццяў, быццам гаворка ішла аб рэчах, якія яго зусім не датычылі.

— Я буду з вамі спрачацца, — паўтарыў Тапор. — Так, цяпер наша барацьба хутчэй за ўсё скончыцца паражэннем. Але гэта не азначае, што яна скончыцца нічым. Частцы людзей ва ўсе часы было ўласціва ўвязвацца ў так званыя безнадзейныя справы. Калі б не гэтыя людзі, мы з вамі сядзелі б цяпер не тут, а дзе-небудзь каля самавара, бавячы час за размоваю, чаму нехта атрымаў чарговы чын, а ў некага выйшла затрымка. Мы былі б добранадзейныя падданыя імперыі, шчаслівыя шчасцем сытай жывёлы. Вы разумееце, пра што я кажу? Пра тое, што называецца ідэаламі. Я ўпэўнены: калі б не героі Касцюшкі, калі б не паўстанне трыццатага года, не існавала б ні сённяшняга мяне, ні маіх людзей. І вас, капітан, — таксама. — Тапор яшчэ вышэй падняў правае плячо. — Ідэалы жывыя, пакуль яны жывуць у сэрцах. Калі яны застануцца толькі ў старых кнігах, яны памруць. Кнігі можна схаваць у сховішчы, куды нельга даступіцца, а можна проста спаліць. Каб ідэалы жылі, трэба, каб за іх нехта гінуў. А таму—gloria victis! Хай і цяпер мы не пераможам, але ў рэшце рэшт людзі пачнуць разумець, што яны не статак, а народ.—Тапор сціснуў пальцы ў кулак.—Народ! У яго ўжо ёсць імя, і калі-небудзь з'явіцца годнасць.

— Шукайце для сваіх казаняў бязвусых хлопчыкаў, — са злосцю абазваўся палонны. — Са мной у вас нічога не атрымаецца. Лепшае, што вы можаце зрабіць, гэта не цягнуць час, а расстраляць мяне, pour encourager les autres.*

Антаневіч наблізіўся да камандзіра і нешта шапнуў. Тапор перамаўчаў. Яго нізкія бровы навіслі над вачыма яшчэ ніжэй.

За вокнамі шапацеў дождж. Палонны, закінуўшы нага за нагу, з абыякавым выглядам пазіраў на ходзікі. На іх было без пяці пяць. Сокалаў імкнуўся сустрэцца вачыма з Тапаром, але той унурыўся ў пыльны кут.

Стрэлкі ходзікаў паказалі пяць. Палонны раптам устаў.

— Пан Тапор, мне патрэбны канваір.

Студэнт ускочыў з лавы. Тапор з ад'ютантам абмяняліся хуткімі позіркамі, і Міткевіч таксама падняўся.

— Пайду я, — запярэчыў Антаневіч і зрабіў крок да дзвярэй. Ён быў бледны, як смерць.

— Не, — сказаў ад'ютант.

— Я! — амаль крыкнуў студэнт.

З абраза над сталом дакорліва глядзелі на людзей валошкавыя вочы Міколы-цудатворца.

— Камандзір першага плутона! — Ад хвосткіх слоў Тапара юнак міжволі выцягнуўся. — Пойдзе Міткевіч. Гэта загад.

Антаневіч закусіў губу і адвярнуўся да акна. Ягоныя плечы біла дрыготка.

Калі дзверы зачыніліся, паранены лёг тварам да сцяны. Тапор з Антаневічам віжавалі, як палонны і ад'ютант, які трымаўся крокі на тры ззаду, прайшлі пад дажджом паўз студню і схаваліся за рогам адрыны.

Праз нейкую хвіліну ў небе грымнула і амаль адразу загрымела яшчэ раз. Паранены ўздрыгнуў і сеў. Непрыхаваны боль у сініх вачах зрабіў спалатнелы твар трагічна прыгожым.

— Ходзікі... — пачаў і не скончыў Сокалаў.

Камандзір скасіў вока на застылы ківач і, тарганўўшы вышэйшым плячом, не адказаў. Антаневіч нервова глядзеў у акно. Нарэшце на сцежцы з'явіўся Міткевіч. Ён ішоў адзін.

— Я разумею, на вайне трэба быць жорсткім, — нібыта баючыся цішы, загаварыў паранены. — Але як гэта страшна... Калі чалавек хаваўся разам з табой ад дажджу і еў твае сухары...

— Не забывай, што ён забіў Дамарацкага і параніў Кончу, — адрывіста сказаў студэнт.

Ляпнулі дзверы сянец, на парозе стаяў Міткевіч. Ён меў выгляд чалавека, якога кагадзе з галавой акунулі ў ваду. З барады кропала, з навылёт прамяклай світкі ўмомант набегла вялікая лужына. Не кажучы ні слова, ад'ютант прыклаўся да біклажкі. Антаневіч таксама маўчаў, але было відаць, што яго грызе нейкая неадчэпная думка. Яму рупіла нешта спытаць, аднак ён марудзіў, як быццам гэтае нешта было надзвычай важлівым і ад яго вельмі шмат залежала. І ўсё ж Антаневіч адважыўся:

— Ён... адчуваў?

Міткевіч, няўцямна паглядзеўшы на юнака, адказаў не адразу.

— Хіба вы не зразумелі, што ён сам не хацеў цягнуць? — Ад'ютант скінуў цяжкую світку і пачаў сцягваць боты.

— Ён што-небудзь казаў вам? — наструнена працягваў Антаневіч.

— Не.

— Мне здалося, вы стралялі якраз тады, калі грымеў гром, — дапытваўся студэнт.

— Я не жадаю гаварыць пра гэта, — адгукнуўся Міткевіч, пазіраючы ў акно.

— Чаму вы не хочаце адказаць? — падазрона спытаў Антаневіч.

Ад'ютант змоўчаў. Студэнт з хвіліну вагаўся і раптам імкліва выйшаў у дзверы.

— Зараз будзе бура, — прамовіў Міткевіч.

Тапор ледзь прыкметна ўсміхнуўся. Сокалаў здагадаўся і, забыўшыся на параненую руку, усхапіўся з палка. Ён узбуджана забегаў па хаце. Ад'ютант змеціў, што ходзікі стаяць, спраўдзіў час па сваім Бурэ і, падцягнуўшы гіру, пусціў ківач.

Антаневіч уварваўся ў леснічоўку, як віхор.

— Цела няма! Вы адпусцілі яго!

— З перакошаным тварам і рэвальверам у руцэ ён кінуўся на Міткевіча. Ад'ютант няўлоўным рухам выбіў з рук юнака зброю і прыціснуў рэвальвер нагой. Яны, абодва мокрыя да нітачкі, з наліплымі на лбы валасамі, стаялі адзін супраць другога і цяжка дыхалі.

— Я знаходзіў у вас прытулак і хлеб, — задыхаючыся гаварыў студэнт. — Я любіў вас за мужнасць, за тое, што вашы грошы былі грашыма паўстання. Я да апошняга верыў, што вы... А вы аказаліся нягоднікам, пан Міткевіч... Я магу плюнуць вам у вочы. Грамадзянін Тапор, загадайце арыштаваць вашага ад'ютанта!

— У чым вы яго абвінавачваеце? — з непранікальным тварам спытаў камандзір.

— У тым, што ён адпусціў на волю свайго даўняга прыяцеля капітана Крыніцкага.

— Як?! — Словы Антаневіча непрыемна ўразілі параненага.

— Я быў прыняты ў ягоным доме, — студэнт з пагардаю кіўнуў на Міткевіча,—і не раз сустракаў там Крыніцкага, чуў яго імя. Я адчуваў, адчуваў, але я спадзяваўся да апошняй хвіліны... Толькі таму я змаўчаў і дазволіў ісці яму. Якая наіўнасць!..

— Грамадзянін Міткевіч, гэта праўда? — звонкім голасам запытаў паранены.

— Так, мы былі знаёмыя, — вытрымаўшы ягоны позірк, адказаў ад'ютант.

— Вы чуеце? Чуеце? — павярнуўся Антаневіч да камандзіра.

— Я ведаў гэта.

— Вы хочаце сказаць, што здагадаліся?

— Не, я ведаў гэта з самага пачатку.

— Значыць, вы... таксама спадзяваліся, што... — У голасе юнака жыла надзея.

Тапор пахітаў галавой.

— Тады чаму вы загадалі ісці яму?

— Дазвольце мне не адказваць на ваша пытанне. Калі-небудзь вы зразумееце самі.

— Гэта здрада! — закрычаў Антаневіч. — Здрада! Здрада! — Ён быў страшны. Радзімая пляма на шчацэ набыла жудлівы попельны колер.

— Апамятайся, Восіп, — загаварыў Сокалаў. — Гэта абсурд.

Студэнт павёў вакол няўцямнымі, амаль вар'яцкімі вачыма і раптам бяссіла апусціўся на лаўку і, абхапіўшы голаў рукамі, заплакаў.

— Ён страляў у нас... Ён забіў Дамарацкага... — вырвалася ў яго праз усхліпы. — Мы разам раслі... Яны не шкадуюць нас, а мы... Я павінен быў забіць яго... Хоць аднаго ворага... Хоць аднаго...

— Удзел у паўстанні вымяраецца не колькасцю забітых, — прамовіў Тапор. Ён глядзеў на юнака са стрыманай спагадаю.

Плечы Антаневіча трэсліся. Гэтае відовішча было для параненага невыносным, і ён не вытрымаў:

— Восіп! Пані Юліі было б сорамна за цябе.

Нягучныя словы падзейнічалі адразу.

— Што ты сказаў? Пані Юліі? Якое права ты маеш згадваць тут яе імя?

— Яно дарагое і мне, — мякка адказаў Сокалаў.

— Што?! Студэнт ускінуўся на ногі. Ён ужо не плакаў.

— Утаймуй сваю недарэчную рэўнасць, — з лёгкім сумам адазваўся паранены.

— Я хачу, каб ты выказаўся яснейі!

— Восіп, мы не адны.

— Я патрабую!

— Ну добра, — пакутліва чырванеючы, сказаў Сокалаў. — Я... прызнаўся пані Юліі... у сваіх пачуццях.

— Вось як!.., — з пагрозаю прамовіў Антаневіч.

Тапор з ад'ютантам глядзелі кожны ў сваё акно.

— Я рады, што ты супакоіўся, — сказаў Сокалаў.

— Я супакоюся толькі тады, калі ты скажаш мне ўсё.

— Няўжо ты не разумееш? Восіп, ты павінен быць варты яе кахання.

Антаневіч падбег да параненага і парывіста пацалаваў яго. Збянтэжаны і разгублены, не ведаючы, што рабіць, ён прысеў поруч з Сокалавым на палок.

У запанавалай цішыні з'явіўся нейкі новы гук. Гэта было таканне ходзікаў. Дождж высільваўся, неба ўжо не грымела.

Тапор* разгарнуў на стале мапу.

— Будзем прабірацца ў Магілёў, — сказаў ён пасля роздуму. — У бліжэйшым маёнтку зменім адзенне. З Магілёва — на захад, туды, дзе паўстанне працягваецца.

За вокнамі пасвятлела, на небе з'явіліся акраўкі блакіту.

— Апроч таго, — працягваў камандзір, — у нас ёсць прычына зрабіць у Магілёве візіт нейкаму пісару Савінічу. Вы чуеце, грамадзянін Антаневіч? Калі вы будзеце настойваць, мы, бадай што, згодзімся даручыць гэты візіт вам.

Студэнт кіўнуў стрымана, але ў ягоных вачах была ўдзячнасць.

— Трэба ісці, — сказаў камандзір.

Чацвёра мужчын падняліся і разабралі з піраміды зброю.

* Каб узбадзёрыць іншых (фр.).

* З тае прычыны, што інсургенты, якія сталі героямі гэтай гісторыі—рэальныя асобы і выведзеныя пад сапраўднымі імёнамі, неабходна заўважыць, што пад мянушкаю Тапор хаваў сваё імя адзін з прадстаўнікоў «чырвонага» крыла паўстання 1863—1864 гг., на той час паўстанцкі вайсковы начальнік Магілёўскай губерні Людвік Звяждоўскі (1825—1864).

Героі жыцця — героі песень

Аднойчы, перабіраючы ў памяці песні Ігара Лучанка, я заўважыла: сярод іх ёсць песні, звязаныя з біяграфіямі зусім пэўных людзей. Людзі гэтыя жылі ў розных краінах, але ўсе яны — нашы сучаснікі, героі XX стагоддзя. Мне падалося, што лініі іх жыцця, кароткага, але яркага, як святло бліскавіцы, нейкім чынам скрыжаваліся і ўжо зусім не выпадкова знітаваліся ў творчасці кампазітара.

Потым з Ігарам Міхайлавічам мы не раз гутарылі пра гэта. Ён успамінаў шматлікія паездкі, сустрэчы, расказваў, як нарадзіліся гэтыя песні. Расказваў шчыра, захоплена, здаецца, не заўважаючы, што побач сцішана шумеў матор магнітафона, павольна круцілася стужка.

— Ёсць думка, што гісторыя, жыццё рухаюцца наперад дзякуючы людзям, якія ідуць першымі, — гаворыць І. Лучанок. — Галоўныя мае песні — гэта песні пра маю зямлю, дзе я нарадзіўся, сталеў, жыву, радуюся сонцу, міру: «Спадчына», «Мой родны кут», «Жураўлі на Палессе ляцяць». Але мне, беларусу, давялося вандраваць, бываць за межамі роднай зямлі. Я сустракаўся ў такіх паездках з людзьмі, якія ў нашы дні здзяйсняюць подзвігі. Уражанні ад такіх падарожжаў і сустрэч натхнялі і натхняюць на напісанне песень. Так з'явіліся «Таварыш Астроўскі», «Песня пра Віктара Хару», «Балада пра Чэ Гевару», «Балада пра поле Мішы Мароза». Зусім нядаўна ў канцэртах ансамбля «Сябры» загучала песня пра беларускага героя-камсамольца Мікалая Чэпіка...

Розныя людзі. Але з'ядноўвае іх актыўная жыццёвая пазіцыя, непрымірымасць да эла, жаданне сцвердзіць справядлівасць на зямлі.

«Таварыш Астроўскі». Я прачытаў гэты верш у газеце «Знамя юности». Яго аўтар — Юрый Фатнеў, паэт, лёс якога чымсьці нагадвае мне лёс Астроўскага: гэта таксама мужны чалавек, хваробай прыкаваны да ложка. Калі я пісаў песню, адзначалася 70-годдзе з дня нараджэння Мікалая Астроўскага. Разам са спеваком Анатолем Падгайскім я быў запрошаны ў Сочы: ніколі не забуду, як упершыню пабываў у музеі Астроўскага. Там адбылася ў мяне сустрэча з супрацоўнікамі музея. У пакоі, дзе пісьменнік правёў свае апошнія гады, яшчэ пры яго жыцці стаяў раяль. Вось там упершыню я праспяваў песню «Таварыш Астроўскі». Праз некалькі дзён у гарадскім зімовым тэатры адзначаўся юбілей пісьменніка, і песня прагучала зноў. Гэта было ў верасні 11 гадоў назад. З таго часу кожны раз, калі бываю ў Сочы на фестывалі «Чырвоны гваздзік», заходжу ў музей. Сочы для мяне — гэта горад Астроўскага.

«У будзёнаўцы вечнай таварыш Астроўскі...» З першымі гукамі песні, здаецца, адчуваеш трывожную, імклівую тэмурытм конніцы, гарачы, палынны спеў стэпу. І яшчэ памяць падказвае... так, кадр старой кінастужкі «Як гартавалася сталь»: на ўвесь экран неўтаймоўны Паўка нясецца насустрач і насуперак смерці...

Своеасаблівая дакументальнасць—адна з галоўных прыкмет творчасці Ігара Лучанка. Ён прыйшоў у песню на пачатку 60-х, як аўтар песень пра моладзь, пра камсамолію. Прыйшоў і са сваёй тэмай, са сваёй інтанацыяй. Яго тагачасныя песні захавалі прыкметы тых гадоў, калі будаваліся ў Сібіры новыя гарады, перакрывалася Ангара і, пераадольваючы зямное прыцягненне, да зор імкнуліся хлопцы з новай прафесіяй—касманаўты.

Рамантычна ўзнёслыя «Брыганціны», «Мы ідзём па зямлі»... Уявіце, яны былі створаны каля чвэрці веку назад, але і сёння з намі. Рамантык 60-х, Ігар Лучанок захаваў маладосць, зоркасць душы—якасць, каштоўную для мастака. Ён успрымае свет як малады чалавек і цягнецца да моладзі. Нездарма ён не проста госць, а ўдзельнік многіх міжнародных маладзёжных форумаў.

Сёлета ў Маскве, на XII Сусветным фестывалі моладзі, мне давялося разам з Ігарам Міхайлавічам пабываць на дыскусіі ў секцыі палітычнай песні. Народу сабралася багата: замежныя музыканты—удзельнікі перадачы Усесаюзнага радыё «Музыкальный глобус», кампазітары, крытыкі, журналісты. Сярод іх быў спявак і кампазітар з Лацінскай Амерыкі. Ён прывёз мноства народных інструментаў і ў час свайго выступлення загаварыў пра нацыянальныя вытокі лацінаамерыканскай палітычнай песні. Я заўважыла, як ажывіўся Ігар Лучанок і адразу далучыўся да размовы. Гаварыў пра свае ўражанні ад лацінаамерыканскага фальклору, аб праблемах палітычнай песні, а потым нечакана падышоў да раяля і заспяваў песню пра Віктара Хару. Спяваў літаральна ў акружэнні рэпарцёрскіх мікрафонаў. Было неяк асабліва хвалююча, што тут, на фестывалі, у шматгалоссі музыкі свету загучала песня беларускага кампазітара пра чылійскага музыканта.

— У лютым 1971 года разам з Віктарам Вуячычам мне давялося пабываць у Чылі на фестывалі палітычнай песні, — працягвае І. Лучанок. — Ён праходзіў у маленькім курортным гарадку Віні-дэль-Мар. Мы выступалі перад моладдзю, на тэлебачанні, спявалі савецкія песні, народныя песні, песні барацьбы, салідарнасці. Усіх удзельнікаў фестывалю прымаў Сальвадор Альендэ. Там жа, на фестывалі, я сустрэўся з Луісам Карваланам, з палымяным Пабла Нэрудам. Памятаю, як ён разважаў пра задачы палітычнай песні, пра тое, што гэта павінна быць перш за ўсё высокамастацкая песня, толькі тады яна дойдзе да сэрца. На фестывалі я ўпершыню ўбачыў і пачуў Віктара Хару, паслухаў ягоныя песні.

Пасля трагічнай гібелі Віктара Хары ва ўсім свеце нарадзілася шмат вершаў, песень пра яго жыццё. Напісаў такую песню і я. Праслухаў шмат мелодый Віктара Хары, у якіх быццам увасоблены дух Чылі. Адгалоскі іх можа нагадаць уступ да маёй «Песні пра Віктара Хару». Я захоўваю вельмі дарагі для сябе дакумент. На фестывалі «Чырвоны гваздзік» пасля канцэрта да мяне падышла сакратар ЦК камсамола Чылі Гладзіс Марын і на чылійскай газеце напісала такія словы: «Дзякуй вам за песню пра нашага сябра, пра Віктара Хару». Гэта для мяне вялікая ўзнагарода.

Віктар Хара — спявак, кампазітар, не развітаўся з гітарай, спяваў перад народам Чылі. І ў сэрцах людзей застаўся яго вобраз — добрага, таленавітага чалавека, змагара за справядлівасць. Гэта той мастак-трыбун, пра якога можна сказаць словамі Маякоўскага:

И песня, и стих — это бомба
и знамя.
И голос певца поднимает класс!

З песняй пра Віктара Хару ў жыццё, у творчасць Ігара Лучанка ўвайшла тэма мастака-грамадзяніна.

Аднойчы я запыталася ў Ігара Міхайлавіча, што ён цэніць у людзях, і ён адказаў: «Чалавечнасць, дабрату, прынцыповасць. Памятаеце, у Горкага: Данка—чалавек-маяк. Гэта не проста літаратурны вобраз, такія людзі ёсць і ў жыцці. На іх трэба раўняцца».

І, пэўна, не выпадкова звярнуўся кампазітар да жыцця, лёсу Чэ Гевары—сцяга кубінскай рэвалюцыі.

— Двойчы давялося мне пабываць на Кубе, — прыгадвае І. Лучанок, — бываў у краінах Лацінскай Амерыкі — Аргенціне, Калумбіі, Уругваі, Перу, і заўсёды там бачыў партрэты Чэ Гевары. Ён быў герой не толькі Кубы, а ўсёй Лацінскай Амерыкі. Я многа чытаў пра яго, многа чуў расказаў, нават легенд. Гэта быў не толькі прафесійны рэвалюцыянер, а добры чалавек, які любіў людзей. Я перачытваў дзённікі Чэ Гевары. Усё гэта ўзрушвае: яго апошнія дні, гадзіны жыцця...

І вось, калі да мяне трапіў верш Генадзя Бураўкіна, ён мяне ўзрушыў, вельмі ўзрушыў:

Не трэба аркестраў,
Хай пальцы разбудзяць
гітару.
Спяём пра Эрнеста,
Спяём пра Эрнеста Гевару...

«Нам залаў не трэба, нам люстраў крыштальных не трэба...», хай будзе толькі тое, што сапраўднае, вечнае: зямля, неба, і хай гучыць песня пра героя.

Над «Баладай пра Чэ Гевару» я доўга працаваў. Потым паэт Мікалай Дабранраваў зрабіў пераклад верша на рускую мову. Гэта было нялёгка: трэба было, каб верш не страціў свайго настрою. Праца доўжылася амаль тры гады. І вось цяпер «Баладу пра Чэ Гевару» спяваюць наш беларускі выканаўца Яраслаў Еўдакімаў, народны артыст Башкірскай АССР Радзік Гарэеў. У дні сёлетняга Сусветнага фестывалю моладзі песню выконвалі ў Маскве «Песняры». Я і сам яе напяваю на сустрэчах са слухачом, бо не трэба аркестра, не трэба вялікага голасу, хай гучыць яна, як памяць пра легендарнага Чэ.

...Мелодыя песні разгортваецца паволі, успыхвае, быццам сонечны прамень на вяршынях Сьера-Маэстра. Яна як бы запальваецца ад слова, высвятляе яго, а потым мяккі баладны тон пераўтвараецца ў магутны маршавы крок супраціўлення...

Так, слова ў творчасці Лучанка не скоўвае, а нібыта стымулюе песню. Кампазітар ламае традыцыйную песенную форму, слова-вобраз вядзе яго фантазію, падказвае творчы «ход». Лучанок любіць у песні дзеянне, яркія вобразы, жанравыя кантрасты, мабыць, таму ў яго многа песень-балад. Здаецца, такія песні ўзнікалі як імправізацыі, вольна, натхнёна... Ды разумееш, што за лёгкасцю —безліч гадзін працы і роздуму.

Менавіта ў баладным «абліччы» створаны песні пра беларускіх камсамольцаў Міхаіла Мароза і Мікалая Чэпіка.

— «Баладу пра поле Мішы Мароза» на верш Генадзя Бураўкіна, — прадаўжае І. Лучанок, — я напісаў да спектакля «Спытай сябе». Там гучала яшчэ некалькі песень, у тым ліку і «Світанак» на словы Уладзіміра Нікляева. П'еса Маргарыты Саенка ішла ў нашым ТЮГу, потым у Маскве, дзе на прэм'еры спектакля «Спытай сябе» давялося сустрэцца з бацькам Мішы.

Так, у жыцці ёсць месца подзвігу, але подзвіг — гэта не толькі рамантыка, у ім ёсць і трагічнае. Міша Мароз пайшоў на подзвіг, ён выратаваў сяброў цаною свайго жыцця; Віктар Хара стварыў песні, спяваў іх для народа, Чэ Гевара жыў і змагаўся натхнёна і ярка, але жыццё іх трагічна абарвалася. Мікалай Чэпік таксама загінуў пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку.

Ад Мінска ў напрамку на Асіповічы ходзіць поезд, названы яго імем — «Мікалай Чэпік». Ён ідзе праз лясы, пералескі, мінае станцыі з такімі знаёмымі назвамі: Пухавічы, Блужа, Талька. Мікалай Чэпік нарадзіўся ў Блужы — гэта маленькі прыпынак, ля якога, бадай, толькі электрычка і затрымлівае свой ход. Там, у Блужы, дзе праз цудоўныя бары цячэ Свіслач, прайшло дзяцінства Мікалая, там у мясцовай школе ён вучыўся, там яго помняць, шануюць, расказваюць, які гэта быў добры хлопец, як заўсёды хацеў быць справядлівым, як цягнуўся да ведаў.

Я сустракаўся з бацькамі Мікалая Чэпіка. Так атрымалася, што ён мой зямляк. Я нарадзіўся ў Мар'інай Горцы — гэта 10 кіламетраў ад Блужы. Нас з ім звязвае і прыналежнасць да адной зямлі, і адносіны да жыцця. Вядома, я не мог не напісаць песню пра свайго земляка, які ў 19 гадоў пайшоў на подзвіг.

Карчагінцы, стаханаўцы, героі Вялікай Айчыннай і тыя, хто будаваў БАМ, хто ўзнімае Нечарназем'е, працуе на ўдарных камсамольскіх будоўлях краіны... Сярод вядомых нам і безыменных герояў — слаўнае імя Мікалая Чэпіка, простага беларускага хлопца з вёскі Блужа.

Песні пра герояў нашага часу. Яны былі створаны Ігарам Лучанком у розныя гады, але з'ядноўвае іх высокая грамадзянскасць. Бадай, гэта самае цяжкае: стварыць сапраўдную, шчырую грамадзянскую песню, не падобную да соцень іншых, а сваю, якая б узрушыла, паклікала за сабой, засталася ў памяці людзей.

Часам мы шукаем у мастацтве, асабліва ў песні, лёгкасці, забаўнасці. Так, музыка для адпачынку неабходная, але ў стракатай плыні музычнай моды часам губляецца сапраўдная духоўнасць, пачуцці шчырыя і вечныя. Узнімаць дух чалавека, абуджаць яго думку—у гэтым галоўны сэнс мастацтва. Жыць —гэта значыць услухоўвацца ў свет, адчуваць усю разнастайнасць і багацце тонкіх, складаных сувязей, якія знітоўваюць цябе з ім, бо чалавек, часцінка прыроды, як дрэва, што каранямі ўзрастае з роднай зямлі, а вецем рук сваіх цягнецца да сонца.

Духоўнасцю, высокім узлётам думкі вабіць творчасць Ігара Лучанка. Яго сэрца настроена на свет, чуйна рэагуе на праявы рэчаіснасці, на чужы боль. Мастак пільна ўзіраецца ў свой час, у твары, у характары людзей, і песенны летапіс працягваецца...

Людміла МІТАКОВІЧ.

На здымку: народны артыст БССР І. ЛУЧАНОК на сустрэчы са слухачамі.

Фота І. ЮДАША.

ФІЛЬМЫ... ПА ЖАДАННІ

Здаецца, яшчэ зусім нядаўна мы разам з галоўнымі героямі фільма Э. Разанава «Вакзал для дваіх» здзіўлена глядзелі на адну даволі своеасаблівую калгасніцу па імені «дзядзька Міша», якая прапаноўвае сваім гасцям пакарыстацца яе асабістай відэатэкай. Тады нічога, акрамя здзіўлення, гэты факт выклікаць не мог. А цяпер... У будынку кінатэатра «Перамога» адкрыўся пункт пракату відэакасет Мінскай гарадской і абласной канторы кінапракату — відэатэка.

На сённяшні дзень ужо каля 200 фільмаў пераведзены на відэаплёнку, укладзены ў невялікія, зручныя, з густам аформленыя футаралы і могуць быць набыты для шматразовага хатняга або клубнага прагляду на тэлеэкране. Кошт пракату за сутні адной касеты складае 1,5—5 рублёў, а зручнасць такой формы абслугоўвання несумненная. Улічваючы, што амаль увесь айчынны фільмафонд можа быць пераведзены на відэа, ва ўладальнікаў відэамагнітафонаў з'яўляецца практычна неабмежаваная магчымасць для выбару з відэатэкі любой кінастужкі той або іншай тэматыкі або проста па настроі на дадзены дзень.

— К канцу года, — гаворыць начальнік аддзела рэпертуарнага планавання, тыражыравання і арганізацыі пракату відэазапісаў Усесаюзнага аб'яднання «Саюзфільмафонд» Дзяржкіно СССР У. Оліцкі, які прыехаў у Мінск на адкрыццё відэатэкі, — мы зможам прапанаваць гледачам прыкладна 450 відэапраграм. Сярод навінак, акрамя відэафільмаў, — канцэрты І. Казлоўскага, Э. Гілельса, А. Абразцовай, праграмы з песнямі У. Высоцкага, А. Міронава, А. Пугачовай, запісы папулярнай рытмічнай гімнастыкі. «Ленфільм» рыхтуе праграму Ленінградскага мюзік-хола. На «Масфільме» здымаецца Г. Хазанаў.

— Для юных гледачоў, — уключаецца ў гаворку загадчыца відэатэкі Т. Міронава, — у нас ёсць вялікі выбар мультфільмаў. Не забылі мы і пра тых, хто яшчэ пакуль не мае ўласных відэамагнітафонаў. Ва ўтульнай зале відэатэкі за невялікую плату яны змогуць паглядзець любы відэазапіс.

— У бліжэйшы час, — працягвае У. Оліцкі, — мяркуецца наладзіць спецыяльную вытворчасць відэафільмаў, г. зн. такіх карцін, якія не павінны дэманстравацца ў сетцы кінапракату, а будуць выпушчаны толькі на відэакасетах.

Р. КАРОТКІ.

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКАЯ ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ ІМЯ А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

аб'яўляе прыём на 1985 год у асістэнтуру-стажыроўку з адрывам ад вытворчасці па спецыяльнасці: кампазіцыя.

У асістэнтуру-стажыроўку прымаюцца асобы абодвух полаў не старэй за 35 год, якія маюць вышэйшую адукацыю па абранай спецыяльнасці і праявілі здольнасці да педагагічнай і мастацка-творчай дзейнасці.

Паступаючыя ў асістэнтуру-стажыроўку павінны мець вопыт практычнай работы па профілі абранай спецыяльнасці не менш за два гады пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы.

Маладыя спецыялісты дапускаюцца да ўдзелу ў конкурсных экзаменах у асістэнтуру-стажыроўку непасрэдна пасля заканчэння ВНУ па рэкамендацыях саветаў вышэйшых навучальных устаноў.

Заява ў асістэнтуру-стажыроўку падаецца на імя рэктара кансерваторыі з указаннем абранай спецыяльнасці з дадаткам: асабістай карткі па ўліку кадраў з фотаздымкам, характарыстыкі з апошняга месца работы; выпіскі з пратаколу пасяджэння савета ВНУ для асоб, рэкамендаваных у асістэнтуру-стажыроўку непасрэдна пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы, копіі працоўнай кніжкі, рэферату па абранай спецыяльнасці.

Асобы, якія паступаюць у асістэнтуру-стажыроўку, здаюць конкурсныя экзамены па спецыяльнасці, гісторыі КПСС і адной з замежных моў у аб'ёме дзеючай праграмы для вышэйшых навучальных устаноў.

Асобам, дапушчаным да здачы ўступных экзаменаў у асістэнтуру-стажыроўку для падрыхтоўкі прадастаўляецца дадатковы адпачынак на 30 каляндарных дзён з захаваннем заработнай платы па месцы работы.

Дакументам, які пацвярджае права на адпачынак, з'яўляецца паведамленне за подпісам рэктара аб допуску да здачы экзаменаў.

Прыём дакументаў з 1 лістапада па 15 лістапада па адрасу: 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30. Уступныя экзамены з 20 лістапада.

РЭПАРТАЖ У НУМАР

У ДОБРЫ ШЛЯХ, КАЛАСАВІНЫ!

ХАРОШАЕ пачынанне, калі б яно ні ажыццяўлялася, абавязкова прыносіць радасны, святочны, па-сапраўднаму вясновы настрой. Каласавіны — у гэтым сэнсе не выключэнне. А нарадзіліся яны сёлета ўпершыню па ініцыятыве Літаратурнага музея Якуба Коласа, ухваленыя і падтрыманыя Міністэрствам культуры БССР, іншымі аўтарытэтнымі ўстановамі, — як штогодняе літаратурнае свята, якое будзе праходзіць у дні, набліжаныя да нараджэння народнага песняра.

Пачатак быў зроблены ў канферэнц-зале Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Акадэміі навук БССР, дзе на працягу двух дзён праходзіла навуковая канферэнцыя — коласаўскія чытанні, у якіх прынялі ўдзел вядомыя вучоныя і літаратуразнаўцы, пісьменнікі, даследчыкі творчасці песняра.

З першым дакладам «Прынцыпы выдання першага поўнага Збору твораў Якуба Коласа» выступіў М. Мушынскі. Гаворку прадоўжылі: У. Конан — «Паняцце і вобраз генія ў творчасці Якуба Коласа», З. Пазняк — «Якуб Колас і развіццё беларускага тэатра ў дарэвалюцыйны перыяд», А. Яскевіч — «Прырода ў творчасці Якуба Коласа», П. Садоўскі — «Стылявая інтэрпрэтацыя абстрактнай лексікі твораў Якуба Коласа», Г. Кісялёў — «Якуб Колас і Акадэмія навук БССР», У. Мархель—«Уладзіслаў Сыракомля і Якуб Колас», Д. Міцкевіч — «Якуб Колас і кніга», А. Мальдзіс — «Коласавы рукапісы ў Вялікабрытаніі», Я. Саламевіч — «Пра аўтарства верша «Горад і вёска» і іншыя.

Удзельнікі чытанняў, шматлікія аматары літаратуры наведалі Літаратурны музей Якуба Коласа, усклалі кветкі да помніка песняру, што знаходзіцца на плошчы яго імя ў цэнтры Мінска, а ў мінулую нядзелю Каласавіны перанесліся на Стаўбцоўшчыну — радзіму песняра, мясціны, так хораша апетыя ў яго творах.

Прадстаўнічая дэлегацыя, у якую ўвайшлі вядомыя пісьменнікі, мастакі, краязнаўцы і мастацтвазнаўцы, навукоўцы рэспублікі, пабывала ў Смольні, дзе госці азнаёміліся з экспазіцыяй філіяла Літаратурнага музея Якуба Коласа, у Мікалаеўшчыне, дзе ўсклала кветкі да помніка песняру. А ў Акінчыцах, адкуль пачалася жыццёвая сцяжына Я. Коласа, сабраліся шматлікія паклоннікі таленту знакамітага земляка. Цяпер Акінчыцы адносяцца да Стоўбцаў і сюды лёгка дабрацца гарадскім аўтобусам.

Ажыўлена на кніжным кірмашы. Найбольшым попытам карыстаюцца творы Я. Коласа, буклеты, прысвечаныя яго родным мясцінам, даследаванні, у якіх узнаўляюцца старонкі мастакоўскай спадчыны песняра. Гэтая ж кніга выйшла нядаўна з друку ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Новая аповесць вядомага літаратуразнаўцы і празаіка С. Александровіча «Крыжавыя дарогі» працягвае папярэднія творы аўтара «Ад роднае зямлі...» і «На шырокі прастор», расказваючы пра жыццё Я. Коласа ў паслярэвалюцыйны час, у дваццатыя і трыццатыя гады, у час вайны і да апошніх дзён.

Людна і ля столікаў, дзе народныя майстры Стаўбцоўшчыны прапануюць свае арыгінальныя вырабы з гліны. Асабліва падабаюцца ўдзельнікам свята гліняныя «пахвісцёлы», што нагадваюць сабой невялічкія фігуркі жывёл і казачных персанажаў.

Праз колькі часу ўсе запрашаюцца на двор колішняй сялібы Міцкевічаў, якая нядаўна адноўлена ў сваім першапачатковым выглядзе. Тут, ля хаты, у якой 3 лістапада 1882 года ў сям'і радзівілаўскага лесніка Міхала Міцкевіча нарадзіўся сын Кастусь, якому лёс наканаваў стаць сусветна вядомым пісьменнікам Якубам Коласам. Каласавіны дасягнулі свайго кульмінацыйнага моманту.

Да прысутных звяртаецца дырэктар Літаратурнага музея Якуба Коласа Г. Ткацэвіч. Сёння радасна і хораша на сэрцы кожнага, гаворыць ён, бо пачынае сваё жыццё новае літаратурнае свята на беларускай зямлі — Каласавіны. Адметна, што яно прыйшло сюды, у родныя Коласавы Акінчыцы, дзе ўпершыню пабачыў ён свет, куды пастаянна звяртаўся ў сваіх думках.

Г. Ткацэвіч прадстаўляе гасцей, якія прыехалі з Мінска.

Адзін за адным падыходзяць да мікрафона Я. Саламевіч, А. Грачанікаў, Г. Далідовіч, Г. Каржанеўская. Усіх нас, гавораць яны, сюды, у Акінчыцы, у Коласавы мясціны, паклікала любоў да геніяльнага мастака, творчасць якога ёсць, была і будзе яркай старонкай не толькі ў беларускай, але і ў сусветнай літаратуры. Прамоўцы падкрэсліваюць, што талент Я. Коласа блізкі і зразумелы кожнаму, таму што ён зямны ў сваёй аснове, а просты народ быў галоўным героем твораў пісьменніка. Пра што б ні пісаў пясняр, у якіх бы жанрах ні выступаў, ён заўсёды ствараў з думкай аб народзе, з верай у яго светлую будучыню. Урокі творчасці Я. Коласа — гэта ўрокі, што маюць значэнне для ўсіх сённяшніх беларускіх літаратараў, прадстаўнікоў як старэйшых, так і маладзейшых пакаленняў, для якіх ён самы аўтарытэтны і самы вялікі настаўнік.

Пра Я. Коласа як літаратурнага настаўніка і дарадцу гаворыць У. Дамашэвіч. Усе мы, зазначае ён, яшчэ ў школе захапляліся вершамі, апавяданнямі класіка нашай літаратуры, якія даўно сталі хрэстаматыйнымі. Прайшоў час і па-ранейшаму бачым, што творчасць Я. Коласа—не проста спадчына, а спадчына жывая, якая

Верш «На Палессі» чытае Анатоль Грачанікаў.

У госці да песняра.

З экспазіцыяй філіяла Літаратурнага музея Якуба Коласа знаёмяцца ў Смольні Уладзімір Дамашэвіч і Генрых Далідовіч.

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

РОДНЫ МІНСК— МАЯ СТАЛІЦА...

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 4).

Распрацоўваецца архітэктурна-мастацкае вырашэнне гэтых станцый. Мяркуем, што для афармлення другой лініі мы будзем шукаць больш танныя матэрыялы. Мо гэта будзе кераміка, метал...

— Мастак у горадзе... Адна з тых праблем, што, як гаворыцца, заўсёды навідавоку. Востра і зацікаўлена рэагуюць мінчане на новы помнік або мемарыяльную дошку, фантан або дэкаратыўнае мазаічнае панно на пэўным будынку. Мастак у горадзе—гэта вітражы і габелены, тэатральныя заслоны і жывапісныя палотны, створаныя для культурных і грамадскіх устаноў, для бібліятэк, дзіцячых садоў, інстытутаў. Але ёсць яшчэ і такое паняцце, як гарадскі дызайн, пра які хацелася б пагаварыць больш падрабязна. І вось тут, на маю думку, у Мінску ёсць да чаго прыкласці рукі...

— Знешняе афармленне горада... Што ўбірае ў сябе гэтае паняцце? Шмат розных аспектаў. Гэта афарбоўка фасадаў будынкаў, а іх у Мінску больш як 24 тысячы, гэта светлавая рэклама, афармленне вітрын і інтэр'ераў прадпрыемстваў грамадскага прызначэння, гэта інфармацыйны дызайн. А дробнарознічная гандлёвая сетка на галоўных магістралях горада? Яна ж таксама стварае пэўныя эстэтычныя акцэнты і колеравую гаму на вуліцах. Ці ўсё тут добра? Вядома, не. І галоўная праблема, на маю думку, у тым, што мастацка-палітычнае, святочнае афармленне, наглядная агітацыя, манументальная прапаганда і добраўпарадкаванне вырашаюцца без неабходнай у гэтай справе адзінай вытворчай базы. Знешнім афармленнем горада займаюцца Мінскі мастацка-вытворчы камбінат Мастацкага фонду БССР і камбінат «Белгандальрэклама», «Белбытрэклама» і «Мінгардаведка», у абавязкі якой уваходзіць расклейка афіш, рэкламы. Усе гэтыя прадпрыемствы знаходзяцца на гаспадарчым разліку, маюць нязначную вытворчую базу і працуюць згодна заказам, што да іх паступаюць. Узяць хоць бы такое пытанне, як святочнае або мастацка-палітычнае афармленне горада, якое пастаянна дзейнічае. Яно, як правіла, распрацоўваецца па дзевяці раёнах горада і часам да гэтай творчай і складанай работы далучаюцца мастакі або архітэктары невысокай кваліфікацыі. Вырабляюць гэтыя ўстаноўкі звычайна прадпрыемствы гаспадарчым спосабам, яны каштуюць немалыя грошы, грувасткія, неаператыўныя па ўстаноўцы і дэмантажы... Вось чаму, прааналізаваўшы вопыт Масквы, Ленінграда, Кіева, Рыгі, Тбілісі па гэтым пытанні, мы прыйшлі да высновы: Мінску неабходны адзіны камбінат «Мінгарафармленне». Але тут трэба вырашаць яшчэ пэўныя задачы.

— Валерый Андрэевіч, ёсць у горада яшчэ адна надзённая праблема, пра якую хацелася б пагаварыць. Коратка яе можна было б вызначыць, як «вольны час гараджаніна». Пагадзіцеся, пасля работы, асабліва ў канцы працоўнага тыдня заўсёды хочацца парадаваць сябе чымсьці прыемным. Адны дзеля гэтага накіроўваюцца на выстаўку або ў тэатр, другія паглядзець кінафільм або збіраюцца ў лес у грыбы, іншыя... Але ж пералічыць усе віды адпачынку проста немагчыма. Гэтаксама, як немагчыма назваць усе тыя культурныя цэнтры, дзе людзі могуць правесці свой вольны час. Кожны, калі захоча, зробіць свой уласны адпачынак цікавым і карысным. Але, зноў-такі, калі захоча... І вось тут праблема адпачынку часам перарастае ў іншую, вельмі балючую для грамадства. Няўменне правільна і нежаданне рацыянальна выкарыстоўваць свой вольны час — адна з галоўных прычын, якая вядзе да правапарушэнняў, выпадкаў п'янства, асабліва сярод моладзі. Якія захады прымаюць гарадскія ўлады ў сувязі з патрабаваннямі партыі і ўрада па ўзмацненні барацьбы з гэтымі негатыўнымі з'явамі?

— Так, гэтыя праблемы пастаянна ў цэнтры ўвагі гарвыканкома. У Мінску склалася пэўная сістэма барацьбы з п'янствам, іншымі парушэннямі нормаў маралі і закона, якая дзейнічае ў комплексе праблем эканамічнага і ідэйна-палітычнага характару. Арганізацыйным цэнтрам гэтай работы з'яўляецца гарадскі каардынацыйны савет ідэйна-выхаваўчай работы, які ўзначальвае першы сакратар гарадскога камітэта партыі Георгій Станіслававіч Таразевіч. У дзевяці раёнах горада дзейнічаюць амаль дзевяноста грамадскіх пунктаў аховы парадку, якія вядуць барацьбу з п'янствам, алкагалізмам, дармаедствам і іншымі правапарушэннямі па месцы жыхарства грамадзян. 405 саветаў прафілактыкі створана ў працоўных калектывах і вучэбных установах. Яны ажыццяўляюць як грамадскую, так і індывідуальную прафілактыку тых асоб, якія злоўжываюць спіртнымі напіткамі. Апошнім часам на пасяджэннях раённых і гарадскога выканкомаў заслухоўваюць кіраўнікоў прадпрыемстваў, дзе рост выпадкаў п'янства не памяншаецца... Словам, зроблена нямала. Але вось на чым мне хацелася б засяродзіць увагу.

Яшчэ летась Упраўленне ўнутраных спраў горада разам з Інстытутам філасофіі і права Акадэміі навук БССР і Мінскай вышэйшай школай міліцыі правялі сацыялагічнае даследаванне прычын і ўмоў, якія спрыяюць п'янству і правапарушэнням. Было апытана пяцьсот чалавек, пераважна маладых людзей. Высветлілася, што амаль 92 працэнты з іх ставяцца да ўжывання спіртнога, як да адной з форм правядзення вольнага часу, прычым 64 працэнты лічаць, што выпіваць—гэта, маўляў, асабістая справа, галоўнае—не парушаць

Кветкі да помніка Якубу Коласу ў Мікалаеўшчыне.

плённа ўплывае на сучасны літаратурны працэс і якой наканавана неўміручасць, здольнасць радаваць сэрцы і душы ўсё новых і новых пакаленняў чытачоў.

Пра бессмяротнасць твораў Я. Коласа гавораць У. Скарынкін, К. Камейша, Я. Сахута...

А свята працягваецца. Рэй на Каласавінах вядзе навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Якуба Коласа, паэт Г. Тумас. Ён прадстаўляе ўдзельнікаў святочнага канцэрта. Сваё майстэрства прысутным дораць студэнты філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, самадзейныя артысты з Вішнёўскага сельскага Дома культуры і Навасвержанскага лесапільнага завода Стаўбцоўскага раёна. Гучаць народныя песні і песні на вершы Якуба Коласа, творы песняра. Асабліва кранае за душу «Мой родны кут...», песня, напісаная на вершы песняра І. Лучанком...

У добры шлях, Каласавіны! Там, дзе ёсць добры пачатак, абавязкова патрэбен і працяг. Які ён будзе, падкажа час. У адным не трэба сумнявацца: да ўдзелу ў Каласавінах у далейшым трэба прыцягваць і гасцей з братніх рэспублік, хоць бы з Украіны і Літвы. Але гэта ўжо пажаданне на будучае.

Уладзімір КРУК (фота),
Алесь МАРЦІНОВІЧ.

грамадскі парадак... Вось чаму адна з галоўных нашых задач сёння—арганізацыя культурнага адпачынку людзей, далучэнне іх да самадзейнай мастацкай і тэхнічнай творчасці, да фізкультуры і спорту.

— Што для гэтага зроблена?

— Возьмем хоць бы паркі. Тут штогод праводзяцца тысячы культурна-масавых і фізкультурна - аздараўленчых мерапрыемстваў. Аднак, як заведчыў час, гэтага сёння недастаткова. Трэба актыўна развіваць у парках культуры і адпачынку аматарскія фарміраванні, ствараць тут фізкультурна-спартыўныя зоны, павільёны для настольных гульняў, веларасы, сцежкі здароўя, клубы аздараўленчага бегу і шмат што іншае. Напрыклад, у будучай пяцігодцы толькі ў парку культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў плануецца пабудаваць летні тэатр, рэканструяваць танцавальную веранду, наладзіць пракат культспартінвентару, а ў парку культуры і адпачынку імя 900-годдзя Мінска, акрамя летняга тэатра, вырашана стварыць дзіцячы гарадок і эксперыментальны гарадок атракцыённай тэхнікі. Вядома, гэта толькі невялікая частка тых захадаў, якія мы робім, каб прыцягваць насельніцтва да актыўнага адпачынку. У сувязі з пастановай па барацьбе з п'янствам гарвыканком прыняў адпаведнае рашэнне аб будаўніцтве ў Мінску дадатковых спартыўных пляцовак па месцы жыхарства мінчан, басейнаў, футбольных палёў, тэнісных кортаў, сцежак здароўя са спецыяльнымі трэнажорамі. І вялікую дапамогу ў гэтай справе могуць аказаць гораду буйныя прадпрыемствы і арганізацыі, кааперуючы свае сродкі для будаўніцтва. Дарэчы, многія з прадпрыемстваў сталіцы ўжо вынеслі свае прапановы. Вось, напрыклад, завод «Тэрмапласт» просіць дазволу пабудаваць спартыўную залу і стадыён у Севастопальскім парку, вытворчаму аб'яднанню «Інтэграл» патрэбны басейн. Паўтараю, такіх прапаноў сёння ў гарвыканком паступіла каля сотні і ўсе яны будуць разгледжаны...

У заключэнне скажу: так, планы на перспектыву ў горада вялікія. І нам трэба іх ажыццяўляць. На апошнім, кастрычніцкім, Пленуме ЦК КПСС Міхаіл Сяргеевіч Гарбачоў сказаў: «Цяпер асабліва патрэбны канкрэтныя справы кожнага савецкага чалавека, кожнага працоўнага калектыву, кожнай партыйнай арганізацыі. Настала пара яшчэ больш актыўных дзеянняў, і гэта сёння галоўнае»... Мы будзем дзейнічаць актыўна!

— Дзякуй, Валерый Андрэевіч, за гутарку.

Інтэрв'ю ўзяла
Л. КРУШЫНСКАЯ.

ЛАД ЖЫЦЦЯ САВЕЦКІ

...А СТАНЦЫЯ ЗАВЕЦЦА— КАМУНАРЫ

Камуна... Камунары... Словы гэтыя прыйшлі на Касцюкоўшчыну ў вогненным тысяча дзевяцьсот васемнаццатым годзе. На базе былых панскіх маёнткаў у Антонаўцы, Канічах, Падгародку, Тупічыне адна за адной пачалі стварацца камуны. Самыя найбяднейшыя сялянскія сем'і аб'ядноўваліся ў іх для сумеснай апрацоўкі зямлі і, як высокае званне, сталі насіць імя камунараў.

У тым жа неспакойным васемнаццатым годзе ўскалыхнула гэтыя глухія мясціны ўсходняй Магілёўшчыны яшчэ адна навіна: згодна з дэкрэтам, падпісаным Старшынёй Савета Народных Камісараў Уладзімірам Ільічом Леніным і кіраўніком справамі СНК (дарэчы, выхадцам з вёскі Кулігаеўка Касцюковіцкай воласці) Уладзімірам Дзмітрыевічам Бонч-Бруевічам, праз тутэйшыя мясціны павінна была пралегчы чыгунка, якая злучыла б Оршу з Унечай.

Удзел у будаўніцтве дарогі камунары палічылі сваім кроўным абавязкам. З Антонаўкі і Каніч, з Падгародку і Тупічына, з іншых касцюковіцкіх камун ішлі яны праз лес і балоты да Нізькоў, Муравіля, Прусіна, Бялынкавіч і Журбіна, каб сякерай, ломам і рыдлёўкай пракласці дарогу ў новы свет, у новы быт. Яны не толькі самі працавалі тут, але давалі прытулак пад стрэхамі родных хат і рабочым, што прыехалі з Расіі і Украіны сюды на будаўніцтва.

— Першыя цягнікі праз нашу станцыю прайшлі ўлетку 1923 года, а сама яна з таго часу як памяць аб працоўным гераізме членаў мясцовых камун і іх адданасці справе рэвалюцыі стала насіць назву Камунары,— расказвае дырэктар Касцюковіцкага раённага краязнаўчага музея Уладзімір Раманавіч Ламінскі і тут жа прыгадвае радкі з верша славутага сына Касцюкоўшчыны Аркадзя Куляшова:

— Ёсць станцыя такая — Камунары.
Не верыш мне, на карту глянь, таварыш:
Уніз ад Оршы, кожнаму вядомай,
Стаіць яна ля роўных рэек сёмай...

Адсюль, ад станцыі Камунары, адправіўся некалі ў вялікі свет не толькі будучы народны паэт, а і дзесяткі іншых хлопцаў і дзяўчат, што сталі вядомымі ўрачамі, інжынерамі, мастакамі і г. д. Сярод іх можна назваць прафесара Ленінградскага фізіка-тэхнічнага інстытута імя А. Ф. Іофэ Сямёна Вавілавіча Слабодчыкава, доктара медыцынскіх навук, прафесара Настассю Георгіеўну Фёдараву-Еўдакіменка, якая працуе ў Петразаводскім універсітэце загадчыцай кафедры анатоміі медыцынскага факультэта, доктара медыцынскіх навук, прафесара Маскоўскага медыцынскага інстытута імя М. І. Пірагова Міхаіла Мітрафанавіча Жаўткова, заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР Барыса Іванавіча Загурскага, кандыдатаў філасофскіх навук Лідзію Фёдараўну Бяляеву і Канстанціна Лукіча Патаенку, якія працуюць у Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава, кандыдата сельскагаспадарчых навук Алега Пятровіча Пузанкова...

Бягуць праз Камунары цягнікі—пасажырскія і таварныя. Некалі маленькі чыгуначны раз'езд цяпер стаў грузапасажырскай станцыяй 3-га класа, на пяць рабочых каляін якой прыбываюць з розных канцоў краіны для патрэб Касцюковіцкага і двух суседніх раёнаў мінеральныя ўгнаенні, сельскагаспадарчыя машыны, дрэнажныя трубы, піламатэрыялы і іншыя разнастайныя прамысловыя тавары. А з Камунараў адпраўляецца ў розныя адрасы сельскагаспадарчая прадукцыя касцюковіцкіх, краснапольскіх і хоцімскіх калгасаў і саўгасаў — бульба, збожжа, лён, малако і мяса. Райсельгасхімія і райсельгастэхніка таксама не могуць абысціся без паслуг камунараўскіх чыгуначнікаў.

— Працуем у чатыры змены, — расказвае начальнік станцыі Уладзімір Аляксеевіч Галаўнёў.— Калектыў у нас невялікі — усяго каля трох дзесяткаў чалавек, але народ гэты працавіты, ініцыятыўны. Неаднаразова мы заваёўвалі пераходны Чырвоны сцяг Магілёўскага аддзялення чыгункі, а залетась выйшлі нават у лік пераможцаў Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва, аб чым і сёння сведчыць Дыплом Цэнтральнага камітэта прафесійнага саюза работнікаў чыгуначнага транспарту краіны.

У далёкім 1929 годзе стаў Канстанцін Сюльд першым трактарыстам у раёне.

Асабліва шматлюдна ў краязнаўчым Касцюковіцкім музеі ля экспанатаў, што расказваюць пра рэвалюцыйнае мінулае раёна.

Толькі за апошні час на станцыі Камунары поўнасцю завершана сігналізацыя стрэлачнай гаспадаркі, уведзены аўтаблакіроўкі на прылягаючых чыгуначных перагонах, устаноўлена светлавое табло на самім вакзале. Усё гэта значна палепшыла кантроль за бяспекай руху, а магутны пагрузачна-разгрузачны кран, які таксама нядаўна ўзняў сваю мускулістую руку над чыгуначнымі пуцямі, вызваліў ад цяжкай работы дзесяткі грузчыкаў.

...Бягуць-бягуць па рэйках цягнікі,
Нясуцца ўдалячынь, нібыта мары.
Гудуць над станцыяй працяжныя гудкі,
А станцыя завецца — Камунары.

Аркадзь КАНДРУСЕВІЧ.

Фота В. КАЖАМЯКІНА.

Расказвае Аляксандр Зархі

Каму з аматараў кіно не вядомы такія фільмы, як «Дэпутат Балтыкі» і «Член урада», якія даўно ўжо прызнаны класікай савецкага мастацтва, папулярныя стужкі «Вышыня», «Ганна Карэніна», «Дваццаць шэсць дзён з жыцця Дастаеўскага»? Усе яны і яшчэ многія іншыя пастаўлены вядомым савецкім кінарэжысёрам, Героем Сацыялістычнай Працы, народным артыстам СССР, лаўрэатам Дзяржаўных прэмій СССР Аляксандрам Зархі. У выдавецтве «Искусство» сёлета выйшла кніга яго ўспамінаў «Мае дэбюты», у якой кінарэжысёр дзеліцца думкамі пра сваю прафесію, расказвае аб калегах-рэжысёрах, вядомых савецкіх артыстах, з якімі яму давялося працаваць.

Некаторы час А. Зархі працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». У 1952 годзе ён перанёс на экран знакаміты спектакль тэатра Янкі Купалы «Паўлінка», у 1955 годзе экранізаваў п'есу В. Вольскага «Несцерка». У гэтых фільмах здымаліся вядомыя беларускія артысты У. Дзядзюшка, Л. Ржэцкая, Г. Глебаў, В. Пола, Б. Платонаў, Я. Палосін, У. Кудрэвіч і інш. У якасці кампазітара ў «Паўлінцы» выступаў Я. Цікоцкі, мастака — Я. Ганкін, у фільме «Несцерка» гучала музыка Д. Лукаса. Рэжысёр згадвае сумесную працу з імі, разважае пра своеасаблівасць жанру фільма-спектакля.

І яшчэ адзін раздзел кнігі А. Зархі мае непасрэднае дачыненне да Беларусі. У 1951 годзе ён зняў дакументальны фільм пра Кірылу Пракопавіча Арлоўскага, старшыню калгаса ў Мышкавічах. Амаль паўгода пражыў рэжысёр у калгасе, яго паяднала з Арлоўскім моцнае сяброўства. Менавіта Зархі падказаў пісьменніку Ю. Нагібіну тэму для сцэнарыя, паводле якога потым быў створаны фільм «Старшыня». Як вядома, прататыпам галоўнага героя фільма Ягора Трубнікава стаў беларускі старшыня. Старонкі кнігі, прысвечаныя Арлоўскаму,—па сутнасці невялікі мастацкі нарыс, у якім рэжысёр са шчырым, непадробным захапленнем гаворыць пра свайго героя.

Т. ПЕТРЫК.

І ЗНОЎ — ТРЫУМФ!

Наш балет вярнуўся з трыумфальнай паездкі ў Іспанію і Партугалію. На гербавай паперы — новы кантракт на выступленні беларускіх артыстаў у Іспаніі праз тры гады. У сакваяжах — паштоўкі з экзатычнымі відамі, стосы газет з водгукамі пра гастролі. А ў памяці — дзесяткі гарадоў, сотні знаёмстваў, тысячы розных гледачоў і ружы, ружы,..

У пэўным сэнсе паездка была юбілейнай: Партугалія стала дзесятай па ліку краінай, дзе апладзіравалі мастацтву беларускіх танцораў. А крыху больш за дзесяць гадоў назад было першае запрашэнне на зарубежныя гастролі. І хоць на той час вядучыя салісты балета па адным і парамі аб'ездзілі амаль паўсвета, у поўным складзе балетная трупа за мяжой яшчэ не бывала. Вельмі хваляваліся: наперадзе была Венгрыя. Краіна, якая прымала самыя лепшыя калектывы, публіка, якая апладзіравала сусветным славутасцям.

1974 год. Успамінаю сваю кароткую сустрэчу і кароткае інтэрв'ю для «Апошніх паведамленняў» рэспубліканскага радыё з Валянцінам Елізар'евым, Малады, кучаравы, з бліскучым позіркам сініх вачэй (дарэчы, амаль такі ж, як і цяпер), ён гаварыў пра будучыя гастролі. Везлі з сабой у Венгрыю на фестывалі («Сегедскія гульні» ў горадзе Сегед, у Будапешце, на востраве Маргет) чатыры спектаклі: «Лебядзінае возера», «Шапеніяну», «Палавецкія пляскі» і на той час зусім новую работу В. Елізар'ева «Кармэн-сюіта».

І поспех, сапраўдны, вялікі поспех прыйшоў да нашых артыстаў. Слава пра беларускі балет, як пра цікавы, перспектыўны калектыў, дайшла і да Польшчы, і да Кувейта, да іншых краін, дзе трупа і пабывала ў наступныя гады.

І зноў — сустрэча з галоўным балетмайстрам Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, народным артыстам СССР Валянцінам Елізар'евым. Усмешлівыя сінія вочы, русявая кучма валасоў, энергіі — цераз край.

— Валянцін Мікалаевіч, калі ласка, пазнаёмце з маршрутам паездкі.

— За месяц мы праехалі ўсю Іспанію — з захада на ўсход і з поўначы на поўдзень. Пабывалі ў буйнейшых гарадах: Малазе, Валенсіі, Лакаронці, Кастыліі, Віторыі і іншых. Толькі ў Мадрыдзе выступілі дваццаць два разы. Нашы прадстаўленні праходзілі ў тэатрах, на стадыёнах, нават на адкрытых пляцоўках.

— Напомніце, якія спектаклі вы паказвалі.

— «Лебядзінае возера» ў новай пастаноўцы, «Шчаўкунчык», «Спартак», «Кармэн-сюіту», «Шапеніяну» і вялікую канцэртную праграму. На некаторых спектаклях прысутнічала да шасцівасьмі тысяч чалавек!

— Дарэчы, пра гледачоў. Як вас прымалі?

— Не палічыце мяне нясціплым, ды дзеля аб'ектыўнасці і дакладнасці скажу: з захапленнем прымалі. Людзі выказвалі свае пачуцці вельмі тэмпераментна, як сапраўдныя жыхары поўдня. Яны не толькі апладзіравалі, але і свісталі, крычалі, тупалі.

— Якія катэгорыі гледачоў прыходзілі вас паглядзець?

— Самыя розныя, бо цэны на білеты вар'іраваліся ад трох да дваццаці долараў. Былі і зусім танныя. Так што нашы спектаклі абмяркоўвалі і багацеі, і інтэлігенцыя, і проста люд.

— Кажуць, вы пазнаёміліся з іспанскай каралевай?

— Праўду кажуць. Яна прыходзіла на «Лебядзінае возера» і пасля спектакля выйшла на сцэну разам з дзвюма наследнымі прынцэсамі, павіншавала наш балет Іспаніі і пасябравалі з яго таленавітымі акцёрамі. Яны прыходзілі да нас на спектакль, прысутнічалі на рэпетыцыях. Былі мы таксама ў школе нацыянальнага балета і ў прыватных школах. І мушу сказаць, што грацыя, зграбнасць, здольнасці да музыкі і танцаў у іспанцаў і партугальцаў прыроджаныя.

— Як ацэньвала вас прэса?

— Тэлевізійныя кампаніі абедзвюх краін знялі на відэастужку ўсе нашы спектаклі і праграмы. Газеты на кожны спектакль адгукаліся гарачымі рэцэнзіямі. Нас хваліла нават правая прэса. Праўда, больш стрымана. І ўсюды сустракалі мы савецкіх журналістаў — карэспандэнтаў ТАСС, АДН, Цэнтральнага тэлебачання і Усесаюзнага радыё...

— Які багаж прывезлі беларускія артысты з гэтай паездкі?

— Яна ўзбагаціла нас духоўна. Мы ўбачылі старажытныя землі са старажытнай культурай. Іспанія такая шматаблічная! Далучэнне да музейных скарбніц, знаёмства з выстаўкамі мастакоў, скульптараў — усё гэта для нас бясцэнны дар. Я лічу, што ў Іспаніі выхоўваюць эстэтычна самі вуліцы, плошчы, архітэктурныя ансамблі і гарадская скульптура. Знаёмства з дзівоснай краінай, з яе жыццярадасным народам пашырыла наш кругагляд. Цяпер, я думаю, калі давядзецца акцёру выконваць ролю ў спектаклі на іспанскія ці партугальскія матывы, ён будзе больш дакладны ў рабоце, бо эможа арыентавацца на свае ўласныя ўражанні.

Такім чынам, чарговае прэстыжнае турнэ завершана. Наперадзе — праца ў родных сценах, стварэнне новых спектакляў.

Валянцін Елізар'еў будзе ставіць спектаклі на музыку С. Пракоф'ева, Г. Берліёза, І. Стравінскага. У тэатр будуць запрашацца лепшыя харэографы краіны.

Тэатр яшчэ больш пашырыць супрацоўніцтва з беларускімі кампазітарамі. І ў некаторых з іх ужо ёсць прываблівыя прапановы як для оперы, так і для балета. А, мабыць, з'явяцца на сцэне і творы накшталт выдатнага відовішча «Карміна Бурана», дзе так удала спалучаюцца розныя віды мастацтва.

Майстры беларускага балета імкнуцца знайсці аптымальнае, арганічнае спалучэнне ў рэпертуары класічнай музычнай спадчыны і сучасных твораў. Спектакляў смелых па форме і думцы, у якіх будзе ясна прасочвацца грамадзянская і эстэтычная пазіцыя аўтара, хай то будзе кампазітар, балетмайстар, мастак або артыст, чакаем і мы, гледачы.

Святлана СЫСОЕВА.
Фота Н. ЗЕМЧАНКАВАЙ.

Мадрыд. Рэклама беларускага балета на тэатры «Манументаль».

Перад ад'ездам з Мадрыда.

НА ЭКРАНЕ

З 11 ПА 17 ЛІСТАПАДА

14 лістапада, 20.15.

«ДАРОГІ І ПЕСНІ».

Перадача падрыхтавана да 80-годдзя з дня нараджэння М. Васілька.

У ёй прымаюць удзел Я. Брыль, П. Макаль, А. Карпюк. Вядучы — У. Баклейчаў. Вершы чытаюць артысты мінскіх тэатраў.

16 лістапада, 11.15.

«СЛОВА — ПАЭЗІІ».

Свае новыя вершы чытае Т. Бондар.

16 лістапада, 11.30.

Л. Захлеўны. Вакальны цыкл «Я перад вамі з памяццю сваёй».

Песні выконваюць народны артыст БССР В. Вуячыч, заслужаныя артысты рэспублікі Н. Багуслаўская і Я. Еўдакімаў.

16 лістапада, 12.25.

«І ЗАГУЧАЦЬ ГАЛАСЫ ЦУДОЎНЫЯ».

Музычная праграма з удзелам народнага цымбальнага арнестра вёскі Груздава Пастаўскага раёна.

16 лістапада, 13.05.

«У ЖЫВАПІСЕ. ГРАФІЦЫ, СКУЛЬПТУРЫ».

Размова пойдзе аб сучаснасці ў творчасці беларускіх мастакоў.

16 лістапада, 15.45.

«НАВІНКІ КНІГАРНІ».

Вядучая — паэтэса Н. Тулупава.

16 лістапада, 15.55.

«МОЙ РОДНЫ КУТ».

Перадача прысвечана Нясвіжчыне. Прымаюць удзел старшыня Нясвіжскага райвыканкома М. Жук, народны артыст СССР Г. Цітовіч.

16 лістапада, 18.05.

«ПРА МУЗЫКУ АД «А» ДА «Я».

Чарговая праграма цыкла прапануе тэлегледачам новыя сустрэчы з творчасцю папулярных кампазітараў і выканаўцаў.

16 лістапада, 19.55.

ТЭЛЕСТУДЫЯ «ЛІРА».

Вы сустрэнецеся з лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР пісьменнікам Янам Скрыганам.

16 лістапада, 22.55.

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».

Эстрадная музычная праграма з удзелам артыстаў чэхаславацкай эстрады.

17 лістапада, 12.10.

Спявае заслужаная артыстка БССР Станіслава Гулевіч. Партыю фартэпіяна выконвае піяніст В. Баравікоў.

17 лістапада, 15.55.

«ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ».

Чарговая перадача цыкла прысвечана творчасці народнай артысткі БССР Наталлі Гайда.

17 лістапада, 20.10.

«ПЯЦЬ ДЗЁН І АДЗІН ВЕЧАР».

Прэм'ера дакументальнага фільма. Фільм «Пяць дзён і адзін вечар» расказвае аб настаўніках і вучнях школы № 17 г. Барысава, аб праблемах духоўнага выхавання.

Аўтар сцэнарыя — І. Пісьменная, рэжысёр — А. Рудэрман, аператар — Л. Броўтман.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 01494 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела тэатра і выяўленчага мастацтва — 33-21-53, аддзела музыкі і кіно — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Віктар КАВАЛЕНКА, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.